Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

26 КРАСАВІКА 2024 г. ПЯТНІЦА № 83 (30217)

УСЕНАРОДНЫ ПОГЛЯД НА БЯСПЕКУ

Фота БелТА.

Другі дзень першага пасяджэння VII Усебеларускага народнага сходу прайшоў пад знакам зацвярджэння Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з Канстытуцыяй нашай краіны, гэтыя найважнейшыя стратэгічныя дакументы ўпершыню вынесены на зацвярджэнне Усебеларускага народнага сходу. Найперш трэба сказаць, што гэтаму папярэднічала вялікая, грунтоўная работа. Сучасная абстаноўка ў свеце, у тым ліку паблізу нашых граніц, узнікненне новых выклікаў і пагроз, шэраг іншых абставін, прывялі да таго, што і Канцэпцыя, і Дактрына падвергнуліся сур'ёзнай карэкціроўцы.

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы, было праведзена грамадскае абмеркаванне праекта Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. На працягу года было арганізавана звыш 70 дыскусійных пляцовак па абмеркаванні асноўных навел Канцэпцыі ва ўсіх рэгіёнах краіны: у дзяржаўных органах і арганізацыях, працоўных калектывах, навучальных установах, прафсаюзных і грамадскіх аб'яднаннях з прыцягненнем прадстаўнікоў навуковай і экспертнай супольнасці, асноўных рэлігійных канфесій. Для максімальнага ахопу аўдыторыі тэкст новай Канцэпцыі таксама быў размешчаны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь.

16 студзеня 2024 года на пасяджэнні Савета Бяспекі кіраўніком дзяржавы і членам Савета Бяспекі былі даложаны канкрэтныя прапановы, якія ў выніку грамадскага абмеркавання планавалася ўключыць у абноўленую Канцэпцыю. Перш за ўсё яны датычыліся дадатковай абароны інстытута традыцыйнай сям'і, павышэння ўзроўню сацыяльнай адказнасці бізнесу, пераадолення дыспрапорцый рэгіянальнага развіцця, канкрэтызацыі пераліку сіл забеспячэння нацыянальнай бяспекі, паняційнага апарату, парадку зацвярджэння сістэмы індыкатыўнай ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі і іншых. У выніку Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі 12 лютага 2024 была адобрана Саветам Бяспекі.

На гэтым жа пасяджэнні Савета бяспекі кіраўніком дзяржавы і членамі Савета бяспекі былі дэталёва разгледжаны палажэнні новай рэдакцыі Ваеннай дактрыны. Адзначаны выразна выяўлены нацыянальны характар дакумента, у якім акцэнты зроблены на нашы нацыянальныя каштоўнасці: мір, стабільнасць і бяспеку.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў другі дзень пасяджэння сёмага Усебеларускага народнага сходу

Паважаныя дэлегаты!

Я думаю, мы можам распачаць работу нашага другога дня Усебеларускага народнага сходу. Сёння вельмі сур'ёзныя, важныя пытанні для жыцця нашай дзяржавы.

Я прапаноўваю пабудаваць нашу работу наступным чынам. Па парадку дня, як мы і дамаўляліся, выступіць па першым пытанні — Канцэпцыі — Дзяржсакратар нашага Савета бяспекі Аляксандр Рыгоравіч Вальфовіч. Па другім пытанні — Ваеннай дактрыне — выступіць міністр абароны генерал Хрэнін. З выступленнем да вас звернецца таксама Іван Станіслававіч Тэртэль, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі.

І тут вельмі важна: я прапаноўваю не абмяркоўваць асобна ўсе гэтыя пытанні. Яны падобныя, адно развівае іншае. Таму ўсе, хто запісаўся і хацеў выступіць, я мяркую, мы заслухаем тры выступленні. А затым, калі ў кагосьці ёсць пытанні, зададзіце, хто хоча выступіць — можа выкарыстоўваць сваё права.

Але спачатку я хацеў бы вас папрасіць, як бы ні было складана і цяжка пасля ўчарашняга дня ў сувязі з маім выступленнем, усё ж неяк напружыцца і выслухаць мой уступ да гэтых усіх трох пытанняў. Я мяркую, што было б няправільным, калі б Прэзідэнт не выказаў сваё меркаванне, не даў вам поўную інфармацыю па праблемах, якія разглядаюцца. Чаму? Таму што ўся інфармацыя сур'ёзнага характару сцякаецца да Прэзідэнта, і, нягледзячы на тое, што нашы кіраўнікі названых сілавых структур маюць сур'ёзную інфармацыю, гэта ведамствы, якія канцэнтруюць інфармацыю чыста па сваіх кірунках.

У дадзеным выпадку я паспрабую канцэптуальна і ў цэлым выкласці тую інфармацыю, якую я жадаў бы вам падаць. Яна будзе карацейшая, чым учарашні мой даклад, таму пацярпіце.

Учора мы шмат і прадметна казалі пра геапалітыку, аналізавалі падзеі, якія падрыхтавалі глебу для сённяшняга парадку, падвялі ўсіх нас да найважнейшых стратэгічных рашэнняў у сферы нацыянальнай бяспекі.

Сёння нам трэба будзе заслухаць даклады, як я ўжо сказаў, дзяржсакратара і міністра абароны, і старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Перш чым нам паведамяць аб тым, як вялася работа над дакументамі, якія прынцыпова новыя палажэнні ўнесены, я, як і абяцаў напярэдадні, спынюся на ваенна-палітычнай абстаноўцы ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне.

Мы падрыхтавалі матэрыялы, якія прынята заслухоўваць і абмяркоўваць выключна на ўзроўні Савета бяспекі, у цішыні, на нарадах у Прэзідэнта, закрытых нарадах, з сілавым блокам. Але нам сёння трэба будзе разгледзець і прыняць дакументы, якія вызначаюць стратэгію супрацьдзеяння рызыкам і пагрозам на найбліжэйшыя дзесяцігоддзі. Таму без лішняй лірыкі і эмоцый — факты на стол! Слухайце, рабіце высновы, думайце, прымайце рашэнне.

Фота БелТА.

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 24083

УСЕНАРОДНЫ ПОГЛЯД НА БЯСПЕКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аб тым, што ваенна-палітычная сітуацыя ў рэгіёне, ды і ў свеце ў цэлым, ацэньваецца палітыкамі-экспертамі як крызісная з перадумовамі пераходу ў фазу глабальнага канфлікту, вы не раз чулі. Сёння пагаворым аб тым, якімі сіламі і сродкамі нагнятаюцца пагрозы нашай нацыянальнай бяспецы.

Асноўную рэальную рынку стварае гарачы пункт у рэгіёне — вядома ж, Украіна. Вашынгтон робіць усё, каб уцягнуць у канфлікт нашу краіну. Запусціць механізм уцягвання астатніх дзяржаў — гэта значыць аслабіць Заходне-, і Усходне-Еўрапейскі рэгіёны.

Што датычыцца Украіны, вы шмат пра гэта ведаеце, і я звяртаўся да гэтага пытання неаднойчы, тым не менш два словы аб сітуацыі на сёння на самім фронце.

Ідуць цяжкія баі. На жаль, гінуць людзі, і гэта ўжо не адзінкі, дзясяткі і сотні, а тысячы людзей. Ва ўкраінскіх войсках склаўся сур'ёзны дэфіцыт не толькі боепрыпасаў, пра якія шмат гаварылі, вельмі моцна перажывалі, як я кажу, парыліся наконт выдзялення 60 мільярдаў долараў на гэтую вайну. Тады я вас папярэджваў, што грошы дадуць, зразумела. Таму што не даць гэтыя грошы — упусціць магчымасць апусціць нас і Расію разам узятых і аслабіць нас.

Таму боепрыпасы паставяць, ракеты і іншае, аб гэтым ніжэй. Але не хапае людзей. Людзі ўцякаюць ад вайны. Гэта недурныя людзі, гэта нашы людзі, мудрыя, талковыя.

Выдзяленне Злучанымі Штатамі Амерыкі 60 мільярдаў долараў на вайну — найважнейшы фактар эскалацыі канфлікту ва Украіне. І вельмі небяспечна, што былі выдзелены ракеты далёкага дзеяння ATACMS.

Удары БПЛА па Расійскай Федэрацыі (вы ведаеце, НПЗ, аэрадромы), уплывовыя людзі, якія пастаўленыя, як у бандытаў кажуць, на лічыльнік — усё гэта планы (і не планы, а дзеянні ўкраінцаў), якія сведчаць аб тым, што адбываецца эскалацыя вайны.

У той жа час армія Расійскай Федэрацыі абсталявана новай зброяй. Рэзервы маюцца ў кожнай брыгадзе.

На апошніх перагаворах у Крамлі, калі мы іх вялі з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным, ён запрасіў кіраўніцтва Генеральнага штаба і сілавых структур, і мы ўдваіх проста паслухалі інфармацыю аб тым, што адбываецца на фронце. І мяне вельмі пераканала і здзівіла збольшага інфармацыя, якую далажыў начальнік Генштаба Расіі, аб тым, што яны стварылі дастатковыя рэзервы ў жывой сіле і тэхніцы. Сёння на фронце кожная расійская брыгада (іх нямала) мае рэзервы як мінімум у выглядзе палка. Гэта значыць, калі стаіць на фронце брыгада, у тыле ў яе разгорнуты полк, узброены самай сучаснай зброяй.

Што да самога фронту, ідуць вельмі сур'ёзныя баі, як я сказаў. Расія павольна, 500 метраў, кіламетр, два, тры (на розных участках па-рознаму), але кожны дзень, кожныя суткі прасоўваецца наперад. Вы ведаеце інфармацыю аб вызваленні расійскімі войскамі некаторых населеных пунктаў. Але гэта вельмі маруднае прасоўванне.

Утварыўся, як у нас у народзе кажуць, нейкі цугцванг: ні яны, украінцы, ні расіяне. Так, рух ёсць, але не той рух, які хацелася б мець. Патавая сітуацыя. Што ў гэтай сітуацыі, як я разумею і заўсёды прапаную, трэба было б зрабіць? Самая сур'ёзная, як ніколі за гэту вайну, і зручная, калі можна так выказацца, сітуацыя для міру, для заключэння мірнага дагавора. Калі я быў у Маскве, выказаў сваю пазіцыю журналістам, калі яны ў мяне спыталі, як дзейнічаць.

Але для пачатку перапыненых перагавораў заўсёды іх трэба пачынаць з чагосьці, можна было б пачаць са Стамбульскіх пагадненняў, пра якія гаворыць прэзідэнт Пуцін часта. Ён мне пасля таго, як яны ў Стамбуле былі выпрацавалі, перадаў іх, я яшчэ раз паглядзеў — цалкам нармальныя пагадненні. Гэта не значыць, што ў выніку перагавораў будуць прыняты або пакладзены нават у аснову мірнага дагавора гэтыя парафіраваныя бакамі пагадненні. Не. Але з іх можна пачынаць і рухацца наперад. Вядома, гэта не будзе мірны дагавор, копіі гэтых пагадненняў. Мірны дагавор будзе іншы. Але з гэтага можна пачынаць. Пра гэта ж дамаўляліся, доўга выпрацоўвалі (у нас тры раўнды і ў Стамбуле раўнд перагавораў), да чаго прыйшлі.

Я ўжо казаў учора, усе вайскоўцы, кіраўнікі спецслужбаў Захаду, палітыкі, кіраўнікі дзяржаў, і ўжо публічна кажуць пра тое: «Нельга дапусціць перамогі Пуціна». Ну, калі вы на гэтым настойваеце, што гэта нельга, дык гэта момант для перагавораў. Як я кажу, згуляйце ўнічыю на гэтым этапе. Не трэба прапаноўваць радыкальных рашэнняў, як «формула Валодзі Зяленскага». Ну, падобна, патрыятычная і гэтак далей, але яна нерэальная. Яна сёння нерэальная! Расіяне сёння не сыдуць ні з Крыма, ні з усходніх рэгіёнаў, як яны называюць, Наваросіі. Яны не сыдуць! Ведаеце, чаму.

Таму, калі вылучаюцца непрымальныя да перагавораў прапановы, — гэта значыць, што той бок, які іх прапаноўвае, не гатовы ісці на перагаворы.

Я ведаю настроі ваенных украінскіх: ім ужо гэтая вайна надакучыла. Але і яны не могуць распачаць самастойныя дзеянні, таму што за прэзідэнтам Зяленскім, які хоча заяваць «да апошняга ўкраінца», стаяць цэлыя войскі НАТА, і ўвесь заходнееўрапейскі блок, і Злучаныя Штаты Амерыкі. Сітуацыя вельмі сур'ёзная. Але, калі цяпер, на маю думку, не пайсці на перагаворы, Украіна з цягам часу страціць і сваю дзяржаўнасць і можа спыніць сваё існаванне.

Ведаю, што вось пасля гэтых маіх размоў, ва Украіне падымецца зноў шум, мяне пачнуць дзяўбаць па ўсіх гэтых каналах розныя блогеры і журналісты, але я ўжо да гэтага прывык. Я выказваю сваю пазіцыю. Сваю! І, калі вы з ёй згодны, я прашу зыходзіць з гэтага: ва Украіне сёння патрэбен мір. Сведчаннем таму з'яўляюцца ўцёкі больш-менш здаровых, разумных украінцаў з краіны, каб не трапіць на фронт.

Мы ж добра ведаем, што іх хапаюць на вуліцах і часцяком нават не навучаюць, не праводзяць баявое зладжванне на палігонах. Іх кідаюць прама на фронт, і не ў другім эшалоне, а як штурмавікоў, а ззаду СМЕРШ, атрады ўзброеных людзей-украінцаў, якія ідуць следам за гэтымі небаракамі. Як яны часта кажуць, цытую: «Нам выдалі білет у адзін бок». Мы ж ведаем, пра што яны гавораць на фронце, у нас там сур'ёзная пазіцыя.

Ніхто сёння не жадае заяваць, таму трэба ісці да міру!

Але вобраз ворага ў асобе Масквы і Мінска амерыканцам удалося сфарміраваць. Вашынгтон паступова прасоўвае агрэсіўныя наратывы ў адрас беларускай і расійскай дзяржаў, павышаючы градус варожасці блока НАТА на нашым напрамку.

Пашырэннем Паўночнаатлантычнага саюза, які прыняў у склад Фінляндыю і Швецыю, Вашынгтон і Брусель працягваюць фарміраваць вакол Расійскай Федэрацыі пояс недружалюбных дзяржаў. На чарзе ўступленне ў альянс — іншыя краіны Еўропы. Мэта вядомая: па задуме, на гэтай лініі ўсё павінна палаць.

Яшчэ раз прашу вас звярнуць увагу на мой тэзіс, выказаны ўчора. У народа заўсёды пытанне: ну а чаго жадаюць гэтыя западэнцы і амерыканцы? Яшчэ раз паўтараю: яны проста хочуць утапіць Расію ў вайне, адарваць яе ад саюза з Кітаем, які намеціўся. Гэтага саюза няма, але ён намячаецца. Абставіны склаліся так, што і Расіі, і Кітаю трэба быць разам. Амерыканцы гэта зразумелі, ім трэба ўбіць клін. Ну, гэта правільна. Як утапіць? Ва Украіне. Таму 60 мільярдаў долараў — для іх гэта не грошы: ваюйце, забівайце адзін аднаго.

Але я хачу, учора я не дагаварыў, мець на ўвазе яшчэ адну рэч. Для амерыканцаў Кітай і Расія — гэта яшчэ не ўсе сапернікі і ворагі. Для самой Амерыкі, мы гэта адчулі ў часы Трампа, вельмі сур'ёзным сапернікам з'яўляецца сама Еўропа, Еўрапейскі саюз, асабліва з тых часоў, калі ў альтэрнатыву долару Еўропа адважылася (стала нахабнай!) і ўвяла еўра. Гэта моцная валюта. Таму амерыканцам ніякія сапернікі і канкурэнты не патрэбны. Таму, утапіўшы Расію ў вайне ва Украіне, нагрузіўшы Еўрапейскі саюз гэтай вайной (давайце па два, па тры працэнты ад ВУП выкладвайце, выбудоўвайце больш зброі і боепрыпасаў, пасылайце супраць Расіі на фронт, а то ўжо і сваіх людзей). Я хачу, каб вы разумелі: там даўно ваююць натаўскія найміты!

Месяц таму расіяне нанеслі, проста для інфармацыі вам, найсур'ёзнейшы ўдар па пазіцыях баевікоў на ўкраінскай тэрыторыі. Загінулі дзясяткі палякаў. Вы што-небудзь чулі пра гэта? Палякаў дзясяткі загінулі, не адзін, не два, не тры чалавекі, трапілі пад агонь Расійскай Федэрацыі! Труны і трупы вывозіліся ў Польшчу. Чаму ўрад Польшчы не праінфармаваў польскае насельніцтва?

Таму амерыканцы хочуць забіць некалькі зайцоў адразу: аслабіць Расію, перагрузіўшы Еўропу, аслабіць яе ў тым ліку. Ну, а там, на Ціхім акіяне, як я казаў, разбірацца самнасам з Кітаем, уцягваючы ў гэтую бойку перш за ўсё Індыю, ну Англію там, Аўстралію, дай бог Украіну і Паўднёвую Карэю. Супраць Кітая.

Фота БелТА.

А нам трэба разумець, што сітуацыя патрабуе вельмі жорсткага кантролю ва ўсіх сферах: пачынаючы з інфармацыйнай і заканчваючы ваеннай. Любое неасцярожнае слова, рух — можа пачацца адкрытае ўзброенае супрацьстаянне, аж да прымянення ядзернай зброі.

Я і кажу, што вось пастаўка дальнабойных ракет без умоў. Раней яны пастаўлялі і публічна хаця б заяўлялі, што яны забаранілі ўкраінцам наносіць удары па тэрыторыі Расіі, збольшага і Беларусі, а цяпер яны ўжо не абумоўліваюць пастаўкі ATACMS і іншых дальнабойных боепрыпасаў. І калі сітуацыя складзецца пагрозліва, перш за ўсё яны хочуць для ўнутранай сітуацыі ў Расіі, Расія прыменіць увесь арсенал, якім яна валодае. Гэта будзе апакаліпсіс! Для гэтага ўсё гатова.

НАТА, вядома, з падачы Штатаў настойліва дэкларуе неабходнасць інтэнсіўнай мілітарызацыі Еўропы. І размова не ідзе аб абароне, аб адбіцці нейкай агрэсіі. Каб вы разумелі: робіцца акцэнт на нарошч-

ванні менавіта ўдарна-наступальнага патэнцыялу.

Васямнаццаць дзяржаў альянсу, уключаючы Польшчу і краіны Балтыі, у бягучым годзе маюць намер давесці аб'ёмы ваенных асігнаванняў да ўзроўню вышэй за два працэнты ад ВУП. Кіраўніцтва Польшчы прапаноўвае тры, а ў некаторых ужо больш за тры працэнты ад ВУП сёння траціцца на ўзбраенне.

Сукупны аб'ём абаронных расходаў краін НАТА ў бягучым годзе ўпершыню ў гісторыі блока складзе каля 1 трыльёна 200 мільярдаў еўра. Трыльён 200 мільярдаў еўра!

Акрамя таго, Бруселем прынята рашэнне павялічыць колькасць сіл неадкладнага рэагавання да 300 тысяч чалавек (цяпер іх 80 тысяч), пераўтварыць місію НАТА па ахове паветранай прасторы краін Балтыі ў ваенную аперацыю, а таксама рэарганізаваць разгорнутыя ў Польшчы і Прыбалтыйскіх дзяржавах баявыя групы ў фарміраванні брыгаднага ўзроўню.

Памятайце, яны нас увесь час папракалі ў тым, што мы размяшчалі ядзерную зброю на тэрыторыі Беларусі: «Значыць, мы будзем падвергнуты першаму ўдару, калі адбудзецца сутыкненне». А самі, Польшча і Прыбалтыка, увогуле аддалі свае тэрыторыі, для таго каб іх цалкам мілітарызаваць і стварыць там апорныя пункты для нападзення на Усходзе.

У дадзеным кантэксце трэба адзначыць пачатак практычнай рэалізацыі германа-літоўскага пагаднення, якое прадугледжвае ўзмацненне нямецкай ваеннай прысутнасці ў Літве. У сродках масавай інфармацыі ўжо з'явіліся такія даныя.

8 красавіка ў Вільнюс перадыслацыравана аператыўная група Узброеных сіл ФРГ. У яе задачы ўваходзіць вывучэнне мясцовасці размяшчэння кантынгенту, вырашэнне пытанняў падрыхтоўкі да фарміравання штаба брыгады, якое плануецца завяршыць да канца года. Рэкагнасцыроўка, кіраўніцтва і напаўненне.

Нагадаю: на тэрыторыі Літвы да 2028 года будзе разгорнута фарміраванне брыгаднага ўзроўню Узброеных сіл Федэратыўнай Рэспублікі Германіі (як я казаў, немцы так нічога і не зразумелі, відаць), а таксама сілы і сродкі Аб'яднаных Узброеных сіл НАТА, размешчаныя цяпер на літоўскай тэрыторыі (населены пункт Рукла) у рамках аперацыі Аб'яднаных Узброеных сіл НАТА «Узмоцненая перадавая прысутнасць». Колькасць злучэння складзе каля 5 тысяч чалавек.

Паўтару: звыш 64 тысяч ваенных Узброеных сіл ЗША, амаль беларускае войска, а таксама больш за 33 тысячы натаўскіх салдат на пастаяннай аснове дыслацыруюцца ў Еўропе. Што яны тут робяць? Якую Амерыку яны абараняюць тут? Да 20 тысяч з іх сканцэнтраваны ў Польшчы, блізка да нашых граніц, і ў краінах Балтыі. Гэтыя групоўкі войскаў аснашчаны сучасным ударным узбраеннем і здольны наносіць высокадакладныя ўдары па аб'ектах на тэрыторыі Беларусі і заходніх рэгіёнаў.

Цяпер вядзецца адпрацоўка адпаведных задач. Задзейнічаюцца самалёты стратэгічнай бамбардзіровачнай авіяцыі ВПС ЗША, якія на рэгулярнай аснове ажыццяўляюць палёты ў Еўрапейскім кантынентальным раёне, напрыклад, у Іспаніі дыслацыруюцца чатыры амерыканскія стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі B-1B з адпрацоўкай прыёмаў бомбакідання ядзерных зарадаў, у тым ліку на тэрыторыі нашай краіны. Трэніруюцца прымяняць ядзерную зброю!

Гэта адказ тым, якія выюць за мяжой у нас, асабліва збеглыя, крытыкуючы нас за тое, што мы размясцілі тут сваю ядзерную зброю. Вось, яны трэніруюцца!

Больш за тое, Вашынгтон актывізаваў, прытым істотна, мерапрыемствы па праверцы гатоўнасці да прымянення кампанентаў ядзернай трыяды Злучаных Штатаў. Размешчаная на тэрыторыі дзяржаў — членаў НАТА тактычная ядзерная зброя, пра якую я казаў учора, мадэрнізуецца паскоранымі тэмпамі. На авіябазах Еўропы размешчана больш за 200 боепрыпасаў (ракеты і бомбы). На авіябазе Кляйне-Брогель (Бельгія) — 20 боепрыпасаў, Бюхель — 20, Авіяна (Італія) — 60, Гедзі (Італія) — 30, Інджырлік (Турцыя) — 50, Волкел (Нідэрланды) — 20 адзінак. Мы іх палічылі да адзінкі.

Летась авіяцыйныя ядзерныя бомбы, якія змяшчаюцца на авіябазе Волкел у Нідэрландах, заменены на сучасныя боепрыпасы, больш магутныя. Цяпер у планах ажыццявіць мадэрнізацыю тактычнай ядзернай зброі і ў іншых краінах. У перспектыве не выключана размяшчэнне тактычных ядзерных боепрыпасаў на брытанскай тэрыторыі.

У другой палове года Белы дом плануе перакінуць на перадавую авіябазу Лейкенхіт у Вялікабрытаніі шматцэлявыя знішчальнікі F-35, здольныя несці тактычную ядзерную зброю. Ну, калі не хочуць эскалацыі і супраць ужывання ядзернай зброі, навошта гэта ўсё робіцца?

Цяпер пару слоў аб тым, як Вашынгтон працягвае нарошчваць ударна-наступальныя магчымасці ЗША ў Еўропе.

У снежні мінулага года на польскай тэрыторыі ўведзены ў эксплуатацыю базы супрацьракетнай абароны ЗША. Магчымасць прымяняць размешчаныя на ёй крылатыя ракеты «Тамагок», здольныя паражаць цэлі на ўсю глыбіню тэрыторыі Беларусі і еўрапейскай часткі, да Урала, Расійскай Федэрацыі, расцэньваем ужо як рэальную пагрозу нам. Калі гэта рэальная пагроза — трэба супрацьстаяць.

Мы фіксуем факты бесперапыннага вядзення паветранай і касмічнай разведкі на ўсходнім напрамку з боку заходніх дзяржаў. Задзейнічаны практычна ўвесь існуючы арсенал краін НАТА — ад самалётаў стратэгічнай разведвальнай авіяцыі да беспілотных лятальных апаратаў, а таксама адпаведныя магчымасці краін-партнёраў.

Вы павінны ведаць, што з мінулага года ў разы павялічылася інтэнсіўнасць разведвальнай авіяцыі Аб'яднаных узброеных сіл НАТА (у сярэднім гэта каля 40—50 самалёта-вылетаў у тыдзень). Мы іх фіксуем у рэальным рэжыме.

З 2019 года для радыёлакацыйнага кантролю паветранай прасторы Беларусі і заходніх абласцей Расійскай Федэрацыі прыцягваюцца самалёты Ваенна-паветраных сіл Аўстраліі. Ім што тут трэба?

Усё гэта адбываецца на фоне высокай вайсковай актыўнасці. З году ў год павялічваецца колькасць мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі на тэрыторыі Польшчы і Прыбалтыйскіх дзяржаў. Пры гэтым у большасці названых вучэнняў таксама бяруць удзел воінскія фарміраванні Узброеных сіл Штатаў і іншых заходніх краін.

Серыя вучэнняў Аб'яднаных Узброеных сіл НАТА і Узброеных сіл ЗША, якая праводзіцца ў Еўрапейскім рэгіёне, стала беспрэцэдэнтнай па сваім геаграфічным размаху і колькасці сіл і сродкаў, што прыцягваюцца (каля 90 тысяч чалавек і да 15 тысяч адзінак тэхнікі, каля 300 самалётаў і больш за 70 караблёў, у асноўным на Балтыцы).

Мэты мерапрыемстваў і характар адпрацоўвальных задач, якія запланаваны да канца мая, сведчаць аб тым, што Захад разглядае наш рэгіён у якасці патэнцыяльнага тэатра ваенных дзеянняў. Праціўнік вызначаны — Расія і Беларусь.

Мы бачым, як па той бок нашай заходняй граніцы ўдарнымі тэмпамі ўдасканальваюцца аэрадромы, ваенна-марскія базы, палігоны, ствараюцца перадавыя базы для своечасовага размяшчэння і захоўвання тэхнікі, узбраення і матэрыяльных сродкаў. Мы гэта фіксуем не толькі дзякуючы касмічнай разведцы, але і на зямлі.

Да гэтага часу на тэрыторыі Польшчы і краін Балтыі завершана мадэрнізацыя пяці аэрадромаў, дзвюх ваенна-марскіх баз, а таксама шасці найбуйнейшых палігонаў.

Фота БелТА.

У Польшчы ўведзены ў эксплуатацыю комплекс тылавога і тэхнічнага забеспячэння, гэта значыць, створаны ўмовы для аснашчэння ўзбраеннем і матэрыяльнымі сродкамі бранятанкавай баявой брыгаднай групы Сухапутных войскаў ЗША (гэта населены пункт Повідз, які забяспечвае захоўванне амаль трох тысяч адзінак баявой тэхнікі).

Што да баявых падраздзяленняў Узброеных сіл Польшчы на граніцы з Беларуссю, пра якія я казаў учора, на падставе ўзмацнення аховы вайскоўцы выконваюць разведвальныя дыверсійныя задачы. Ну і Польшча мае намер стварыць «самыя магутныя Сухапутныя войскі ў Еўропе». Зразумела, з дапамогай вайскова-тэхнічнай падтрымкі Злучаных Штатаў.

Варшава паступова нарошчвае колькасць Узброеных сіл — да 2035 года плануецца павялічыць іх да 300 тысяч чалавек (сёння ў іх крыху больш за 194 тысячы). Таксама не магу ўтрымацца ад каментарыя. У гэтай беднай Польшчы і так ужо няма каму працаваць, праблем вышэй за дах, грамадзянскіх! Аб якіх бітвах мараць? Хто іх будзе забяспечваць? Бо для вайны патрэбна магутная эканоміка, а яны сядзяць на датацыях Еўрасаюза і дапамогі Злучаных Штатаў Амерыкі. І навошта ім гэта трэба ўвогуле? Каторы раз папярэджваў і казаў, што мы не збіраемся з імі ваяваць! З тэрыторыі Беларусі яны не павінны чакаць ніякіх актыўных, агрэсіўных дзеянняў супраць польскай дзяржавы і народа. Нам гэта не трэба!

У структуры Сухапутных войскаў фарміруецца армейскі корпус, аператыўная гатоўнасць якога будзе дасягнута ўжо да верасня гэтага года.

Для неваенных людзей растлумачу, што значыць «аператыўная гатоўнасць». Гэта значыць сфарміраваны корпус, хоць заўтра ў бой, як на фронце. Поўная баявая гатоўнасць да поўнага разгортвання. Ну, прыкладна, як мы з Віцебска перакінулі пару батальёнаў і сталі цяпер лоб у лоб з НАТА. Гэта батальёны поўнай аператыўнай гатоўнасці, з гатоўнасцю выхаду з месцаў дыслакацыі на працягу трох гадзін. Тры гадзіны, і мы там.

Далей. На ўзбраенне новых механізаваных злучэнняў, не буду іх пералічваць, у СМІ мы вас праінфармуем, паступаюць сучасныя ўзоры ваеннай тэхнікі.

Польшча завяршае працэс фарміравання войскаў тэрытарыяльнай абароны. Камандаванне гэтага віду Узброеных сіл рапартуе аб дасягненні поўнай аператыўнай гатоўнасці.

На гэты час створаны 15 з 18 брыгад і навучальны цэнтр войскаў тэрытарыяльнай абароны. Мерапрыемствы па фарміраванні астатніх трох злучэнняў плануецца завяршыць ужо сёлета.

Перааснашчваючы Узброеныя сілы, Польшча робіць акцэнт на закупцы сучасных баявых самалётаў, па ўсім свеце, самых перадавых, у асноўным ЗША і Карэі, таксама чулі, беспілотных лятальных апаратаў, бранятэхнікі, рэактыўных сістэм залпавага агню і зенітных ракетных комплексаў як замежнай, так і нацыянальнай вытворчасці.

Акрамя таго, польскае кіраўніцтва мае намер заключыць кантракты на пастаўку амерыканскіх ударных верталётаў AH-64, так званы «Апач», ажно 96 адзінак.

Я не буду пералічваць колькасць узбраенняў Польшчы, кожную адзінку мы ведаем. Заўтра ў сродках масавай інфармацыі, у «СБ. Беларусь сегодня», прынамсі, мы апублікуем гэта.

Агульны аб'ём фінансавання праграм тэхнічнай мадэрнізацыі польскага войска да 2035 года прадугледжаны ў памеры 133 мільярдаў долараў. Ці ведаюць палякі, што з кожнага члена сям'і, уключна з немаўлятамі, аднімуць да 4 тысяч долараў?

Краіны Балтыі для ўмацавання ваеннага патэнцыялу асноўныя намаганні накіроўваюць на ўдасканаленне ваеннай інфраструктуры, павелічэнне ваенных расходаў, нарошчванне баявога і колькаснага складу нацыянальных узброеных сіл, адначасова пераўзбройваючыся на сучасныя ўзоры ваеннай тэхнікі.

У прыватнасці, у перспектыве на ўзбраенні ўсіх прыбалтыйскіх дзяржаў будуць змяшчацца амерыканскія РСЗА «Хаймарс».

Асобнай увагі заслугоўвае рашэнне літоўскага кіраўніцтва стварыць у структуры Узброеных сіл фарміраванне дывізіённага ўзроўню. Яго аснову складуць усе сухапутныя брыгады, а таксама будуць уключаны танкавыя (з пастаўкай на ўзбраенне нямецкіх танкаў «Леапард»), артылерыйскія (на ўзбраенні будуць стаяць РСЗА «Хаймарс», якія закупляюцца ў ЗША) і падраздзяленні забеспячэння. Гэтыя мерапрыемствы плануецца завяршыць да 2030 года.

Відавочна, што тэрыторыя Польшчы і краін Балтыі мэтанакіравана ператвараецца ў вайсковы плацдарм для яго магчымага задзейнічання блокам НАТА. Гэта значыць, зроблена практычна ўсё, каб падрыхтаваць кіраўніцтва альянсу да рашэння прымяніць ваенную сілу. У тым ліку крайнюю ваенную сілу.

Выходзячы з узроўню ваеннай небяспекі ў рэгіёне, асабліва ўвагі заслугоўвае ўзброены канфлікт на тэрыторыі Украіны, пра што я толькі што сказаў.

Кааліцыя заходніх дзяржаў мэтанакіравана яго зацягвае. Чаму, я вам таксама выказаў свой пункт погляду. Ператварылі і саму Украіну ў наркамана, якога трымаюць на кароткім павадку абяцанняў новай дозы дадатковых узбраенняў, у тым ліку дальнабойных сродкаў паражэння і фінансавых уліванняў.

У пачатку красавіка, падчас Брусельскай сустрэчы міністраў замежных спраў краін НАТА, было прапанавана стварыць так званую місію для Украіны з асобным бюджэтам каля 100 мільярдаў долараў на пяць гадоў. Адчуваеце, як амерыканцы перакладаюць фінансавы цяжар на Еўропу. Узносы на гэтыя патрэбы прадугледжваецца падзяліць прапарцыянальна валавому ўнутранаму прадукту краін блока НАТА.

Гэта і ёсць здзелка, аб якой учора казаў. Іншымі словамі, гэта плата за здольнасць працягваць супрацьстаянне з Расійскай Федэрацыяй, за актыўную дыверсійна-тэрарыстычную дзейнасць як у рэгіёнах Расіі, якія мяжуюць з Украінай, так і ў глыбіні расійскай тэрыторыі.

Зразумела, што фарміруецца напружаная сітуацыя на нашых паўднёвых рубяжах. У непасрэднай блізкасці ад беларускай граніцы засяроджана значная групоўка ўкраінскай арміі — каля 120 тысяч чалавек, тэрытарыялы і вайскоўцы.

У прыгранічных абласцях выкананы комплекс мерапрыемстваў па фарміраванні сістэмы абарончых рубяжоў, раёнаў і пазіцый, якія пастаянна ўдасканальваюцца.

УСЕНАРОДНЫ ПОГЛЯД НА БЯСПЕКУ

Наша граніца з брацкай Украінай цалкам замініравана з іх боку. Мы назіраем кругласутачную разведку ўсіх відаў, накіраваную супраць нашай краіны. Фіксуем сістэматычныя правакацыйныя і дэманстратыўныя дзеянні вайскоўцаў Кіева ў дачыненні да супрацоўнікаў беларускіх сілавых ведамстваў, якія знаходзяцца ў прыграніччы, у тым ліку з парушэннем дзяржаўнай граніцы Беларусі.

Верагоднасць узнікнення з боку ўкраінскіх падраздзяленняў узброеных правакацый, здольных перарасці ў прыгранічныя інцыдэнты, дастаткова вялікая. І гэтага вельмі чакаюць нашы хістальнікі «рэжыму». Ціхушкі і Лахушкі на фоне размоў аб магчымым зняцці забароны на прымяненне смяротнага пакарання ў Расіі (памятаеце, пасля апошняга тэракту ў Расіі) загаварылі аб увядзенні смяротнага пакарання ў Расіі, аб адмене Ельцынскага ўказа. Так нашы Ціхушкі, Лахушкі заклікалі знішчыць Беларусь, ні мала, ні многа. Цытата: «Беларусь застаецца апошняй краінай Еўропы, дзе ўжываецца смяротнае пакаранне. Яе неабходна знішчыць...»

Дзеля змены ўлады ў Беларусі яны, сапраўды, гатовыя на ўсё. Цяпер карэкціруюць асноўныя напрамкі сілавога сцэнарыя адпаведных дзеянняў. Удасканальваюць так званы план «Перамога 2.0». Акцэнт у ім робіцца на арганізацыі «нацыянальна-вызваленчага руху» на тэрыторыі Беларусі. Іван Станіслававіч падрабязней пра гэта скажа.

Мы гэтых падпольшчыкаў так званых выяўляем. І на тэрыторыі Беларусі яны яшчэ, схаваўшыся, як я казаў, пад плінтус і мятлу, сядзяць. Паказваем часам вам, каб не перанапружваць. Адсочваем, як па тым боку граніцы амерыканцы рыхтуюць Беларускае вызваленчае войска, аснову якога павінны скласці так званы «полк Каліноўскага» і іншыя добраахвотніцкія фарміраванні. Рускі добраахвотніцкі корпус і беларускі добраахвотніцкі корпус. Ненавідзяць Расію. Ворагі і маскалі, і гэтак далей. А карпусы сфарміравалі і моцна ўзаемадзейнічаюць. Напрыклад, атака на Белгарад. Нядаўняя атака. Памятаеце, у аснове быў расійскі добраахвотніцкі корпус і беларускі добраахвотніцкі корпус. Пасля нанясення артылерыйскага і ракетнага ўдару па гэтых сілах (а іх па асобных даных было больш за тры тысячы, атрад) і нашым дасталася, і расійскаму добраахвотніцкаму корпусу. Загінула нямала людзей. Мы дакладна ведаем: усе нашы так званыя грамадзяне-добраахвотнікі пахаваны ва Украіне. Працягваецца вярбоўка радыкальна настроеных беларускіх грамадзян у адпаведныя падраздзяленні, а таксама іх навучанне ў Польшчы, краінах Балтыі, іншых еўрапейскіх дзяржавах. Пункты і дыслакацыю ведаем да міліметра, і колькасць.

Атрыманыя навыкі яны адпрацоўваюць, у тым ліку шляхам удзелу ў баявых дзеяннях на тэрыторыі Украіны. Яны не хацелі б, вядома, ваяваць. Жадалі б вучыцца ў лагерах. Але ўкраінцы таксама не дурні. Жадаеце досвед атрымаць — на фронт. Не пойдзеце на фронт — карміць не будзем. Вось і ваююць. Цяпер яны, раніцай атрымаўшы апошнюю

Фота Бел ТА.

інфармацыю, занятыя — чым бы вы думалі? Выбарамі ў Каардынацыйны савет. І нават парламент там, тыпу Парламент там збеглы ў выгнанні — трэба ж нешта рабіць. І нават дайшлі да гэтых «каліноўцаў». Там ужо ўвогуле адбыўся залом. Яны ўжо там сысціся не могуць. Асабліва ў пытаннях палітыкі. Не ведаюць, каго прасоўваць. Аднаго прасоўваюць сёння ўвечары. Заўтра раніцай здымаюць з пасады, выдвараюць з так званага палка, выбіраюць новага. Ну, зразумела, вы іх вельмі шмат усіх, усіх практычна ведаеце. Грызня і бойка. І яны нам жадаюць арганізаваць тут Нацыянальна-вызваленчы рух. Ад каго? Дык вось гэтыя трэніруюцца ва Украіне, вядома, не ідэйныя барацьбіты. Найміты і здраднікі. Бандыты. Размова тут з імі не будзе доўгая.

Але я аб іншым хачу сказаць вам. Мы ўсе, у першую чаргу бацькі, на чыіх дзяцей заходнія спецслужбы сёння глядзяць як на вербавальны матэрыял, павінны быць больш уважлівымі да нашай моладзі. І не толькі бацькі.

Улічваючы цяперашнія рэаліі, трэба разумець, што сістэма забеспячэння нацыянальнай бяспекі Беларусі аб'ектыўна не можа заставацца нязменнай. У ёй з'явіцца новая тэма: ядзернае стрымліванне. Тыя, хто падштурхнуў нас да яе, павінны пра гэта ведаць і цвяроза глядзець на адназначныя наступствы сваіх, ну, мякка скажам, неасцярожных рашэнняў. Мы вывучылі ўрокі не толькі Украіны побач. Мы добра вывучылі і асвоілі ўрокі Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва пачатковага этапу, калі мы ўлагоджвалі тых, хто на нас напаў. Мы баяліся слова сказаць, каб іх не актывізаваць на граніцы. І што атрымалі? Пад Масквой былі менш чым за паўгода. Гэта для нас урок.

Таму на зацвярджэнне Усебеларускага народнага сходу мы выносім Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну Беларусі. У іх адлюстраваны ключавыя змены глабальнай ваенна-палітычнай абстаноўкі, нацыянальныя погляды на падтрыманне міжнароднага міру і стабільнасці, забеспячэнне ваеннай бяспекі нашай краіны і яе ўзброеную абарону.

Замацаваны палажэнні аб грамадскай згодзе, непахіснасці асноў народаўладдзя і прававой дзяржавы.

Як мне дакладваюць, над Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі працавалі не толькі вядучыя эксперты і прафесіяналы ў сферы бяспекі, але і прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, неабыякавыя грамадзяне. Мы вынеслі гэтыя дакументы на абмеркаванне беларускага народа.

Усе, каму неабыякавая будучыня краіны, маглі азнаёміцца з тэкстам дакумента і паўдзельнічаць у дыскусіях, унесці канкрэтныя прапановы па яго дапаўненні.

Зразумела, не ўсе механізмы абароны нацыянальных інтарэсаў нацыянальнай бяспекі былі вынесены на абмеркаванне. Каб усведамляць сур'ёзнасць і важнасць Канцэпцыі (Канцэпцыя — найбольш агульныя палажэнні), вы павінны ведаць: у развіццё гэтага дакумента прымаецца прававы акт закрытага характару, які ўстанаўлівае сістэму індыкатараў для ўсіх сфер жыццядзейнасці (палітычная, эканамічная, ваенная і іншыя).

На аснове гэтых паказчыкаў з рознай перыядычнасцю праводзіцца ацэнка стану нацыянальнай бяспекі. Мы вывучаем, як ідуць справы ў той ці іншай сферы, робім адпаведныя высновы і даводзім да беларускага народа.

Вы ж разумееце, проста замацаваць у Канцэпцыі асобныя палажэнні агульнага характару, як я сказаў, недастаткова. Трэба прасачыць, як змяняецца абстаноўка, як выконваюцца пазначаныя намі прыярытэты і якія неабходна прымаць меры рэагавання.

У выніку атрымліваецца комплексны зрэз развіцця дзяржавы на пэўным этапе. Па сутнасці, гэтыя два дакументы — Канцэпцыя і яе непублічная частка — складнікі аднаго цэлага.

Паважаныя дэлегаты!

І Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі, і Ваенная дактрына Беларусі, паўтару, — найважнейшыя дакументы стратэгічнага планавання. А стратэгічныя пытанні сёння ў кампетэнцыі не толькі Прэзідэнта, але і Усебеларускага народнага сходу.

Таму я вас вельмі прашу ўважліва паставіцца да той інфармацыі, якую я вам прадаставіў, і да больш канкрэтнай, якую прадставяць тут кіраўнікі трох сілавых ведамстваў.

Вырашаць складаныя задачы, выкладзеныя ў Канцэпцыі і Дактрыне, нам! Бо, як мы казалі, «Час выбраў нас!».

Дзякуй вам!

(*Апладысменты*.)

Фота Бел ТА.

АКЦЭНТЫ — НА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ: МІРЫ, СТАБІЛЬНАСЦІ І БЯСПЕЦЫ

Дэлегаты сёмага Усебеларускага народнага сходу адкрытым галасаваннем аднагалосна прынялі Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну Рэспублікі Беларусь

Прадстаўляючы праект Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі перад прыняццем дакумента, Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ адзначыў, што, зыходзячы з аналізу абстаноўкі, дакумент аб'ектыўна патрабаваў карэкціроўкі і адаптацыі да сучасных рэалій. Гэта, па яго словах, выклікана тымі працэсамі і тэндэнцыямі ў сістэме міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі ў рамках трансфармацыі нашага грамадства, якія сфарміраваліся за апошнія 14 гадоў пасля прыняцця папярэдняй рэдакцыі Канцэпцыі.

Фота БелТА.

ЭВАЛЮЦЫЙНЫМ, А НЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ШЛЯХАМ

Аляксандр Вальфовіч расказаў, з якіх ключавых падыходаў зыходзілі, працуючы над Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі. «Па-першае, дакумент павінен развіваць базавыя палажэнні, якія замацаваны ў нашай Канстытуцыі, змяшчаць кірункі для іх абароны, — канкрэтызаваў ён. — Пры гэтым іх імплементацыя праводзілася не тэхнічна, а змястоўна, па сутнасці кожнага новага палажэння. Па-другое, шлях стварэння дакумента быў абраны эвалюцыйны, а не рэвалюцыйны. Ён захаваў пераемнасць у адносінах да дзеючай Канцэпцыі. Усё найлепшае, што пазітыўна зарэкамендавала сябе, у тым ліку і на практыцы, было захавана. Структура, базіс, тэарэтычная і метадалагічная аснова таксама засталіся без кардынальных змяненняў. Размова ідзе аб наступнай мадэлі. Што абараняем? Нацыянальныя інтарэсы. Ад чаго абараняем? Ад пагроз і іх крыніц. Як абараняем? Праз напрамкі іх нейтралізацыі. І хто абараняе? Сістэма забеспячэння нацыянальнай бяспекі».

Па-трэцяе, як звярнуў увагу дзяржсакратар Савета бяспекі, Канцэпцыя — гэта дакумент, які вызначае асноўныя пасылы, якія зразумела і адназначна ўспрымаюцца нашымі грамадзянамі.

Усе новаўвядзенні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі аб'яднаны ў пяць буйных блокаў, у кожным з якіх адлюстраваны і адаптаваны змяненні. «**Першы блок** — удасканаленне базава-паняційнага апарату, ліквідацыя прабелаў, якія меліся, — паведаміў Аляксандр Вальфовіч. — Так, базавае паняцце «нацыянальная бяспека» дапоўнена мэтавым пасылам у выглядзе ўстойлівага развіцця для паступальнага руху грамадства да новага ўзроўню свайго існавання. «Нацыянальныя інтарэсы» дапоўнены асноватворным палажэннем Канстытуцыі аб грамадскай згодзе, непахіснасці асноў народаўладдзя і прававой дзяржавы. Гэтыя тэзісы непарыўна звязаны з важнай характарыстыкай нашай незалежнай дзяржавы — магчымасцю самім вызначаць сваю будучыню. У тым ліку гэта ўпершыню адлюстравана і ў паняцці электаральнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, якое прадугледжвае недапушчальнасць любога ўмяшання ў выбарчы працэс».

Адкарэкціраваны паняцці «крыніцы» і «пагрозы нацыянальнай бяспецы», упершыню дадзены вызначэнні рызыкі і выклікі нацыянальнай бяспецы. «Такі падыход дасць магчымасць усім упаўнаважаным суб'ектам больш эфектыўна ацэньваць стан нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і аператыўна прымаць меры рэагавання, — патлумачыў дзяржсакратар Савета бяспекі. — Акрамя таго, удакладнены і прыведзены да адзінага вызначэння ўсе паняцці бяспекі, у розных сферах».

Другі блок новаўвядзенняў — у праекце Канцэпцыі закладзены тры аспекты сучаснай ацэнкі абстаноўкі. «Гэта метадалагічныя зыходныя даныя, якія даюць разуменне, у якіх умовах нам трэба будзе забяспечваць нацыянальную бяспеку, — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. — Першы — на аснове комплекснага аналізу сфармуляваны асноўныя тэндэнцыі сучаснага свету, дадзена ацэнка іх развіцця на найбліжэйшую перспектыву, а таксама роля і месца Беларусі ў гэтым імклівым свеце, які змяняецца. Другі аспект — дадзена ацэнка бягучага стану нацыянальнай бяспекі з канкрэтнымі дасягненнямі і існуючымі праблемамі па ўсіх сферах. І, нарэшце, трэці аспект — у дачыненні да сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі Канцэпцыя напоўнена новым зместам вызначэння суб'ектаў. Да іх аднесены не толькі дзяржаўныя органы і арганізацыі, але і суб'екты грамадзянскай супольнасці, грамадзяне, якія рэалізуюць свае правы і абавязкі ў сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Гэта значыць, што, як і заўсёды было ў нашай гісторыі, уся краіна ўставала на абарону сваёй Айчыны».

Трэці блок змяненняў звязаны з новым напаўненнем шэрагу базавых палажэнняў Канцэпцыі. Размова ідзе аб нацыянальных інтарэсах Беларусі, пагрозах і асноўных напрамках па іх нейтралізацыі. Па словах дзяржсакратара Савета бяспекі, вылучаны новыя нацыянальныя інтарэсы, у іх ліку — пытанні нацыянальнай самабытнасці, дабрабыт і росквіт, развіццё суб'ектаў грамадзянскай супольнасці з улікам нацыянальных традыцый, грамадская згода, непахіснасць асноў народаўладдзя і прававой дзяржавы, забеспячэнне ваеннай бяспекі і ўзброенай абароны краіны ў любых умовах ваенна-палітычнай абстаноўкі.

Сфарміраваны новыя пагрозы нацыянальнай бяспецы. Сярод найбольш значных — дэструктыўнае ідэалагічнае ўздзеянне на насельніцтва, умяшанне звонку ў арганізацыю і правядзенне выбараў, парушэнне кіберустойлівасці дзяржаўных інфармацыйных сістэм.

Чацвёрты блок новаўвядзенняў — у выніку комплекснай прапрацоўкі пытання біялагічная бяспека ўтварыла ў Канцэпцыі самастойную сферу з улікам усіх сусветных зрухаў, якія выклікаюць сучасныя біялагічныя пагрозы. «Варта ўлічваць, што падзеі вакол спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне ўзмацнілі інтэнсіўнасць абмеркавання пытанняў аб біялагічнай зброі і рызык функцыянавання заходніх біялабараторый у постсавецкіх краінах», — заўважыў Аляксандр Вальфовіч.

Пяты блок змяненняў звязаны з пераглядам сістэмы індыкатараў, якія выкарыстоўваюцца для ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі. Удакладнены і пералік сіл забеспячэння нацыянальнай бяспекі Беларусі.

Рэзюмуючы, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі адзначыў, што ў Канцэпцыі ўлічаны прапановы, якія паступілі ад кіраўнікоў асноўных канфесій, перш за ўсё ад Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама ад Беларускага саюза жанчын, партыі «Белая Русь», Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі аб дадатковай абароне традыцыйнай сям'і як саюза мужчыны і жанчыны па нараджэнні. «Гэта дазволіць дадаткова абараніць інстытут беларускай сям'і, павысіць эфектыўнасць забеспячэння дэмаграфічнай бяспекі, — пераканаў ён. — Па выніках сустрэчы з актывам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, аблвыканкамаў, працоўнымі калектывамі ў рэгіёнах дапоўнілі Канцэпцыю палажэннямі аб павышэнні сацыяльнай адказнасці бізнесу і недапушчэнні дыспрапорцыі рэгіянальнага развіцця».

АДКРЫТАСЦЬ — ГАРАНТ ПАДТРЫМАННЯ МІРУ

У ходзе абмеркавання Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі **дэлегат Усебеларускага народнага сходу ад Гомельскай вобласці старшыня Лельчыцкага райвыканкама Сяргей ДЫЛЮК** спытаў у дзяржсакратара, наколькі апраўдана сёння такое адкрытае абмеркаванне Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі ва ўмовах бягучай ваенна-палітычнай абстаноўкі вакол нашых граніц, асабліва ўлічваючы тое, што ў многіх краінах гэты дакумент носіць закрыты характар.

Аляксандр Вальфовіч адзначыў, што гэтае пытанне неаднаразова задавалася ў ходзе адкрытых абмеркаванняў і на дыскусійных пляцоўках. «Да стварэння нашай незалежнай суверэннай дзяржавы, увядзення інстытута прэзідэнцтва ў нашай краіне такія дакументы сапраўды насілі закрыты характар, — нагадаў ён. — З увядзеннем інстытута прэзідэнцтва кіраўніком дзяржавы ў ліку прыярытэтных пытанняў было пастаўлена пытанне аб стварэнні такога дакумента, як Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі. І першая Канцэпцыя была прынята ў 1995 годзе, і яна ўжо тады мела адкрыты характар, што, на мой погляд, абсалютна правільна і аб'ектыўна. І ўсе наступныя дакументы, якія карэкціраваліся, таксама мелі адкрыты характар. Гэты дакумент паказвае адкрытасць нашай дзяржавы, сведчыць аб тым, што ўвесь народ павінен разумець тое, што адбываецца ў свеце, якая ваенна-палітычная абстаноўка непасрэдна вакол Рэспублікі Беларусь. Пры необходнасці кожны народ павінен устаць на абарону сваёй краіны, а каб стаць на яе абарону, павінен разумець, якая абстаноўка, якія нацыянальныя інтарэсы, якія сферы бяспекі, якія пагрозы па кожнай сферы бяспекі і як нейтралізаваць іх. У Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі акурат усё гэта выкладзена, таму наш народ павінен гэта разумець».

Па словах дзяржсакратара, такія дакументы, якія носяць адкрыты характар, садзейнічаюць падтрыманню міру і бяспекі не толькі ў Беларусі, але і ў свеце ў цэлым.

Дэлегат УНС ад Брэстчыны першы сакратар БРСМ Камянецкага раёна Лізавета БАСАЛАЙ заўважыла, што насельніцтва прымала актыўны ўдзел у абмеркаванні гэтага найважнейшага дакумента. Яна падзялілася меркаваннем, што Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі прымушае ўсіх задумацца аб будучыні і ці зможам мы ўсе разам зрабіць яе бяспечнай і мірнай. У сувязі з гэтым дэлегат удакладніла, наколькі далёка ўдалося зазірнуць за гарызонт, распрацоўваючы Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, і на які тэрмін яна разлічана.

Аляксандр Вальфовіч адзначыў: прыемна, што моладзь цікавіцца такімі пытаннямі, што было відаць і падчас дыскусійных пляцовак. Ён расказаў, што папярэдняя Канцэпцыя была прынята 14 гадоў таму. «Гэтыя дакументы сапраўды стратэгічнага планавання, яны павінны заглядваць далёка за гарызонт, вызначаць прыярытэты для развіцця нашай краіны, — пераканаў дзяржсакратар Савета бяспекі. — Жыццё ідзе наперад, геапалітычная абстаноўка мяняецца, з'яўляюцца новыя выклікі, рызыкі, пагрозы для нацыянальнай бяспекі, таму дакумент патрабаваў аб'ектыўнай карэкціроўкі. У ім па-новаму выкладзена бачанне нашай краіны на геапалітычную абстаноўку, на тыя сучасныя выклікі і пагрозы, на тыя чырвоныя лініі, якія нельга пераступаць. Таму, працуючы над гэтым дакументам, мы спрабавалі зрабіць запас трываласці перш за ўсё, каб гэты дакумент мінімум гадоў на дзесяць быў запатрабаваны і ім можна было кіравацца».

«ВАМ ТРЭБА БУДЗЕ АДКАЗВАЦЬ ЛЮДЗЯМ»

У сваю чаргу, Старшыня Усебеларускага народнага сходу расказаў, што, калі ўзнікла пытанне аб абнаўленні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, былі розныя прапановы, як будзем абмяркоўваць. «Мы ж на Савеце бяспекі абмеркавалі ў закрытым рэжыме гэтыя праблемы, нават шырэй, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Спрэчкі былі, ці варта нам усё гэта выносіць на публічнае абмеркаванне. Тады было прынята рашэнне — а нам чаго баяцца? Бо галоўная задача — супрацьстаяць, калі трэба будзе. А як супрацьстаяць будзе народ, калі ён не ведае загадзя, чаму ён будзе супрацьстаяць?».

Невыпадкова было прынята рашэнне давесці ўсю неабходную інфармацыю да народа. І гэтую работу неабходна працягваць у тым ліку дэлегатам УНС. Кіраўнік дзяржавы парэкамендаваў дэлегатам, каб яны па вяртанні дадому яшчэ раз перачыталі Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, Ваенную дактрыну, вынесеныя на зацвярджэнне УНС, і данеслі асноўныя пасылы да людзей.

«Гэта сур'ёзныя пытанні, усе павінны валодаць гэтымі праблемамі, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Вам трэба будзе адказваць людзям. Таму мы нічога не хаваем, гаворым адкрыта. Мы стварылі найсур'ёзнейшы дакумент. Гэта было няпроста. Абмеркавалі асобныя палажэнні на дыялогавых пляцоўках і сёння яшчэ раз больш адкрыта данеслі да вас — дэлегатаў. Слова за вамі».

(Працяг на 6-й стар.)

АКЦЭНТЫ — НА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ...

«Дакумент захаваў у сабе міралюбівыя памкненні беларускага народа садзейнічаць умацаванню міжнароднага міру і бяспекі»

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)

Перад тым, як вынесці на зацвярджэнне УНС яшчэ адзін найважнейшы стратэгічны дакумент краіны — Ваенную дактрыну Рэспублікі Беларусь, перад дэлегатамі з дакладам выступіў міністр абароны Віктар ХРЭНІН. Ён паведаміў, што з моманту прыняцця дзейнай рэдакцыі Ваеннай дактрыны кардынальна змяніліся палітыка-сілавая канфігурацыя і ваенна-палітычная абстаноўка ў Еўрапейскім рэгіёне. «Глабальнае супрацьстаянне паміж Захадам і Усходам перайшло ў «гарачую фазу», — канстатаваў кіраўнік абароннага ведамства. — Непасрэдна каля нашых граніц развязаны ваенны канфлікт, які можа стаць вырашальным для далейшага светаўладкавання».

Фота Белта.

Па словах міністра, міжнародныя арганізацыі па бяспецы і іншыя міжнародныя інстытуты фактычна перасталі з'яўляцца стрымлівальным фактарам ад развязвання ваенных канфліктаў. «Пад уплывам краін Захаду яны ствараюць умовы для надання легітымнасці прымяненню ваеннай сілы супраць дзяржаў, непажаданых гэтым краінам, — звярнуў увагу Віктар Хрэнін. — Пры гэтым ваенная сіла ваенна-палітычным кіраўніцтвам заходніх дзяржаў разглядаецца як адзін з асноўных сродкаў рэалізацыі сваіх нацыянальных і калектыўных інтарэсаў. Пашыраецца і спектр падстаў для яе прымянення».

Генерал-лейтэнант паведаміў, што істотна павысілася агрэсіўнасць палітыкі кіраўніцтва Польшчы і краін Балтыі, ідзе іх актыўная мілітарызацыя і фарміраванне вобраза ворага з Беларусі. Гэта, як падкрэсліў міністр абароны, парушае баланс сіл у рэгіёне, які склаўся, і стратэгічную стабільнасць у цэлым. На думку ведамства, у перспектыве гэтыя тэндэнцыі толькі ўзмацняцца.

Кажучы аб Ваеннай дактрыне, Віктар Хрэнін адзначыў, што перапрацоўка дакумента абумоўлена і развіццём нацыянальнай тэорыі ваеннага мастацтва. «Мы закрылі «белыя плямы» ў пытаннях прымянення ваеннай сілы ў мірны час, удакладнілі сістэму аперацый Узброеных Сіл, — канкрэтызаваў ён. — Прынялі шэраг знакавых рашэнняў у пытаннях ваеннага будаўніцтва, аснашчэння структурных кампанентаў ваеннай арганізацыі дзяржавы і развіцця абароннага сектара эканомікі, асабліва з улікам жорсткага санкцыйнага ціску з боку нашых апанентаў».

Міністр абароны падкрэсліў, што распрацаваны дакумент — гэта не толькі погляд вайсковцаў. Ен нагадаў, што ў рабоце над Ваеннай дактрынай удзельнічалі практычна ўсе дзяржаўныя органы. Больш за тое, новыя падыходы да рэалізацыі ваеннай палітыкі нашай краіны шырока абмяркоўваліся і сярод грамадскасці. З улікам усіх унесеных змяненняў і дапаўненняў распрацаваны праект Ваеннай дактрыны — гэта фактычна новы дакумент.

«Дакумент пачаў мець адрасны характар, — канкрэтызаваў міністр, кажучы аб новаўвядзеннях. — У ім дакладна названы крыніцы пагроз для Рэспублікі Беларусь. Дадзена ацэнка верагоднасці развязвання ваенных канфліктаў рознага віду. Уключаючы развязванне ўнутранага канфлікту рукамі псеўдабеларускіх экстрэмісцкіх арганізацый, накшталт «палка Каліноўскага» і да іх падобных. Мы таксама ўпершыню адкрыта звяртаем увагу міжнароднай супольнасці на рэгіянальныя амбіцыі кіраўніцтва Польшчы, якая можа паспрабаваць дасягнуць іх ваеннай сілай».

Важнае новаўвядзенне дакумента — уключэнне ў пералік ваенных небяспек магчымасці прымянення апанентамі ваеннай сілы супраць Рэспублікі Беларусь яшчэ ў мірны час. «Гэта тое, з чым мы сутыкаемся сёння на нашых паўднёвых і заходніх рубяжах, — патлумачыў кіраўнік абароннага ведамства. — Пры гэтым самі па сабе правакацыі, узброеныя акцыі і інцыдэнты з боку нашых суседзяў не з'яўляюцца ваенным канфліктам. Аднак яны могуць стаць каталізатарам яго развязвання. Таму і рэагаваць на іх неабходна. У першую чаргу сілавымі мерамі стратэгічнага стрымлівання, што мы цяпер і робім, паказваючы высокую баявую гатоўнасць усіх кампанентаў ваеннай арганізацыі дзяржавы».

Кардынальна мяняюцца падыходы да рэалізацыі ваеннай палітыкі і фарміравання пераліку мер рэагавання дзяржавы, выходзячы з узроўняў ваенных небяспек. Істотна пераасэнсаваны і характар ваенных канфліктаў для ўмоў нашай краіны. Зыходзячы з гэтага, удакладнена іх класіфікацыя, перапрацаваны мэты, якія праследуюцца ў іх Беларуссю, і парадак іх дасягнення. У новай рэдакцыі Ваеннай дактрыны дэталізаваны пытанні выканання саюзніцкіх абавязацельстваў нашай краінай і ўдзелу ў дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі.

«Акрамя таго, мы заяўляем аб гатоўнасці выканаць узятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы па садзейнічанні намаганням сусветнай супольнасці і органаў калектыўнай бяспекі ў падтрыманні або аднаўленні міжнароднага міру і бяспекі пад эгідай міжнародных арганізацый», — дадаў міністр абароны.

Рэзюмуючы сказанае, Віктар Хрэнін звярнуў увагу на пераемнасць распрацаванага дакумента. «Нягледзячы на глыбокую перапрацоўку змястоўнай часткі, дакумент захаваў у сабе міралюбівыя памкненні беларускага народа, наша імкненне садзейнічаць умацаванню міжнароднага міру і бяспекі, — падкрэсліў ён. — Мы асуджаем любы ваенны канфлікт як сродак рэалізацыі палітыкі і прытрымліваемся прынцыпаў мірнага ўрэгулявання спрэчак, роўнасці дзяржаў, неўмяшання ва ўнутраныя справы, а таксама іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права. Важны пасыл новай Ваеннай дактрыны заключаецца ў тым, што Рэспубліка Беларусь ні да аднаго народа не адносіцца як да свайго ворага, незалежна ад дзеянняў урадаў іх дзяржаў. У той жа час мы лічым правамерным прымяненне ўсіх наяўных у нас сіл і сродкаў для рэалізацыі прэвентыўных мер, накіраваных на прадухіленне агрэсіі або яе адбіццё».

«ГЭТА НЕ ШАНТАЖ І НЕ ЗАПАЛОХВАННЕ, А МАГЧЫМАСЦЬ АБАРАНІЦЬ НАШУ ДЗЯРЖАВУ»

У ходзе абмеркавання Ваеннай дактрыны выступіў **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Руслан ШКОДЗІН**, які паведаміў, што поўнасцю падтрымлівае прыняцце новай Ваеннай дактрыны, — дакумента, па яго словах, стратэгічна важнага і, самае галоўнае, своечасовага для краіны. «Не ўзнікае ніякіх сумненняў аб неабходнасці размяшчэння на тэрыторыі нашай дзяржавы тактычнай ядзернай зброі, — адзначыў дэпутат. — Разам з тым у ходзе абмеркавання розных пытанняў на дзяржаўных пляцоўках найбольш папулярным з'яўляецца менавіта гэта». Парламентарый удакладніў у міністра абароны, як гэтая акалічнасць адлюстравана ў новай Ваеннай дактрыне.

Перш чым адказаць на пытанне, Віктар Хрэнін расказаў, якой логікай кіраўніцтва краіны кіраваліся, прымаючы такое важнае рашэнне, як размяшчэнне ў сябе на тэрыторыі тактычнай ядзернай зброі. «Наша краіна была адной з першых, якая добраахвотна адмовілася ад размяшчэння ядзернай зброі на нашай тэрыторыі. За гэта нам былі паабяцаны павага да нашай незалежнасці, суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці, непрымяненне ваеннай сілы, эканамічнага ціску, — нагадаў ён. — Што мы бачым цяпер? Усё разбурана. Агрэсіўная палітыка несяброўскіх краін, эканамічны, палітычны, санкцыйны ціск. Вядома, пры такіх умовах мы павінны былі рэагаваць. Гэта наш дзейсны адказ на агрэсіўную палітыку несяброўскіх нам дзяржаў. Таксама, дзякуючы размяшчэнню нестратэгічнай ядзернай зброі на нашай тэрыторыі, мы атрымалі поўны арсенал усіх сіл і сродкаў для таго, каб нанесці непрымальную шкоду патэнцыяльнаму агрэсару. Гэта не шантаж і не запалохванне, а магчымасць абараніць нашу дзяржаву, забяспечыць мір нашым людзям».

У рамках абмеркавання Ваеннай дактрыны **настаўнік хіміі і біялогіі, кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні Ляшчанскай сярэдняй школы Шчучынскага раёна, член БРСМ Арцём ДАЛГОЎСКІ** адзначыў, што ў многіх рэгіёнах свету назіраецца палітычная, эканамічная і сацыяльная нестабільнасць, а войны і ўзброеныя канфлікты працягваюць заставацца суровай рэчаіснасцю. «Агрэсіўная ваенная палітыка заходніх дзяржаў, іх актыўная і неправамерна высокая мілітарызацыя, перш за ўсё суседняй з намі Польшчы, на мой погляд, вымушае нашу краіну і нашых саюзнікаў прымаць адказныя меры па ўзмацненні сваёй ваеннай бяспекі, — дадаў ён. — Пры гэтым ёсць пэўныя асцярогі, што наша краіна можа быць уцягнута ў гонку ўзбраенняў і мілітарызацыі. Ці апраўданы гэтыя асцярогі?»

Па словах міністра абароны, уцягванне ў гонку ўзбраенняў з'яўляецца адной з форм разбурэння дзяржавы. «Будзе разбурана эканоміка, гэта вымусіць дзяржаву адмовіцца ад сваіх сацыяльных гарантый насельніцтву, — патлумачыў ён. — Акрамя таго, мы лічым, што любая гонка ўзбраенняў прыводзіць толькі да абвастрэння крызісу міжнародных адносін і, як вынік, стварае ўмовы для развязвання ваенных канфліктаў. Менавіта зыходзячы з гэтых разменняў, мы і будуем сваю палітыку і развіваем ваенную арганізацыю дзяржавы. Таму, каб не быць уцягнутым у гэтую гонку ўзбраенняў, мы выбіраем іншыя формы і спосабы забеспячэння ваеннай бяспекі нашай дзяржавы. Некаторыя з гэтых форм і спосабаў адлюстраваны ў тым ліку ў праекце новай Ваеннай дактрыны».

Вераніка КАНЮТА.

«АТРЫМАЛІ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ — ДЫК ЯЕ ТРЭБА ЗБЕРАГЧЫ»

На некаторых пытаннях нацыянальнай бяспекі засяродзіў увагу і Старшыня Усебеларускага народнага сходу. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як у першыя гады нашай незалежнасці ад беларускага кіраўніцтва патрабавалі вывесці з тэрыторыі нашай краіны стратэгічную ядзерную зброю. «Мне давялося падпісваць гэты дакумент, — паведаміў Прэзідэнт. — Але, калі б мне давялося прымаць тады рашэнне, мы б ніколі не вывелі стратэгічную ядзерную зброю з тэрыторыі Беларусі. Гэта быў найбагутнейшы арсенал. Нам не трэба было б ніякай іншай сучаснай зброі. Але гэта было вырашана да мяне, па патрабаванні амерыканцаў».

Акрамя вываду ядзернай зброі, ад кіраўніцтва Беларусі на першым этапе яе суверэннага існавання патрабавалі знішчыць і звычайныя ўзбраенні. «Рэзалі ўсё: самалёты, танкі, артылерыйскія ўстаноўкі, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Я памятаю, прыехаў у Барысаў — жудасная карціна: перавернутыя танкі, БМП. Для мяне, чалавека, які нядаўна на афіцэрскай пасадзе адслужыў у арміі, гэта было не проста незразумела — гэта было жудасна. І тады, можа быць, не маючы паўнамоцтваў такіх, я спыніў гэтую разню: забараніў знішчаць браніраваную тэхніку. Рэзалі цэлыя кавалкі, грузілі ў чыгуначныя саставы і вывозілі ў Германію на пераплаўку».

З нядаўняга часу на тэрыторыі нашай краіны, па просьбе беларускага лідара, размяшчаецца расійская тактычная ядзерная зброя. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што мы ёй нікому не пагражаем, але гэта фактар стрымлівання. «Стратэгічную зброю, можа, і не трэба сюды вяртаць, мы ж не будзем ваяваць з Амерыкай, — заўважыў Прэзідэнт. — Стратэгічная зброя — гэта міжкантынентальныя балістычныя ракеты, якія ў нас былі размешчаны. Ну а аб тактычнай зброі і размовы быць не можа — яна павінна быць на тэрыторыі Беларусі. А паколькі нас яшчэ і ў суагрэсары запісалі (мы з Пуціным — «галоўныя ворагі ў свеце і агрэсары»), кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, супастаўляючы ўсе факты, прыняло рашэнне (яшчэ раз падкрэсліваю, па маім настаянні, а не таму, што яны хацелі тут стварыць базу ядзернай зброі), вярнула нам N-ю колькасць. Не буду называць лічбы, я ўжо казаў, некалькі дзясяткаў самых сучасных ядзерных боепрыпасаў».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ім прынята рашэнне аб размяшчэнні, абслугоўванні і дзеяннях ракетных комплексаў «Іскандэр» на тэрыторыі Беларусі. «Гэта вельмі небяспечная і вельмі магутная зброя, — падкрэсліў Галоўнакамандуючы. — Яна сябе паказала ўжо ва Украіне са звычайнымі ракетамі. Усё рэгламентавана. Супрацоўнікі Мінабароны і Генеральнага штаба добра ведаюць, што рабіць і ў якой сітуацыі».

Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі ў дастатковай колькасці хапае і звычайнага ўзбраення, нягледзячы на тое, што некаторыя пазіцыі мы і не выбраляем: напрыклад, ваенныя самалёты або сістэмы супрацьпаветранай абароны. «Усё, што выкарыстоўваецца на полі бою, мы купляем, — дадаў ён. — І расіяне, як нашы самыя блізкія саюзнікі і зацікаўленыя ў стабільнасці ў нашай краіне людзі, нам пастаўляюць па нашых саюзных дамоўленасцях. Сёння мы маем і комплексы супрацьпаветранай абароны, і самалёты, і верталёты. Артылерыі, танкаў у нас дастаткова. Добра, што тады не парэзалі і не адвезлі ў Германію на пераплаўку. Таму гэта ўсё ў нас ёсць: аўтаматы, кулямёты, гранатамёты, пісталеты. Нават гэтай зброі дастаткова, каб спыніць браніраваную тэхніку праціўніка».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь і яе народ павінны рабіць усё, каб зберагчы сваю незалежнасць, і пажадана без вайны. Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што ў Беларусі не хочуць вайны, і падкрэсліў, што ваенны цяжар прадугледжвае вялікія цяжкасці і пазбаўленні. Таму вельмі важна, па яго словах, цаніць цяперашняе добрае і камфортнае жыццё.

«Мы сёння поўныя рашучасці стапрацэнтна супрацьстаяць любому агрэсару і нанесці яму непрымальную шкоду, — падкрэсліў Старшыня Усебеларускага народнага сходу. — Таму перш чым ствараць кааліцыі, прасоўваць да нашай граніцы ўзброеныя сілы, правакаваць нас, каб мы выводзілі нашы батальённыя тактычныя групы і стаялі лоб у лоб... Ну, у нас столькі людзей пакуль няма і сіл няма. Мабілізацыю праводзіць я не збіраюся. Яны павінны разумець, што іх сталіцы зусім побач з нашай граніцай. Таму законнай цэллю, як прынята казаць, будуць тыя, хто прымае гэтае рашэнне».

Рэзюмуючы, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы не хочуць ні з кім ваяваць. «І я ўпэўнены: не будзем ваяваць, — дадаў ён. — Яны (праціўнікі. — **«Зв»**.) разумеюць, што мы можам сур'ёзна адказаць. А гэта адначасовая гібель мільёнаў людзей. Гэта новая вайна. Я ўжо не раз казаў: калі што, мы ўсе станем Брэсцкай крэпасцю, але абаронім сваю зямлю. Атрымалі незалежнасць — дык яе трэба зберагчы. Усяляк. Пажадана без вайны».

Іван ТЭРТЭЛЬ:

«У БАРАЦЬБЕ З ТЭРАРЫЗМАМ ДЗЕЙНІЧАЕМ ПА ЗАКОНАХ ВАЕННАГА ЧАСУ — РАШУЧА І БЕЗ ВАГАННЯЎ»

Што пагражае Беларусі і як супрацьстаяць выклікам

У Ваеннай дактрыне і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі дадзена аб'ектыўная ацэнка ўнутранай і міжнароднай, у тым ліку ваенна-палітычнай, абстаноўкі, структураваны асноўныя пагрозы асновам беларускай дзяржаўнасці, заявіў у сваім дакладзе старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ. Па яго словах, гэта дае кіраўнікам (найперш на месцах) выразныя арыенціры для выбудоўвання работы ў складаным становішчы, якое сфарміравалася пад уплывам знешніх фактараў.

Фота БелТА.

У АРСЕНАЛЕ ПРАЦІЎНІКА — КІБЕРАТАКІ, ВЯРБОЎКА, ТЭРАРЫЗМ

«Паводле нашых ацэнак, далейшае абвастрэнне вельмі напружанай сітуацыі ў свеце, у тым ліку ў еўрапейскім рэгіёне, пагражае непрадказальнымі наступствамі аж да ўспышкі канфлікту сусветнага маштабу», — заявіў Іван Тэртэль. У дадзеных умовах Рэспубліка Беларусь з яе стратэгічным геапалітычным становішчам, на восі супрацьстаяння ўсход — захад, міралюбівай добрасуседскай знешняй палітыкай з'яўляецца аб'ектам дэструктыўных памкненняў калектыўнага Захаду. Кіраўнік КДБ падкрэсліў, што ў адносінах да нашай краіны рэалізоўваецца сцэнарый, прыклад наступстваў якога мы назіраем ва Украіне з разбуранымі гарадамі, тысячамі ахвяр і фактычнай стратай суверэнітэту.

«Дакументальныя матэрыялы, якія атрымлівае знешняя разведка, адназначна сведчаць аб тым, што асноўнай мэтай у адносінах да Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ўстанаўленне поўнага кантролю над яе тэрыторыяй, эканамічным патэнцыялам і рэсурсамі, якія належаць беларускаму народу, — сказаў Іван Тэртэль. — Інструментарый: ад прасоўвання так званай мяккай сілы — укаранення ў свядомасць беларусаў чужых празаходніх каштоўнасцяў, якія размываюць маральныя асновы нашага грамадства, — да інспіравання сілавога захопу ўлады незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі, якія праходзяць падрыхтоўку на Захадзе і ва Украіне».

Паводле слоў Івана Тэртэля, планы, якія рэалізоўваюцца адносна нашай краіны, не з'яўляюцца нейкім ноу-хау. Матэрыялы архіваў КДБ сведчаць, што метады прымяняюцца старыя, дапрацаваныя з улікам сучасных рэалій. Ён спыніўся на некаторых дэталях. «У Вільнюсе, Варшаве, Кіеве, іншых сталіцах і рэгіёнах заходніх дзяржаў па прыкладзе гітлераўскай Германіі фарміруюцца марыянетачныя структуры, задзейнічаныя ў праектах па звяржэнні дзейнай улады. Пры паспяховай рэалізацыі планаў мяркуецца іх выкарыстанне ў якасці акупацыйнай адміністрацыі для кіравання тэрыторыяй і насельніцтвам нашай краіны. Для іх фінансавання амерыканскімі, нямецкімі, польскімі і некаторымі іншымі фондамі (усяго іх больш за 65), якія выступаюць у якасці пракладак замежных спецслужбаў, толькі сёлета выдзяляецца звыш 60 мільёнаў долараў. Сродкі выкарыстоўваюцца на ўтрыманне падрыўных цэнтраў, планаванне і рэалізацыю інфармацыйна-псіхалагічных аперацый у адносінах да кіраўніцтва і насельніцтва Рэспублікі Беларусь, арганізацыю кібератак на найважнейшыя аб'екты інфраструктуры, міністэрстваў і ведамстваў, вярбоўку і арганізацыю работы экстрэмісцкіх і тэрарыстычных груп унутры нашай краіны і незаконных узброеных фарміраванняў у сумежных нам Польшчы, Літве і Украіне», — распавёў Іван Тэртэль.

Паводле яго слоў, функцыянаванне антыбеларускіх замежных цэнтраў у якасці ключавога інструмента дэстабілізацыі сітуацыі ў Беларусі і дасягнення канчатковай мэты — захопу ўлады разглядае здзяйсненне тэрактаў, дыверсій, экстрэмісцкіх акцый, узброенае ўварванне. Іван Тэртэль прывёў прыклады. Так, у Польшчы праходзяць трэніроўкі па захопе адміністрацыйных будынкаў органаў улады, аб'ектаў праваахоўных і сілавых структур у Гродне, Брэсце, Мінску.

«У прыватнасці, у перыяд з 12 да 14 студзеня бягучага года на тэрыторыі закінутага дзіцячага лагера ў прыгарадзе Варшавы — населеным пункце Пагажэль Мазавецкага ваяводства — адбыўся так званы зігер, падчас якога да сотні баевікоў пад кіраўніцтвам інструктараў, якія атрымалі баявы вопыт ва Украіне, удасканальвалі узаемадзеянне пры правядзенні акцый тэрору і дыверсій на тэрыторыі Беларусі», — паведаміў кіраўнік КДБ. Іван Тэртэль расказаў, што Камітэт дзяржаўнай бяспекі ва ўзаемадзеянні з калегамі з іншых сілавых структур апошнім часам правёў шэраг вострых чэкісцкіх мерапрыемстваў, якія далі магчымасць прадухіліць нанясенне ўдараў баявымі дронамі з тэрыторыі Літвы па аб'ектах у Мінску і яго прыгарадах. «Работу па гэтым кірунку працягваем, дэталёвую інфармацыю агучыць грамадскасці пакуль не ўяўляецца магчымым», — падкрэсліў ён.

Сітуацыю, якая складваецца сёння на граніцы з Украінай, Іван Тэртэль ахарактарызаваў як «гарачы пункт». «Процідзеянне пастаянным спробам пракідкі на тэрыторыю Беларусі сродкаў для ўчынення тэрору і дыверсій, закідвання дыверсійных груп, агентуры ўкраінскіх спецслужбаў з мэтай учынення тэрактаў у Беларусі і Расіі стала паўсядзённасцю для супрацоўнікаў органаў пагранічнай службы, унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі. Толькі ў 2023-м і мінулым перыядзе бягучага года выяўлена больш за 40 каналаў пракідкі зброі, узрыўчаткі і іншых сродкаў паражэння ў Беларусь», — падкрэсліў кіраўнік КДБ.

ІХ ПЛАНЫ І ДЗЕЯННІ ВЯДОМЫЯ

Іван Тэртэль адзначыў, што сёння звяртае на сябе ўвагу ўцягванне моладзі ва ўчыненне злачынных дзеянняў, схіленне іх да ўчынення тэрактаў. «Асабліваю заклапочанасць выклікае палітыка ўкраінскіх улад, якія прыгрэлі на сваёй тэрыторыі крайніх радыкалаў, з якіх сфарміраваны так званыя Беларускі добраахвотніцкі корпус, полк Каліноўскага, батальёны «Волат», «Літвін» і іншыя. Баевікі названых фарміраванняў, што дакладна вядома спецслужбам сумежнай дзяржавы, выношваюць намеры ўзброенага ўварвання на тэрыторыю Беларусі з захопам аднаго з прыгранічных населеных пунктаў і перамяшчэння туды падрыхтаванай за мяжой акупацыйнай адміністрацыі. На даных камітэта, усяго на тэрыторыі Украіны прайшлі розныя стадыі падрыхтоўкі да тысячы баевікоў, якіх плануецца задзейнічаць для рэалізацыі гэтых планаў», — распавёў старшыня КДБ. Паводле яго слоў, усе гэтыя асобы, іх планы і дзеянні беларускім спецслужбам вядомыя.

«У барацьбе з тэрарызмам дзейнічаем па законах ваеннага часу — рашуча і без ваганняў», — заявіў Іван Тэртэль. Старшыня КДБ распавёў пра новую пагрозу для Беларусі — кібертэрарызм. Арганізацыя з тэрыторыі ЗША, Польшчы, Украіны, Германіі, Літвы і іншых дзяржаў атак на крытычную інфраструктуру — міністэрстваў і ведамстваў, бальніцы і іншыя аб'екты.

ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ВАЙНА І САНКЦЫІ

Аднак, як адзначыў Іван Тэртэль, тэрарызм і экстрэмізм — не адзіная пагроза, з якой мы сутыкаемся цяпер. «За мяжой ужо пачалі рэалізацыю канкрэтных планаў па ўздзеянні на нашу краіну ў перыяд электаральнай кампаніі 2025 года. Фарміруецца запас з прыцэлам на 2030 год. Мы ўбачым рэзкую актывізацыю інфармацыйнай вайны ў дачыненні да Беларусі з акцэнтам на дыскрэдытацыю кіраўнікоў дзяржавы, органаў улады і кіравання, падрыхтоўку з задзейнічаннем спецыялістаў замежных спецслужбаў і паліттэхнолагаў фэйкавых матэрыялаў», — адзначыў ён. Па словах Івана Тэртэля, Камітэту дзяржаўнай бяспекі вядомы гэтыя планы, іх выканаўцы і тэрміны. Меры па процідзеянні прымаюцца.

Сярод пагроз старшыня КДБ згадаў і незаконныя эканамічныя санкцыі. «Іх мэта — вярнуць эканоміку ў стан пачатку 1990-х гадоў, давесці насельніцтва да збяднення і такім чынам стварыць пункты напружання ў грамадстве і вывесці людзей на вуліцы», — сказаў ён. Любая сустрэча падрыўных варшаўскага і віленскага цэнтраў, іншых падобных структур з заходнімі палітыкамі і прадстаўнікамі спецслужбаў пачынаецца з жорсткага патрабавання ўвесці дадатковыя санкцыі ў дачыненні да беларускай банкаўскай сістэмы, бюджэтаўтваральных сектараў эканомікі, поўнасцю блакіраваць пасажырскія і грузавыя патокі праз граніцу Беларусі.

«Каб выстаяць у гэтым сапраўды лёсавызначальным для нашай краіны супрацьстаянні, спатрэбіцца кансалідацыя ўсяго грамадства, мабілізацыя ўсяго існуючага патэнцыялу, самаахвярная работа кожнага ў імя працвітання беларускай дзяржавы і народа», — сказаў Іван Тэртэль. Ён запэўніў, што высновы з падзей 2020 года і сітуацыі ва Украіне зроблены, урокі вывучаны, прыняты сістэмныя меры рэагавання. «Паўтору такіх падзей вакол сябе мы не дапусцім. Гатовыя да любых варыянтаў развіцця падзей, у тым ліку самых радыкальных», — заявіў старшыня КДБ.

Валерыя СЦЯЦКО.

«БЕЗ ЛЮДЗЕЙ МЫ НЕ ЗМОЖАМ». АБ ЧЫМ ПРЭЗІДЭНТ ПАПРАСІЎ БЕЛАРУСАЎ

Каментуючы даклад Івана Тэртэля, Аляксандр Лукашэнка папрасіў зрабіць наступную выснову: «Кожны, дзе ён знаходзіцца — у горадзе, у вёсцы, глядзіце вакол сябе. Інфармуйце нас з любой нагоды». Паводле яго слоў, пакуль удаецца супрацьстаяць розным пагрозам, аб якіх гаварыў кіраўнік камітэта дзяржбяспекі. «Паверце, адцягваюцца каласальныя рэсурсы: міліцыя, чэкісты, часткова ваенныя... Мы адцягваем вялізныя рэсурсы, каб стрымаць, асабліва дыверсантаў, якія перакідваюцца праз нашу граніцу», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, контрразведчыкам і міліцыі ўдаецца своечасова выяўляць і нейтралізаваць дыверсантаў. «Але ўявіце, гэта ж сотні кілаграм нават не трацілу, а пластыду, — заўважыў ён. — Супрацьстаяць гэтаму на ўсе 100 % немагчыма. Без людзей мы не справімся». Тым больш, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, многія аперацыі спецслужбы праводзілі з дапамогай звычайных грамадзян. «Таму звярніце на гэта ўвагу», — папрасіў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, спробы дэстабілізаваць абстаноўку ў Беларусі будуць працягвацца, бо да гэтага мэтанакіравана падштурхоўваюць збеглых, якія знаходзяцца за мяжой. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што людзі, якія збеглі па багатае жыццё, памыляліся ў сваіх чаканнях. «Беглі ж у асноўным не бедныя. Тут прывыклі на добрай рабоце працаваць. А там... Хочаце — посуд мыйце, яшчэ чагосьці там. Не кожны атрымліваў работу. Што рабіць? Вельмі хутка спецслужбы падказалі: «Стрэльбы бярыце, трэніруйцеся, пранікайце ў Беларусь, Расію і ўзрывайце. Грошы на гэта дадзім», — сказаў ён. Таксама знаходзіцца фінансаванне і на інфармацыйна-псіхалагічныя аперацыі, асабліва супраць Прэзідэнта, супрацоўнікаў сілавога блока. Але галоўнае, як звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, — гэта ўзброеная барацьба. Напрыклад, выношваюцца планы па захопе якога-небудзь невялікага населенага пункта ў Беларусі, і ў сувязі з гэтым часта называецца Кобрынскі раён.

«Ваяваць, здзяйсняць інтэрвенцыю яны, заказчыкі, самі не хочуць. Яны напярад запусцяць «дэмакратычныя сілы», якія будуць Беларусь «вызваляць ад дыктатуры». Там ад «дэмакратыі» нічога не засталося, гэта здраднікі і бандыты. Другой чаргой будуць ісці войскі НАТА. «Мы гэта цудоўна разумеем», — расказаў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, менавіта для гэтага ствараюцца «беларускі добраахвотніцкі корпус», полк Каліноўскага, харугвы і іншае. Як прыклад ён прывёў атаку на Белгарадскую вобласць Расіі. Існуе сцвярджэнне, што яна была здзейснена не ўкраінскімі сіламі, а «рускім добраахвотніцкім корпусам» сумесна з байцамі «беларускага добраахвотніцкага корпуса». Але пры гэтым, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, ніхто не гаворыць, што там былі яшчэ і тысячы суперпадрыхтаваных дыверсантаў і штурмавікоў Галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны. «Так, там былі беларускія «добраахвотнікі», чачэнцы, грузіны і многія іншыя — найміты. Але пераважная большасць — гэта падрыхтаваныя вайскоўцы Украіны. Аднак гавораць: «Гэта не мы. Гэта вашы там ішлі, каб вызваліць Расію ад Пуціна, чытай: Беларусь — ад Лукашэнкі, — сказаў Прэзідэнт. — Вось іх задума». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што такая тактыка ўжо выкарыстоўвалася: у часы Вялікай Айчыннай вайны фашысты не самі праводзілі карныя аперацыі, а выкарыстоўвалі для гэтага прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў. «Брудную работу будуць рабіць (прынамсі, пачынаць) нашы «добраахвотнікі». А далей — ідзі разбярыся», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка параіў звярнуць пільную ўвагу на інфармацыйную бяспеку ў краіне. Паводле яго слоў, сёння ў апанентаў атрымліваюцца кібератакі, таму што мы абы-як, нядбайна ставімся да работы з рознага роду сістэмамі, камп'ютарамі, гэтак далей. «Некаторыя нават на два-тры гады пароль не мяняюць у сваіх сетках і камп'ютарах. За гэта трэба ўжо несці крымінальную адказнасць. І хтосьці будзе несці. Не можаце працаваць у сетках, камп'ютарах — бярыце паперу і пішыце, як гэта было некалі раней», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама папярэдзіў усіх, хто з'ехаў з краіны, а цяпер выношвае планы супраць Радзімы, рыхтуючыся да нападу на яе: «Не забывайце, што вы вельмі моцна шкодзіце сваім сваякам. Не забывайце, што ў вас нейкая ўласнасць ёсць тут, — раю ўжо забыцца пра гэту ўласнасць. Але не стаўце пад удар сваіх сваякоў».

ДАКУМЕНТЫ ЗАХАВАННЯ МІРУ

У чым сутнасць Ваеннай дактрыны і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі

Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу выказалі свае меркаванні наконт прадстаўленых Ваенных дактрыны і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Людзі розных прафесій, розных поглядаў і інтарэсаў — таму і меркаванні былі розныя, што дазволіла разгледзець гэтыя найважнейшыя дакументы з усіх бакоў.

Вадзім ГІГІН:

«Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі — гэта праграма міру»

Фота БелТА.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вадзім ГІГІН заўважыў, што Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі — гэта не толькі асноўны ваенна-палітычны, нават сацыяльна-эканамічны дакумент, але і ідэалагічны. «Канцэпцыя развівае тыя сэнсы, якія былі закладзены ў тэкст Канстытуцыі, што прынялі на рэферэндуме 27 лютага 2022 года. У першую чаргу, гэта зацвярджэнне каштоўнаснай асновы нашага грамадства. Вось тыя самыя стратэгічныя нацыянальныя інтарэсы — гэта і ёсць пастулаты, якія павінны складаць базіс ідэалогіі беларускай дзяржавы: абарона традыцыйных каштоўнасцяў, адстойванне гістарычнай праўды, патрыятычнае выхаванне, пераемнасць пакаленняў. Гэта ўсё тое, што складае непасрэдна паняцце ідэалогіі як сістэмы ідэй і поглядаў», — сказаў Вадзім Гігін.

Адначасова дакумент дае гарантыі развіцця асобаснага патэнцыялу грамадзян, жыццядзейнасці кожнага, адзначыў дэпутат. «Чырвонай ніткай праз увесь тэкст праходзіць прыярытэт незалежнасці, суверэнітэту і самабытнасці айчыннай палітычнай сістэмы», — падкрэсліў парламентарый.

Вадзім Гігін назваў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі праграмай міру: «У ёй няма ніякіх мілітарысцкіх палажэнняў, поўнасцю адсутнічае лязганне зброяй ці пагроза ў чыйсьці бок. І гэта выгадна адрозніваe і нашу Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, і Ваенную дактрыну ад таго, што прымаюць у краінах НАТА». Парламентарый падкрэсліў, што Беларусь была і застаецца донарам міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі. «А дасягнуць гэтага стану магчыма толькі пры наяўнасці ўнутранай згуртаванасці, умацавання народнай згоды і абароны нашых традыцыйных каштоўнасцяў», — падкрэсліў Вадзім Гігін.

Мікалай БУЗІН:

«Беларусь не прымае сілавога дыктату і заўсёды гатова да дыялогу»

Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Мікалай БУЗІН у сваім выступленні звярнуў увагу, што цяпер планета ўвайшла ў гарачую стадыю пераўладкавання свету. «Гэта вядзе да росту колькасці і інтэнсіўнасці ўзброеных канфліктаў, трансфармацыі міждзяржаўнага процідзеяння і ўзрастання значнасці ваеннай сілы», — сказаў ён. Па словах парламентарыя, не выклікае сумнення, што ў перспектыве ўзровень ваеннай небяспекі не зменшыцца. А таму Беларусь будзе вымушана адстойваць свой суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць. Менавіта для гэта і адпрацоўваецца Ваенная дактрына. Мікалай Бузін падкрэсліў, што дакумент не прадугледжвае кардынальных змяненняў палажэнняў ваеннай палітыкі дзяржавы, захоўвае міралюбівую рыторыку і абарончую накіраванасць. «Яна разглядаецца як сістэма поглядаў на падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі, забеспячэнне ваеннай бяспекі дзяржавы, — сказаў ён. — Па сутнасці, абноўленая Ваенная дактрына расстаўляе ўсё на свае месцы і гаворыць нармальнай мовай аб тых працэсах, якія адбываюцца ў свеце. У дакументе вызначаны знешнія і ўнутраныя ваенныя небяспекі для нашай краіны. Асобны акцэнт зроблены на спробах асобных дзяржаў і кааліцый забяспечыць сваё лідарства шляхам гібрыдных войн, рэалізацыі сцэнарыяў каляровых рэвалюцый, прымяненнем сіл і правакаваннем унутраных узброеных канфліктаў. Мы ўсё гэта бачым на ўласным досведзе».

Мікалай Бузін зазначыў, што Дактрына падкрэслівае, што Беларусь гатова з усімі без выключэння краінамі свету будаваць адносіны на аснове ўзаемнага даверу і мірнага суіснавання. Ён назваў Ваенную дактрыну дакументам захавання міру, а не эскалацыі насілля і вайны. «Беларусь заяўляе, што не прымае сілавога дыктату, але заўсёды адкрыта да раўнапраўнага дыялогу. Не мае ні да кога прэтэнзій, але гатова абараняць уласны суверэнітэт і выбраны народам шлях развіцця. Менавіта ў гэтым сутнасць абноўленай Ваеннай дактрыны», — падкрэсліў ён.

Алена ГІРОН:

«Беларусы, як ніхто іншы, ведаюць каштоўнасць міру»

Фота БелТА.

Дырэктар Браслаўскай гімназіі Алена ГІРОН з трыбуны Усебеларускага народнага сходу выступіла ад імя ўсіх жанчын і маці Беларусі. Яна падкрэсліла, што за апошнія гады беларусы прывыклі да міру, спакою, стабільнасці. Аднак, па яе словах, сітуацыя вакол нашых граніц, мілітарысцкая рыторыка заходніх краін прымушае людзей усё часцей успамінаць такое паняцце, як «знешнія пагрозы», і абмяркоўваць, ці будзе вайна. Алена Гірон упэўнена, што ўсё гэта павысіла запыты грамадства на забеспячэнне бяспекі, захаванне незалежнасці і суверэнітэту.

«Я маці сына, які марыць аб ваеннай прафесіі. Мы, маці, давяраем арміі самае дарагое, што ў нас ёсць, — нашых дзяцей. Канешне, мы разумеем, што служба ў арміі звязана з рызыкай для жыцця. У той жа час, мы спакойныя, мы адчуваем падтрымку дзяржавы, мы ўпэўнены, што нашы хваляванні будуць пачуты. Аб гэтым сведчыць пераемнасць Ваеннай дактрыны, міралюбнасць ваеннай палітыкі нашай краіны», — сказала Алена Гірон.

Алег БАРАНАЎ:

«Новыя палажэнні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі навукова абгрунтаваныя»

Акадэмік-сакратар Аддзялення біялагічных навук НАН Беларусі Алег БАРАНАЎ падкрэсліў, што новыя палажэнні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі маюць дакладнае навуковае абгрунтаванне. Асобна ён адзначыў важнасць і своечасовасць уключэння ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі новых палажэнняў, якія гарантуюць біялагічную бяспеку. «Час, які прайшоў пасля пандэміі каранавіруса, выявіў новыя факты ў дачыненні да крыніц і ўзбуджальнікаў асабліва небяспечных вірусных інфекцый, выпрабаванні біялагічнай зброі на тэрыторыі сумежных краін з выкарыстаннем розных відаў патагенных мікраарганізмаў, а таксама насякомых у якасці іх пераносчыкаў. Нават звычайныя камары пасля іх спецыяльнай апрацоўкі здольныя распаўсюджваць розныя віды інфекцыйных захворванняў. Усё гэта толькі пацвердзіла правільнасць і своечасовасць прынятых намі мер», — падкрэсліў ён. Пры гэтым, акрамя ўвядзення ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі новай сферы, з улікам павышэння значнасці біялагічных рызык і выклікаў дадаткова была распрацавана і галіновая Канцэпцыя нацыянальнай сістэмы забеспячэння біялагічнай бяспекі.

Валерыя СЦЯЦКО.

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ,

СТАРШЫНІ УНС АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ НА ЗАКРЫЦЦІ ПАСЯДЖЭННЯ VII УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

Паважаныя дэлегаты VII Усебеларускага народнага сходу!

Паважаныя замежныя госці!

Нашы запрошаныя!

Дарагія суайчыннікі!

Мы разгледзелі сёння ўсе пытанні, уключаныя ў наш парадак дня. Кажуць, першы блін заўсёды камяком. Ну, ён не зусім камяком атрымаўся. Будзем лічыць, што мы яшчэ вяршыні ў нашай рабоце не дасягнулі. Абяцаю, што дасягнём. Завяршылася работа першага пасяджэння VII Усебеларускага народнага сходу, сфарміраванага ў новым канстытуцыйным статусе. У летапіс дзяржаўнага будаўніцтва ўпісана новая старонка.

Я сёння паспеў паглядзець нашы сродкі масавай інфармацыі. Можа, не прынята Прэзідэнту цытаваць сваіх падначаленых, але, тым не менш, мне запомнілася звычайная, можа быць, нават банальная, але вельмі дакладная фраза, сказаная кіраўніком нашага Першага нацыянальнага канала Іванам Эйсмантам: «Вялікае бачыцца на адлегласці». Не спрабуйце сёння ацаніць сваю работу, нашу работу. Давайце трошкі пачакаем, і потым мы ацэнім пачатак таго вялікага шляху, які мы маем намер з вамі прайсці.

Мы, народ Беларусі, выходзячы з адказнасці за сучаснасць і будучыню краіны, жадаючы забяспечыць мір і згоду, дабрабыт нашых грамадзян, непахіснасць народаўладдзя, незалежнасць і працвітанне нашай Беларусі, прынялі дакументы стратэгічнага планавання — Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну нашай дзяржавы. У гэтых дакументах нашы памкненні і спадзяванні, беларускі шлях у сучасным вельмі небяспечным і неспакойным свеце.

У дні работы УНС мы заклалі прававы падмурак нашай бяспекі. Гэта залог выканання жаданняў мільёнаў беларусаў.

Упэўнены, прынятыя рашэнні паслужаць трывалай асновай для захавання беларускага народа як унікальнай гістарычнай супольнасці і прымнажэння нацыянальнага багацця, створанага цэлымі пакаленнямі.

Але адных рашэнняў недастаткова. Напарадзе самае галоўнае — карпатлівая праца. І тут я хачу зберагчы вас ад раўнадушша і абыякавасці, пра якія я казаў. Бо быць дэлегатам УНС — гэта, у першую чаргу, несці адказнасць за лёс краіны, выступаць барометрам грамадскіх настрояў, быць прынцыповым у абароне нацыянальных інтарэсаў.

Усім нам трэба даць справаздачу аб сваёй рабоце, далажыць тым, хто вас дэлегаваў, па ўсіх пытаннях, якія разглядаліся на Усебеларускім народным сходзе. Данесці да кожнага, як важна сёння быць моцнымі, адзінымі і згуртаванымі ў адстойванні інтарэсаў роднай краіны.

Вас дэлегавалі — значыць, вам давяраюць, да нас прыслухоўваюцца. Выкарыстоўвайце гэты давер на карысць росквіту нашай роднай зямлі. Умацоўвайце свой аўтарытэт справамі, падтрымлівайце ініцыятывы людзей, дапамагайце ім аб'яднацца для гэтага.

І памятайце: наша веча, Усебеларускі народны сход, не падмяняе дзяржаўныя органы і не ўмешваецца ў іх дзейнасць!

Усебеларускі народны сход, вядома ж, — палітычны інстытут. Як многія з вас учора адзначылі ў сваім інтэрв'ю ў СМІ: гэта тая пляцоўка, на якой прысутнічаюць усе: ад звычайнага, простага вяскоўца, рабочага каля станка да кіраўніка дзяржавы, дзе мы павінны абмяркоўваць галоўныя стратэгічныя пытанні і арыентаваць наша грамадства, якім шляхам ісці і развівацца.

Нельга дапусціць, каб УНС ператварылася ў бюракратычны апарат. Людзям трэба данесці, што ў кампетэнцыі УНС выключна глабальныя пытанні, стратэгія — як будзем жыць далей, як будзем развівацца, на якіх каштоўнасцях выхоўваць дзяцей і будаваць нашы грамадскія адносіны. Пытанні штодзённасці, будаўніцтва дамоў, рамонт дарог, дахаў, платоў былі і застануцца ў кампетэнцыі ўсёй вертыкалі органаў улады. Але і мы ж вочы не будзем на іх закрываць, вы, дэлегаты, у тым ліку. Але ў любых справах, у вялікіх і малых, нам усім неабходна кіраваць нацыянальнымі інтарэсамі, вырашаць задачы па-дзяржаўнаму, не дапускаць кан'юнктурных падыходаў. Мы будзем сапраўдным нацыянальным фронтам. Яго крыху, гэты тэрмін, спаганілі, але гэта сапраўды будзе так.

(Апладысменты ў зале.)

Мы павінны, нягледзячы ні на што, быць вышэй за асабістыя амбіцыі і часам за бягучыя абставіны. Наша задача — абараніць суверэнітэт і незалежнасць нашай Радзімы. Мы павінны захаваць краіну, забяспечыць яе шчаслівую будучыню.

Больш за нас гэта ніхто не зробіць, бо час выбраў нас!

Аб'яўляю першае пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу закрытым.

(Гучыць Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.)

На адной хвалі

ЧАС СПРАЎДЖВАЦЬ МАРУ

Галоўны медыяхолдынг краіны правядзіць набор слухачоў на навучальныя курсы тэлерадыёвядучых па адукацыйнай праграме «Спецыфіка работы тэлерадыёвядучага».

Для тых, хто заўсёды марыў аб прафесіі вядучага, з'явілася выдатная магчымасць рэалізаваць сваё жаданне. Вядомыя выкладчыкі, вядучыя і рэпарцёры пазнаёмяць слухачоў курсаў са светам тэлебачання, падзеляцца прафесійнымі сакрэтамі. Яшчэ вас чакаюць заняткі па тэхніцы маўлення, асновам акцёрскага майстэрства і тэлерадыёжурналістыкі, будзе таксама практыка работы ў студыі, у тым ліку і з тэлесуфлёрам.

Працягласць навучання — 3-4 месяцы. Пачатак заняткаў будзе вызначаны пасля таго, як сфарміруецца група. А на выхадзе выпускнікі атрымаюць даведкі аб адукацыі дзяржаўнага ўзору.

Да навучання запрашаюцца прэтэндэнты ва ўзросце ад 18 да 40 гадоў. Каб запісацца на курсы, патрэбна запоўніць анкету (бланк якой можна знайсці на сайце Белтэлерадыёкампаніі) і запісаць відэаролік з расповедам пра сябе працягласцю да адной хвіліны. Анкеты і відэавізітоўкі дасылайце на адрас электроннай пошты: kursyBT@yandex.by. А дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне (8017) 389-63-34.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 216

4—12.04.2024 г. адбыліся чэмпіянаты краіны па шашках-100 (Вышэйшая ліга). У мужчын была вельмі напружаная барацьба, нікому з удзельнікаў не ўдалося пазбегнуць паражэння. Да апошняга тура не было зразумела, хто ўвойдзе ў тройку прызёраў. Міжнародны гросмайстар Яўген Ватуцін, які перамог у апошнім туры, другі год запар стаў чэмпіёнам краіны. На другім месцы — міжнародны майстар Аляксей Куніца. «Бронзу» заваяваў міжнародны гросмайстар Сяргей Насевіч. Залаты медаль у жанчын выйграла майстар Віктурыя Нікалаева, якая захапіла лідарства з першага тура. На другім месцы — Паліна Петрусёва, якая адстала ад чэмпіёнкі на адно очко. Трэцяй фінішавала майстар Яўгенія Швед. Цікава, што ў жанчын гэта быў ужо юбілейны 50 чэмпіянат. Пачынаўся ён у дзень юбілею шматразовай чэмпіёнкі свету Алены Ратковіч (Альтшуль), а заканчваўся ў дзень нараджэння экс-чэмпіёнкі свету Людмілы Сахненка (Ільіной). Абедзве спартсменкі ў мінулым былі лідарамі беларускіх шашыстак.

13—14.04.2024 г. у мінскай СДЮШАР па шахматах і шашках адбыўся XV адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 памяці шматразовага чэмпіёна Беларусі М. С. Гелера. У турніры ўзяў удзел 31 шашыст, сярод якіх пяць міжнародных гросмайстраў на чале з дзейным чэмпіёнам свету Андрэем Валюком. Перамог міжнародны гросмайстар Уладзіслаў Валюк.

№ 64

№ 64 В. Варушыла — А. Куніца

Белыя простыя: a1, c1, g1, b2, e3, g3, h4, a5 (8).

Чорныя простыя: a3, d6, h6, a7, c7, b8, d8, h8 (8).

Чорныя адчуваюць цяжкасці з уводам у гульню шашкі h8, таму гросмайстар палічыў за найлепшае фарсіраваць нічыю 1...d6-e5 (пагроза ef4+) 2. e3-d4 e5:c3 3. b2:d4 h6-g5 4. h4:f6 d8-e7 5. f6:b6 a7:e3 6. a5-b6 h8-g7 7. g3-h4 g7-f6 8. b6-a7 f6-e5 9. h4-g5 e5-d4 10. g5-f6 d4-c3 11. f6-e7 c3-d2 12. e7-d8 d2-e1 13. d8-a5 e1-g3 14. a5-e1 g3-c7. Белыя планавалі забраць шашку e3 ходам 15. e1-f2, аднак заўважылі e3-d2! 16. c1:e3 c7-a5 =.

№ 65 В. Варушыла — І. Драгун

Белыя простыя: c1, e1, g1, b2, d2, f2, h2, a3, e3, f4 (10).

Чорныя простыя: h4, a5, c5, g5, h6, a7, c7, b8, d8, f8 (10).

1. b2-c3 a7-b6? [нельга 1... d8-e7? бо ўслед рушыць разгромны ўдар 2. f2-g3 h4:b2 3. e1-f2 g5:e3 4. f2:a1x] 2. f4-e5! f8-g7 3. e5-f6 g7:e5 4. c3-b4 a5:c3 5. d2:f4+.

№ 66 М. Тараніна — Г. Буйліна

Белыя простыя: 42, 45, 38, 39, 33, 35, 26, 21, 16 (9).

Чорныя простыя: 22, 23, 24, 17, 11, 12, 13, 7, 10 (9).

Чорныя правялі ўдар «Масток». Знайдзіце яго самастойна.

№ 67 В. Арцюхін (Мінск)

Белыя простыя: e1, g1, b2, d2, c3, e3, g3, f4 (8)

Чорныя простыя: a3, a5, e5, d6, h6, c7, e7 (7)

№ 68 В. Марцінкевіч (Глыбокае)

Белыя простыя: c1, a3, e3, g5, h6 (5).

Чорныя простыя: d2, g3, f4, a5, d6 (5).

№ 69 Ю. Голікаў (Цвер)

Белыя простыя: d2, f2, g3, d6, c7 (5).

Чорныя простыя: d4, f4, a5, e5, g5, g7, b8 (7).

№ 70 Г. Андрэеў (Латвія)

Белыя простыя шашкі: a1, b2, f2, a3, d4, c5, h6, e7 (8).

Чорныя простыя шашкі: e3, b4, h4, a5, d6, g7, f8 (7).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні. Выпуск № 215 ад 12.04.2024 г.

№ 56 1. d6-c7 b4-c3 2. d2:d6 f6-e5 3. f2-g3 h4:d4 4. f4-g5 h6:f4 5. c7-d8 e5:c7 6. d8:f8 +

№ 57 1. e5-f6 c3:g7 [1...g3:g7 2. e1:g3 h2:f4 3. e7-f8 c3:e5 4. f8:c5 e5-f4 5. c5-f2 f4-g3 6. f2:h4] 2. e7-f8 g3:e5 3. e1:g3 h2:f4 4. f8:c5 e5-f4 5. c5-f2+

№ 58 1. e5-d6 c3:c7 [1...g3:c7 2. e1:g3 h2:f4 3. e7-f8 c3:e5 4. f8:b8 e5-d4 5. b8-f4 d4-c3 6. f4-c1] 2. e7-f8 g3:e5 3. e1:g3 h2:f4 4. f8:b8 e5-d4 5. b8-f4 d4-c3 6. f4-c1+

№ 59 1. 29-23 28:10 2. 25:05 39-43 3. 48:39 37:48 4. 05:37 48:45 5. 37-48 26:37 6. 48:01+

№ 60 1. 35-30 40:49 2. 30-24 19:30 3. 27-21 16:27 4. 32:14 49:05 5. 37-32 05:37 6. 48-42 37:48 7. 46:37 48:31 8. 26:37+

№ 61 1. c7-b8 b4-c3 [1...g7-f6 2. g5:e7 b4-c3 3. b8-e5 d4:d8 4. b2:d4]

2. c1-d2 a3:e3 3. g5-f6 g7:e5 4. b8:b4 d4-e3 5. b4-e1+

№ 62 1. g5-h6 g7-f6 2. c1-d2 a3:c1 3. e3-f4 c1:g5 4. h6:b8+

№ 63 1. d6-e7 b8:f8 2. f4:d6 a5:e5 3. a7-b8 h6:f4 4. h4-g5 f4:h6 5. b8:d6 h2:f4 6. d6:g3+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце на адрас: газета *«Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013 e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Жыццё ў стылі эка

ПОСУД ДЛЯ ПІКНІКА

Да майскіх свят ужо рукой падаць. На небе сонейка пяшчотнае зіхаціць, дрэвы маладзенькай лістотай гамоняць, траўка зялёная вабіць пабегаць. Самы час пікнік зладзіць: чыстым паветрам падыхаць, а можа, і шашлыкі-каўбаскі пасмажыць. Толькі які посуд на стол ставіць? Аднаразовы пластыкавы?

На першы погляд у паходах на прыроду ён вельмі зручны: танны, лёгкі, можна не мыць — выкарыстаў і выкінуў на сметнік. Праўда, з пункту гледжання здароўя і навакольнага асяроддзя выбар так сабе. Пластык няпроста ўтылізаваць, ды і вырабляецца ён далёка не з бясшкодных матэрыялаў: полікарбанату (маркіроўка PC), полістыролу (PS), полівінілхларыду (PVC) і іншых. Найбольш небяспечная тара (звычайна вырабы з маркіроўкай PVC і PC) змяшчае бісфенол. Ён асабліва шкодны пры цяжарнасці, бо зніжае ў плацэнце ўзровень сератаніну, неабходнага для развіцця мозгу эмбрыёна.

Многія віды пластыку пры награванні вылучаюць таксіны (фталаты, фармальдэгіды, полікарбанаты і інш.), якія назапашваюцца ў арганізме і выклікаюць парушэнні сэрца, нервовай сістэмы, нырак, печані, а таксама спрыяюць развіццю ракавых пухлін. Таму пластыкавы посуд, за выключэннем поліпрапіленавага, не прызначаны для напояў і ежы з тэмпературай вышэй за 80 °С. Яго нават у гарачай вадзе мыць не варта. Не рэкамендуецца такая пакідаць на сонцы або каля агню — пранікненне таксінаў у прадукт павялічваецца ў дзясяткі разоў. Таму прыгатаванае мяса і астатнія стравы лепш класці на керамічны, драўляны або металічны посуд.

Александрына ПАРШЫНА.

Падрабязней аб тым, які пластык з'яўляецца найбольш бясшкодным і якую тару неабходна выкарыстоўваць узамен, а таксама іншыя цікавыя экапарады чытайце ў часопісе «Родная прырода». Падпісацца на яго можна па індэксах 74926 (інд.) і 749262 (ведам.):

- ✓ **праз аддзяленні сувязі «Белпошта» і на сайце Belpost.by;**
- ✓ **праз сістэму Belpressa.by;**
- ✓ **праз аўтаматызаваную сістэму АРІП;**
- ✓ **у магазінах і павільёнах «Белдрук».**

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.30 Зона Х (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40 Навіны надвор'я.
11.00, 12.15 Меладрама «Знайшоўшага чакае ўзнагарода» (16+).
13.05, 15.25 Меладрама «Крайняя неабходнасць» (12+).

15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.30 Маршрут пабудаваны (12+).
19.20, 22.00 Серыял «След» (16+).
20.00 «100 пытанняў даросламу» (12+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
0.00 Арэна.
0.50 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.05, 21.05 Тэлебарометр.
10.35 «Сям'я. Перазагрузка» (16+).
11.05 Дэтэктыў «След лісіцы на камянях» (16+).
14.45 Смачна есці (12+).
15.35 «Барбоскіны на дачы» (6+).
16.50 «Дарагая, я забіў» (16+).
18.05 «Знакі лёсу» (16+).
18.35 Дэтэктыў «Свае» (16+).
20.10 Серыял «#Жабацька» (16+).
21.10 Спартлато 6 з 49, КЕНА.
21.15 Серыял «Пагналі» (16+).
22.15 Серыял «Моцныя арэшкі» (16+).
0.00 Дэтэктыў «Сышчыца-6» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
8.35, 9.40, 11.35, 15.40, 17.30, 19.05, 20.40, 21.40, 23.30, 0.45, 2.45, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 22.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Каралі эпізоду» (16+).
12.35 Маст. фільм «Монтэ-Карла» (16+).
14.20 «Ад смешнага да вялікага (16+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.20 Маст. фільм «Любоўнае гняздзечка» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.10 Маст. фільм «Быць ці не быць» (16+).

EuroSport 1

4.00, 8.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.25, 19.30, 20.45 Снукер (6+).
6.00, 9.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія». Мужчыны (16+).
7.00, 10.30, 0.05, 2.30 Веласпорт (6+).
1.00, 1.30 Маўнцінбайк (6+).

Кінакамедыя

1.30 «Кароль вечарынак» (16+).
3.50 «Коп на драйве» (12+).
5.25 «Стоп-кран» (12+).
7.15 «Уцёкі» (18+).
9.20 «Чаго хочуць жанчыны?» (16+)

11.45 «Былая з таго свету» (16+).
13.35 «Аліўе» (16+).
15.15 «Сардэчна запрашаем у сям'ю» (16+).
17.30 «Маё злачынства» (18+).
19.30 «Асілак Санта-Клаус» (12+).
21.20 «Пра што гавораць мужчыны. Працяг» (18+).
23.05 «Адной левай» (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.15 «Чалавек з чорнай «Волгі» (12+).
11.00 «Паглядзім» (12+).
11.30, 17.30 «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
13.10, 19.10, 3.15 «Сляпая» (16+).
14.35, 20.10, 1.55 «Варажбітка» (16+).
16.05, 0.10 «Усё ў тваіх руках» (16+).
21.15 «Храбрае сэрца» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.50 Прынцэса спецый (16+).
7.25 Лулу і Брыгс (16+).
9.25 Цуда-дзеткі: бесталковыя чараўнікі (12+).
11.15 Акадэмія вампіраў (16+).

13.15 Ноч у краме жахаў (12+).
14.50 Паляўнічыя на прывідаў (16+).
16.55 Паляўнічыя на прывідаў-2 (16+).
19.00, 20.50, 22.40 Зачараванае каралеўства (16+).

0.25 Лулу і Брыгс (16+).
2.10 Прынцэса спецый (16+).
3.40 Кухар на колах (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Пін-код (6+).
6.35 Тры каты (6+).
6.50 Смяшарыкі (6+).
7.25 Наша Расія. Яйкі Лёсу (16+).
9.05 Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
11.00 Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).
12.55 Самы лепшы дзень (16+).

15.05 Шчаслівы выпадак (16+).
17.00 Мой тата не падарунак (6+).

19.00 Дзяўчынка Ніна і выкрадальнікі піяніна (6+).
20.40 Мая жудасная сястра (6+).
22.10 Мая жудасная сястра-2 (6+).
23.55 Таты супраць мам (12+).
1.40 Дзень выбараў (16+).
3.40 Дзень выбараў-2 (12+).

ЯСНАе

5.15 Серыял «Крык савы» (16+).
7.00 Серыял «Снайпер: афіцэр СМЕРШ» (12+).
8.30 «Ясна аб міні-футболе».
9.00 Серыял «Крот» (16+).
10.45 Серыял «Без права на памылку» (16+).
12.35 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Вяртанне» (16+).
14.20 Серыял «Белая страла. Адплата» (16+).
16.00 Футбол. Першая Ліга. «ГАБЧ» — «Шахцёр-2».
18.00 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Мінск» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
19.55 «На самай справе».
20.05, 21.25 Серыял «Шэф. Гульня на павышэнне» (16+).
21.00 «Час высокіх тэхналогій».
22.20 Серыял «Мянтоўскія войны-3» (16+).
0.05 Дак. фільм «Савецкія мафіі. Яўрэйскі трыкатаж» (16+).
0.50 Маст. фільм «Геракл. Пачатак Легенды» (12+).
2.30 Маст. фільм «Каманда» (18+).
4.05 Маст. фільм «1812: уланская балада» (12+).

ЗВЯЗДА

6.00 «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
7.00, 19.30, 23.00 «Навіны».
7.20 «На вастрыі мяча». Маст. фільм (12+).
8.45 «Дзе ты быў, Адысей?» Маст. фільм (12+).
10.00, 19.50, 21.05 «Вайна. На заходнім напрамку». Маст. фільм (16+).
11.15, 12.00 «Калі растаў снег» (12+).
12.45, 13.35 «Балада аб Бомберы» (16+).
14.30 «Контрудар». Маст. фільм (12+).
15.50, 16.35 «Чырвоная капэла» (12+).
17.20 «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
17.50, 18.35 «Саракапятка» (16+).
19.20 «Полацкі ўмацаваны раён».
19.45, 23.15 «Навіны ў форме».
22.15 «Маршал Жукаў. Першая перамога». Дак. фільм (12+).
23.20 «Радзіма» або смерць. З Надзеяй — за Францыю». Дак. фільм (12+).
23.50 «Варшаўскі рубеж. Беларусы ў Войску Польскім». Дак. фільм (12+).
0.20 «Леон з Эльзаса. Беларускі партызан». Дак. фільм (12+).
0.50 «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
1.20 «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
1.50 «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).
2.20 «Дзяржынскі супраць Пілсудскага». Дак. фільм (12+).
3.15 «Палескі кацёл. Армія асуджаных». Дак. фільм (12+).
3.45 «Бітва за Кобрын. Заложнікі сакрэтнага пакта». Дак. фільм (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
10.00, 11.45, 12.15, 13.05 Меладрама «Заўтра будзе новы дзень» (16+).
10.50, 0.35 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25, 23.10 Серыял «След» (16+).
17.05 Сэнс жыцця (12+).
17.30 Маршрут пабудаваны (12+).
18.15 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
18.40, 19.20 Меладрама «Безабароннае сэрца» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
0.20 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05 «Знакі лёсу» (16+).
10.35 Дэтэктыў «Свае» (16+).
12.15 «Новы дзень» (12+).
12.45 Серыял «Моцныя арэшкі» (16+).
14.25 «Карысная праграма» (16+).
14.35 «Дарагая, я забіў» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
17.00 Гэта мая сям'я (12+).
18.05 «Стаць шэфам» (16+).
19.45 «Уральскія пельмені» (16+).
21.10 Спартлато 5 з 36, КЕНА.
21.15 Фільм «Тайна амулета» (12+).
22.55 Меладрама «Халупа» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня».
8.00, 12.50, 20.30, 23.35 «Навіны культуры».
8.10, 21.05 «Начныя ластаўкі». Маст. фільм (12+).
9.55, 16.35 «Непадатлівыя». Маст. фільм (12+).
11.15 «Люблю і памятаю».
11.55 «Жывая спадчына».
13.00, 17.55 «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
13.50 «Экіпаж». Маст. фільм (12+).
16.10 «Сіла веры».
18.45 «Сталінград». Маст. фільм (12+).
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 «Маналог на кухні, або Вячэрні чай». Дак. фільм.
23.15 «Пяць кіламетраў зямнога шара». Дак. фільм.
23.50 «Асобы».

Беларусь 5

6.55 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
8.55 Хакей для ўсіх.
9.25 Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. «Барысфен» (Магілёў) — БК «Гродна-93».
11.10 Футбол. Кубак Расіі. ЦСКА (Масква) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
13.05 Змешаныя адзінаборствы.
14.00 Футбол. Кубак Расіі. ФК «Растоў» — «Балтыка» (Калінінград).
15.55 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Віктарыя» (Смалявічы) — ХК «Мінск».
17.25 Хакей. Міжнародны турнір. Казахстан — Беларусь. У перапынках — Спорт-цэнтр.
19.50 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Іслач» (Мінскі р-н). У перапынку —Спорт-цэнтр.
21.50 Авертайм.
22.20 Бокс.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.05 «Смех з дастаўкай дадому» (12+).
13.15 Маст. фільм «Вызваленне» (12+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.30 «Трывожная кнопка» (16+).
18.20 «Народны ДАСТ» (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» (12+)
19.00 «Поле цудаў» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.20 «Лаўроў. За гранню» (16+).
21.30 «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі (16+).
23.15 Маст. фільм «Па законах ваеннага часу. Вораг за спінай» (12+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 Дак. праект «Назад у СССР» (16+).
10.40 Дак. праект (16+).
13.50, 0.50 «Марлен». Серыял (16+).
16.50 «Рашэнне ёсць! Дэпутацкі адказ».
17.20 Дак. праект (16+).
18.45 «У пошуках ісціны. Глядзіце ў абодва!»
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Ствараем разам».
20.55 «Шэф. Новае жыццё». Серыял (16+).
23.20 «Азаронак. Напрамую».

МІР

5.00, 4.45 Мультфільмы (6+).
6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны.
6.15 «Нашы замежнікі» (12+).
6.25, 4.20 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
6.50 Маст. фільм «Казка аб страчаным часе».
8.30 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены» (16+).
10.10 Маст. фільм «Пакроўскія вароты» (16+).
13.15 «Міравое пагадненне» (16+).
14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
17.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
18.50 «Мільён за 5 хвілін» (16+).
19.35 Тэлесерыял «Госця з будучыні».
2.05 Маст. фільм «Ганна Карэніна» (16+).

РТР—Беларусь

6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.05, 9.05 «Новая раніца».
10.05 Тэлесерыял «Тайны следства» (12+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Вести.
11.40 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.50 «Кропкі над «і» (16+).
14.40 Тэлесерыял «Нявеста камдыва» (12+).
16.40 Гумарыстычная праграма.
17.40 Тэлесерыял «Версія» (16+).
18.35 «Песні ад усёй душы» (12+).
21.30, 23.15 Фільм «Новы муж» (12+).
1.15 Камедыя «Майскі дождж» (12+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.10, 8.20, 13.20, 22.25, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.20 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.25 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35 «НЗ.by».
8.55 Сфера інтарэсаў.
9.10, 10.35 Меладрама «Давай пажэнімся» (12+).
11.10 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
13.25 «НЗ. Расследаванне» (16+).
14.00 «ДНК» (16+).
15.00 «Чакай мяне» (12+).
16.40, 20.00 Галоўнае. Сёння. Беларусь.
16.50 Серыял «Пёс» (16+).
19.40, 20.15, 21.30, 22.30, 23.45 Дэтэктыў «Ямеля» (16+).
21.00 «НЗ.by: час вынікаў».

8 канал

7.00, 21.05 «Надвор'е».
7.05 Мультпарад.
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Уэнсдэй» (16+).
8.25 Меладрама «Красуня» (16+).
10.25 Серыял «Лейтэнант Каломба» (16+).
11.40 «Любімае кіно».
14.05 Серыял «Дальнабой» (16+).
15.40 Драма «Смута» (16+).
17.25, 19.05 «Надвор'е» + «Эрана».
17.30 «Востраюжэтны баявік».
19.10 «Сакрэтны дадатак» (18+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.10 «Урокі Лазуркіна».
21.15 Драма «Знаёмцеся, Джо Блэк» (16+).
0.15 «Начны серыял».

Культура

6.30 Мультфільмы.
7.30 «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
9.05 «Пакроўскія вароты». Аўтарскі фільм.
9.45 «Пакроўскія вароты». Маст. фільм.
11.55 Гістарычныя курорты Расіі.
12.25 «Біблія ў жывапісе. Мазаікі Равены». Фільм мітрапаліта Іларыёна (Алфеева).
13.15, 0.55 Краіна птушак.
14.00 Віктар Захарчанка і Дзяржаўны акадэмічны Кубанскі казацкі хор.
15.15 «Люцікі-кветачкі «Жаніцьбы Бальзаміна». Аўтарскі фільм.
15.55 «Жаніцьба Бальзаміна». Маст. фільм.
17.20 «Бывай, XX стагоддзе! Невясёлы салдат Віктар Астаф'еў». Аўтарская праграма.
18.00 «Зоркапад». Маст. фільм.
19.30 Навіны культуры.
19.45 «Свет Аляксандры Пахмутавай». Дак. фільм.
20.30 «У песні — жыццё маё».
22.35 «Дачнікі на Балі, або «Аса» праз 30 гадоў». Спектакль (18+).
1.35 Шукальнікі.
2.20 Мультфільмы для дарослых.

Настальгія

6.00 «Рок-н-рол ТБ» (16+).
6.35 Маст. фільм «Жыць» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.40, 11.30, 12.45, 14.45, 15.40, 17.30, 20.35, 21.40, 23.35, 0.35, 2.45, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 22.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Быў час» (16+).
13.10 Маст. фільм «Быць ці не быць» (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» (16+)
19.15 Маст. фільм «Тры мілыя дзяўчыны» (16+).
0.00 «Каралі эпізоду» (16+).
0.50 Маст. фільм «Шаўковыя панчохі» (16+).

EuroSport 1

4.00, 8.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.25, 19.30, 20.45 Снукер (6+).
6.00 Формула Е (16+).
7.00, 10.00, 2.30 Веласпорт. «Вуэльта». Жанчыны (16+).
9.30 Веласпорт. Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
0.00 Каратэ (6+).
1.00 Лёгкая атлетыка (6+).

Кінакамедыя

1.30 «Коп на драйве» (12+).
3.35 «Уцёкі» (18+).
5.40 «Прытварыся маім мужам» (16+).
7.30 «Адной левай» (12+).

9.05 «Канікулы строгага рэжыму» (12+).
11.15 «Былая з таго свету» (16+).
13.05 «Кароль вечарынак» (16+).
14.50 «Чаго хочуць жанчыны?» (16+)
17.15 «Непаслушнік» (12+).
19.30 «Непаслушнік-2» (12+).
21.35 «Пра што гавораць мужчыны» (18+).
23.25 «Сястрычка Бэці» (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.35 «Містычныя гісторыі» (16+).
10.30, 16.15 «Чытальнік» (16+).
11.30 «Глядзі сам» (16+).
11.50, 17.15 «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
13.30, 18.55, 3.15 «Сляпая» (16+).
14.50, 20.15, 3.40 «Варажбітка» (16+).
21.40 «Арлінская» (16+).
23.20 «Сакалова падазрае ўсіх» (16+).
0.15 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.10 «Гаспадар мараў» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТВ1000 ТБ1000

6.00 Том, які гаворыць, і сябры (6+).
6.25 Шэф (16+).
8.00 Кухар на колах (16+).
10.20 Іншыя (16+).

12.25 Перш чым я засну (16+).
14.20 Прыстанак праклятых (16+).
16.35, 4.35 Мумія (16+).
19.00 Мумія вяртаецца (16+).
21.30 Мумія: грабніца Імператара Драконаў (16+).
23.35 Цар Скарпіёнаў (16+).
1.15 Акадэмія вампіраў (16+).
2.55 Гонар і прадузятасць і зомбі (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Брэменскія музыканты (6+).
5.50 Па слядах брэменскіх музыкантаў (6+).
6.10 Кракадзіл Гена (6+).
6.30 Чабурашка (6+).
6.50 Чабурашка ідзе ў школу (6+).
7.00 Шапакляк (6+).
7.20 Малыш і Карлсан (6+).
7.45 Карлсан вярнуўся (6+).
8.10 Асцярожна, малпачкі! (6+)
8.20 Малпачкі і рабаўнікі (6+).
8.30 Як малпачкі абедалі (6+).
8.40 Малпачкі, наперад! (6+)
8.50 Малпачкі ў оперы (6+).
9.00 Таты супраць мам (12+).

10.45 Мой тата — Правадыр (12+).
12.40 Садко (6+).
14.10 Тры волаты. Спадчынніца прастола (6+).
15.50 Конь Юлій і вялікія скачкі (6+).
17.15 Тры волаты і Конь на троне (6+).
19.00 Пра што гавораць мужчыны (16+).
20.55 Пра што яшчэ гавораць мужчыны (16+).
22.50 Пра што гавораць мужчыны. Працяг (16+).
0.45 Мой тата не падарунак (6+).
2.25 Гудбай, Амерыка (12+).
4.00 Карлік Нос (12+).
5.20 Чучала-мявучала (6+).

ЯСНАе

4.45 Мультфільм «Іван Царэвіч і Шэры Воўк» (12+).
6.10 Маст. фільм «Бухта смерці» (16+).
8.00 «Раніца ЯСНАя».
9.05, 10.45, 12.25, 14.19 Серыял «Спадары афіцэры» (16+).
16.00 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Тур 7. «Смаргонь» — «Днепр-Магілёў». Прамая трансляцыя.
18.00 Маст. фільм «Кур'ер на ўсход» (16+).
19.35 Маст. фільм «Прарыў» (12+).
21.00 «Чалавек і здароўе».
21.20 Маст. фільм «Круты» (16+).
22.50 Маст. фільм «Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі» (16+).
0.30 Серыял «У чэрвені 41-га» (12+).
2.15 Маст. фільм «Братухна» (12+).
3.35 Серыял «Полымя пад попелам» (12+).

Звязда

6.00 «Хатынь. Засакрэчаная трагедыя». Дак. фільм (12+).
6.30 «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя». Дак. фільм (12+).
7.00, 19.30, 23.00 «Навіны».
7.20 «Рубікон».
7.30 «Дзяржынскі супраць Пілсудскага». Дак. фільм (12+).
8.25, 14.00 «Дзе ты быў, Адысей?» Маст. фільм (12+).
9.35, 21.35 «Вайна. На заходнім напрамку». Маст. фільм (16+).
10.45, 11.30, 17.50, 18.35 «Калі растаў снег» (12+).
12.15, 13.05, 19.50, 20.40 «Балада аб Бомберы» (16+).
15.20, 16.05 «Чырвоная капэла» (12+).
16.50, 0.45 «Дзеці Камінтэрна. Выратаваныя ў Беларусі». Дак. фільм (12+).
17.20, 2.15 «Ваеннапалонныя. Вінаватыя, калі выжылі». Дак. фільм (12+).
19.20 «Полацкі ўмацаваны раён».
19.45, 23.15 «Навіны ў форме».
23.20 «Партызанскі рубеж». Дак. фільм (12+).
0.15 «Джульбарс і Дзіна. Сабакі службы «Д». Дак. фільм (12+).
1.15 «Друкарскі фронт. Газеты стралялі ва ўпор». Дак. фільм (12+).
1.45 «Ілья Мурамец». Перарваны палёт». Дак. фільм (12+).
2.45 «Фаня Алер. Вайна без антракту». Дак. фільм (12+).
3.40 «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 2 мая ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.35 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
10.00, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «Ні да сяла, ні да горада...-2» (16+).
10.55 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25 Меладрама «Іванава шчасце. Новыя гісторыі» (16+).
17.05 Беларуская часінка.
18.30, 19.20 Меладрама «Безабароннае сэрца» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Беларуская супержанчына.
21.55 Адзін дзень (12+).
22.20 Серыял «След» (16+).
0.20 Сфера інтарэсаў.
0.55 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05 «Дзяўчынка Ніна і выкрадальнікі піяніна» (6+).
11.30 «Сям'я. Перазагрузка». (16+).
12.00 «На нажах» (16+).
13.10 Баявік «Полымя» (12+).
15.20 «Разумны дом» (12+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
17.00 «100 месцаў, дзе паесці» (16+).
18.05 «Знакі лёсу» (16+).
18.35 Дэтэктыў «Свае» (16+).
20.05 Серыял «#Яжбацька» (16+).
21.10 Спартлато 6 з 49, КЕНА.
21.15 Серыял «Пагналі» (16+).
22.10 Серыял «Моцныя арэшкі» (16+).
0.00 Дэтэктыў «Сышчыца-6» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.40 «Беларуская кухня».
8.00, 13.05, 20.30, 23.35 «Навіны культуры».
8.10, 21.05 «СМЕРШ. Памяць загаду не было». Маст. фільм (16+).
9.50 «Люблю і памятаю».
10.30 Вялікі чацвер. Прамая трансляцыя Боскай літургіі ў Свята-Духавым кафедральным саборы г. Мінска.
13.20, 18.05 «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
14.10 «Зялёны фургон». Маст. фільм (12+).
16.35 «Наперад у мінулае».
17.00, 23.45 «Асобы».
17.10 «Кадры жыцця».
18.55 «Сталінград». Маст. фільм (12+).
20.40 «Калыханка» (0+).
22.45 «Жывая нітка». Дак. фільм.

Беларусь 5

6.55 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «СКА-Мінск» — «Мяшкоў» (Брэст).
8.25 Слэм-данк.
8.55 Футбол. Кубак Расіі. «Дынама» (Масква) — «Спартак» (Масква).
10.50 Між іншым.
11.10 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) — «Нафтан» (Наваполацк).
13.05 Змешаныя адзінаборствы.
16.30 Танцавальны спорт.
18.20 Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. «Барысфен» (Магілёў) — БК «Гродна-93». У перапынку — Спорт-цэнтр.
20.20 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск). У перапынку — Спорт-цэнтр.
22.20 Хакей для ўсіх.
22.50 Футбол. Кубак Расіі. ФК «Растоў» — «Балтыка» (Калінінград).

АНТ

6.00, 7.15, 8.15, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.05 «Смех з дастаўкай дадому» (12+).
13.15 Маст. фільм «Вызваленне» (12+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.00 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
20.00, 1.15 Час.
21.20 Маст. фільм «Па законах ваеннага часу. Вораг за спінай» (12+).
23.25 Маст. фільм «Старая гвардыя. Развітальная вечарынка» (12+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 Дак. фільм. Кісларод (16+).
10.40 Дак. праект «Без падману» (16+).
13.50, 0.50 «Марлен». Серыял (16+).
16.50 «Пяць хвілін цішыні. Новыя гарызонты». Серыял (16+).
19.00 «Са знакам якасці. Мацярынства».
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.40 «Беларуская супержанчына».
20.50 «Шэф. Новае жыццё». Серыял (16+).
23.20 «Азаронак. Напрамую».

МІР

5.00, 6.25, 3.05 Мультфільмы (6+).
6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны.
6.15 «Еўразія. Рэгіёны» (12+).
9.00, 10.10 Маст. фільм «Ты — мне, я — табе» (16+).
11.00 Маст. фільм «На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, на Брайтан-Біч зноў ідуць дажджы» (16+).
13.15 «Міравое пагадненне» (16+).
14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
17.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
18.50 «Гульня ў кіно» (16+).
22.30 Маст. фільм «Дэжа Вю» (16+).
0.45 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
1.40 Маст. фільм «Вострай скарбаў».

РТР—Беларусь

6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.05, 9.05 «Новая раніца».
10.05 Тэлесерыял «Тайны следства» (12+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Вести.
11.40 «Так! Але...»
12.20 «Пра самае галоўнае» (12+).
13.00 «Кропкі над «і» (16+).
14.40 Тэлесерыял «Нявеста камдыва» (12+).
16.40 Гумарыстычная праграма.
17.40 Тэлесерыял «Версія» (16+).
18.35 «Песні ад усёй душы» (12+).
21.30, 23.15 Тэлесерыял «Каханне пераадолее ўсё» (16+).
0.50 Тэлесерыял «Доктар Ганна» (12+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.10 «Маршрут пабудаваны» (12+).
7.40 Спецыяльны рэпартаж АТН (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.25 «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
8.40, 10.35 Серыял «Легенда для опершы» (16+).
13.20, 22.15, 23.20 Сёння. Галоўнае.
13.25 «НЗ. Расследаванне» (16+).
14.00 «За гранню» (16+).
15.00 «ДНК» (16+).
16.40, 20.00 Галоўнае. Сёння. Беларусь.
16.50 Серыял «Пёс» (16+).
19.40, 20.15, 21.20, 22.20 Дэтэктыў «Ямеля» (16+).
21.00 «НЗ.by».
23.35 «Леанід Канеўскі. Народны артыст» (16+).

8 канал

7.00, 21.15 «Надвор'е».
7.05 Мультпарад.
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Уэнсдэй» (16+).
8.25 «Любімае кіно». (12+).
10.25 Серыял «Лейтэнант Каломба» (16+).
11.50 Фантастыка «Лара Крофт. Калыска жыцця» (12+).
13.50 Серыял «Дальнабой» (16+).
15.35 Драма «Смута» (16+).
17.20, 18.55 «Надвор'е» + «Эрана».
17.25 «Вострасюжэтны баявік».
19.00 «Сакрэтны дадатак» (18+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Асалам алейкум, Беларусь!»
21.10 «Урокі Лазуркіна».
21.20 Драма «Дзённік памяці» (16+).
23.20 Дэтэктыў «Здані Венецыі» (16+).
1.05 «Начны серыял».

Культура

6.30 «Пешшу...»
7.00 Легенды сусветнага кіно.
7.30 «Новыя людзі Пераслаўля і навакольля». Дак. фільм.
8.20 «Дачнікі». Маст. фільм.
10.00, 12.30, 17.00, 19.30, 0.10 Навіны культуры.
10.15 «Цётка Маруся». Маст. фільм.
12.45 «Абсалютны слых».
13.25, 0.25 «У мертвай пятлі». Маст. фільм.
14.50, 2.45 «Забытае рамяство». Дак. серыял.
15.05 «Вясёлы чалавек з невясёлым лёсам. Іван Любезнаў». Дак. фільм.
15.45 «Зняты час». Дак. серыял.
16.15 «2 Вернік 2».
17.15 Пернікавы домік.
17.45, 1.45 VI Велікапосны харавы фестываль.
18.45 «Сямейная камедыя. Георгій Гачаў і Святлана Сямёнава».
19.45 Адкрытая кніга.
20.15 «Добрай ночы, малыя!»
20.30 «Папялушка». Добрыя людзі, дзе ж вы?» Аўтарскі фільм.
21.10 «Энігма». Уладзіслаў Сулімскі.
21.55 «Жаніцьба Бальзамінава». Маст. фільм.
23.20 «Уладзімір Фортаў. Дакрануцца да сонца». Дак. фільм.

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
6.45, 8.45, 9.40, 11.30, 14.35, 15.40, 17.35, 21.40, 23.30, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
7.10 Маст. фільм «Быць ці не быць» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 22.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Спяем, сябры!» (16+)
13.15 Маст. фільм «Тры мілыя дзяўчыны» (16+).
18.00 «Каралі эпізоду» (16+).
18.35 Маст. фільм «Монтэ-Карла» (16+).
20.20 «Ад смешнага да вялікага (16+).
0.00 «Рок-н-рол ТБ» (16+).
0.35 Маст. фільм «Жыць» (16+).

EuroSport 1

4.00, 8.00, 14.00, 14.45, 20.00, 20.45 Снукер (6+).
6.00 Спідвей (16+).
7.00, 13.00, 0.00, 2.30 Веласпорт. «Вуэльта». Жанчыны (16+).
9.30 Алімпійскія гульні (6+).
11.30 Сёрфінг (6+).
12.30, 18.00, 19.00, 1.00, 1.30 Маўнцінбайк. Мужчыны ELITE (16+).

Кінакамедыя

1.30 «Іх уласная ліга» (16+).
4.20 «Жаніх напракат» (16+).
6.25 «Ну, добры дзень, Аксана Сакалова!» (16+)
8.15 «Васабі» (16+).

10.00 «Аліўе» (16+).
11.40 «Больш, чым сябар» (16+).
13.35 «Эвалюцыя» (12+).
15.25 «Мільярд» (12+).
17.20 «Настаўнік года» (16+).
19.30 «Сардэчна запрашаем у сям'ю» (16+).
21.45 «Пра што яшчэ гавораць мужчыны» (16+).
23.35 «Starперцы» (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
10.00, 16.35 «Містычныя гісторыі» (16+).
11.35 «Паглядзім» (12+).
12.05, 17.30 «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
13.50, 19.15, 3.15 «Сляпая» (16+).
15.10, 20.35, 4.05 «Варажбітка» (16+).
22.05 «Арлінская» (16+).
23.45 «Сакалова падазрае ўсіх» (16+).
0.40 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.35 «Раён № 9» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

6.40 Мумія вяртаецца (16+).
9.00 Мумія: грабніца Імператара Драконаў (16+).
11.05 Цар Скарпіёнаў (16+).

12.55 Гонар і прадузятасць і зомбі (16+).
15.05 Акадэмія вампіраў (16+).
17.05 Цуда-дзеткі: бесталковыя чараўнікі (12+).
19.00 Паляўнічыя на прывідаў (16+).
21.05 Паляўнічыя на прывідаў-2 (16+).
23.15 Ноч у краме жахаў (12+).

0.50 Раство ката Боба (12+).
2.20 Дзевяць жыццяў (6+).
3.40 Хаціка: самы верны сябар (6+).
5.10 Том, які гаворыць, і сябры (6+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Пін-код (6+).
6.50 Тры каты (6+).
7.20 Смяшарыкі (6+).
8.00 Пра што гавораць мужчыны (16+).
9.55 Пра што яшчэ гавораць мужчыны (16+).
11.50 Пра што гавораць мужчыны. Працяг (16+).
13.40 Мая жудасная сястра (6+).
15.10 Мая жудасная сястра-2 (6+).
17.00 Гудбай, Амерыка (12+).

19.00 Наша Расія. Яйкі Лёсу (16+).
20.35 Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
22.30 Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).

0.25 Самы лепшы дзень (16+).
2.15 Шчаслівы выпадак (16+).
3.45 Дзень радыё (16+).

ЯСНАе

5.10 Серыял «Крык савы» (16+).
7.00 Серыял «Снайпер: афіцэр СМЕРШ» (12+).
8.35 «Ясна аб футболе».
9.10 Серыял «Крот» (16+).
11.00 Серыял «Без права на памылку» (16+).
12.50 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Вяртанне» (16+).
14.35 Серыял «Белая страла. Адплата» (16+).
16.15 Серыял «Апошні дзень вайны» (16+).
18.15 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Віцебск».
20.10, 21.50 Серыял «Шэф. Гульня на павышэнне» (16+).
21.00 «У адкрытым доступе».
21.30 «PROфутбол».
22.45 Серыял «Мянтоўскія войны-3» (16+).
0.30 Серыял «У чэрвені 41-га» (12+).
2.15 Маст. фільм «Радзіма ці смерць» (12+).
3.45 Маст. фільм «Паміж жыццём і смерцю» (12+).

ЗВЯЗДА

6.00 «Партызанскі рубеж». Дак. фільм (12+).
7.00, 19.30, 23.00 «Навіны».
7.20, 19.20 «Полацкі ўмацаваны раён».
7.30, 13.25 «Дзе ты быў, Адысей?» Маст. фільм (12+).
8.50, 21.35 «Вайна. На заходнім напрамку». Маст. фільм (16+).
10.10, 10.55, 17.50, 18.35 «Калі растаў снег» (12+).
11.40, 12.30, 19.50, 20.40 «Балада аб Бомберы» (16+).
14.40, 15.25 «Чырвоная капэла» (12+).
16.10 «На вастрыі мяча». Маст. фільм (12+).
17.35 «Паміж мірам і вайной. Цягнік Памяці». Дак. фільм (12+).
19.45, 23.15 «Навіны ў форме».
23.20 «Георгій Жукаў. Ад рэкорду да парада». Дак. фільм (12+).
23.50 «Аперацыя «Суворай». Кошт вызвалення». Дак. фільм (12+).
0.20 «Кітай. Засакрэчаная вайна». Дак. фільм (12+).
1.15 «Крылы Саветаў. Агонь у адказ». Дак. фільм (12+).
1.45 «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
2.40 «Леон з Эльзаса. Беларускі партызан». Дак. фільм (12+).
3.10 «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
3.40 «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Спажывец

РЫБЫ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Арганізаваная рыбалка спрыяе развіццю турызму

Па даных Мінсельгасхарча, у нашай краіне спажыванне рыбы складае 14-15 кілаграмаў на душу насельніцтва. Пры гэтым айчыннай прэснаводнай рыбы сярэднестатыстычны беларус з'ядае крыху больш чым два кілаграмы. Гэта значыць, што краіна здольная поўнасцю забяспечваць сябе прэснаводнай рыбай, заявіла намеснік начальніка ўпраўлення прамысловай жывёлагадоўлі і рыбагаспадарчай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Вольга БАРЭЙША.

ФАРЭЛЬ І КРЭВЕТКА

Паводле яе слоў, летась у краіну завезлі 185 тысяч тон рыбы і морапрадуктаў. Гэта крыху больш (на 10 тысяч тон), чым годам раней. Беларусь — не марская дзяржава, таму марскую рыбу мы імпартуем з Расіі. Наша краіна паляпшае ўзаемадзеянне з самымі далёкімі яе рэгіёнамі, напрыклад праводзяцца перагаворы з Камчаткай.

«Беларусь па-ранейшаму імпартуе морапрадукты, хоць цяпер мы працуем над законам аб аквакультуры. Магчыма, праз пару гадоў вы зможаце купіць праслаўтую беларускую крэветку», — адзначыла Вольга Барэйша.

Прадстаўнік аграрнага ведамства дадала, што ёсць і звяротны працэс. Прадукцыя айчынных рыбгасаў адгружаецца за мяжу, няхай і ў невялікіх аб'ёмах — па 1000—2000 тон. Тут можна адзначыць тры арганізацыі: фарэлевая гаспадарка з Быхаўскага раёна, вядомыя рыбгасы з Брэсцкай і Мінскай абласцей (гэта рэсурсы фарэлевай гаспадаркі «Лохва», вопытнага рыбгаса «Сялец» Бярозаўскага раёна, рыбгаса «Волма» Чэрвеньскага раёна).

«Напрыклад, прадпрыемства «Лохва» — асноўны вытворца стронгі ў Беларусі. У яго ёсць рыбагадавальнік па вытворчасці маляўкі, і гаспадарка экспартуе яе ў рэгіёны Расійскай Федэрацыі. У Расіі ў асноўным развіты промысел дзікай рыбы. Напрыклад, летась там здабылі рэкордныя 5,3 мільёна тон рыбных рэсурсаў з мораў. Пры гэтым у краіне доўгі час не надавалі ўвагі штучнаму вырошчванню рыбы. У нашых суседзяў не так шмат рыбагадавальнікаў, і многія рэгіёны маюць патрэбу ў іх прадукцыі. Таму маляўкі стронгі мы экспартавалі нават у Карэлію, дзе гэтая рыба водзіцца ў рэках. А ў вытворцы з Бярозаўскага раёна шмат хто хоча купіць маляўкі расліннаедных відаў рыбы», — удакладніла Вольга Барэйша.

ПРАДУКТ БЕЗ ЗАМАРОЗКІ

Летась у вадаёмах краіны вылавілі 15,1 тысячы тон рыбы, з іх на прамысловы ўлоў прыйшлося 56,4 %.

А 16 дзяржаўных рыбгасаў летась вырабілі 10 580 тон рыбы, дзе прыбаўка да аб'ёмаў леташняга года склала 10 %. У гэтым сезоне перад імі стаіць больш сур'ёзная задача — нарасціць вытворчасць на 21 %, лічыць **намеснік генеральнага дырэктара «Белводгаса» Дзяніс ЗАЯЦ**.

Сёлета зарыбленне вадаёмаў практычна завершана. Раней у рыбгасах ужо прыступілі да кармлення, але прыпыніла яго дрэннае надвор'е. Спецыялісты чакаюць цяпла і спадзяюцца, што змогуць аднавіць працэс у пачатку мая. Для добрага «ўраджаю» рыбы 2024 года прадпрыемствам спатрэбіцца 30 тысяч тон камбікармоў.

У вадаёмах рыбгасаў самая папулярная рыба — карп, яна ж самая даступная, бюджэтная прадукцыя для насельніцтва. У крамах яна прадаецца менш чым за 10 рублёў. Шмат на гэтай рыбе не заробіш, але падымаць цэны вытворцы не збіраюцца.

«Рэнтабельнасць рэалізацыі рыбы ў нас мінімальная: не больш за 5-6 % у асобных арганізацыях і да 3 % у сярэднім па галіне, — удакладняе прадстаўнік «Белводгаса». — Гэта тлумачыцца не толькі канкурэнцыяй з таварамі іншых груп (свінінай, ялавічынай, курыцай). 2023 год стаў рэкордным па здабычы рыбных рэсурсаў у Расіі, і мы бачым, што суседзі арыентуюцца не толькі на ўнутраны рынак, але і на нас. Кошт асобных пазіцый, у тым ліку чырвонай рыбы, быў імі зніжаны. Таму павышэнне цэн не прывядзе ні да чаго добрага — толькі да памяншэння аб'ёмаў вытворчасці».

Хоць наш карп — свежая рыба, якая не падвяргаецца замарозцы, яна валодае сваімі смакавымі якасцямі і карыснымі ўласцівасцямі. А плячо дастаўкі, асабліва з далёкіх рэгіёнаў заходняй суседкі, не можа не аказваць уплыву на густ і якасць прадукцыі. Таму ў нас на рынку застаюцца спажыўцы, якія аддаюць перавагу менавіта жывой рыбе.

Дарэчы, амаль 70 % улову рыбы ў штучных вадаёмах займае карп. За 2023 год яго вылаўлена звыш 5,5 тысячы тон. З іншых відаў рыбы — 552,8 тоны прамысловага ўлову ў штучных вадаёмах прыходзілася на таўсталобікаў, 402,5 тоны — на ласосевых, 314,3 тоны — на амура, 37,8 тоны — на асятровых і 23,4 тоны — на сомавых.

За мінулы год арганізацыі, якія ажыццяўляюць рыбагаспадарчую дзейнасць, рэалізавалі 7,2 тысячы тон рыбы. Работнікам і насельніцтву рэалізавана 3 тысячы тон рыбы (41,5 % ад агульнага аб'ёму продажу), арганізацыям, якія ажыццяўляюць гандаль, — 2 тысячы тон (28,3 %), а астатнія 1,6 тысячы тон (22,2 %) былі накіраваны на перапрацоўку.

ЧОРНАЯ ІКРА ЎЛАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Нягледзячы на значны патэнцыял, чакаць, што Беларусь стане «фарэлевай» краінай, усё ж такі не даводзіцца. Вытворчасцю рыбы прэміум-класа ў краіне займаюцца сем індустрыяльных комплексаў, а аб'ёмы трымаюцца на ўзроўні 600—800 тон. З іх каля 80 % прыпадае на фарэль. Асятровыя валодаюць экспартным патэнцыялам, але попыт на мяса асятра не такі вялікі, як хацелася б, дадаюць прадстаўнікі Мінсельгасхарча.

«Фарэль і асятровыя лічацца прэміяльнай прадукцыяй, паколькі іх вырошчванне патрабуе вялікіх выдаткаў, адпаведна, сабекошт і кошт рэалізацыі вышэй. Але пры гэтым сегмент пакупніцкага рынку, які можа дазволіць сабе такую прадукцыю, аб'ектыўна менш.

Таму ў нас аб'ёмы вытворчасці рыбы вызначаюцца магчымасцямі яе рэалізацыі. Можна вырасціць і больш, але ўнутраны рынак яе не возьме, а на знешніх рынках досыць высокая канкурэнцыя. Па гэтай прычыне вытворцы асятровых рыб ідуць не па мясным кірунку (асятрына — гэта прадукт абмежаванага попыту і тэрытарыяльна прывязаны), а хутчэй нацэлены на атрыманне чорнай ікры. Вядомыя беларускія кампаніі, якія гандлююць рыбай, яе рэалізуюць, няхай і ў невялікіх аб'ёмах — тонупаўтары ў год. Пры гэтым унутраныя патрэбы ў чорнай ікры вылічаюцца нават не тонамі, а ўсяго толькі дзясяткамі або сотнямі кілаграмаў, — растлумачыў **намеснік дырэктара Інстытута рыбнай гаспадаркі Уладзімір КАСТАУСАЎ**.

СЕЗОН АДКРЫТЫ

Вольга Барэйша адзначыла, што сфера паслуг, звязаных з рыбалоўствам, стала развівацца ў 2005 годзе, калі быў прыняты Указ № 580 аб правілах вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, якім прадугледжана арганізацыя платнага аматарскага рыбалоўства — комплекс мерапрыемстваў, у тым ліку звязаных з рэалізацыяй пуцёвак.

«Гэтая тэма дасягнула свайго піку ў 2015 годзе, калі мы на заканадаўчым узроўні ўвялі тэрмін «Рыбаводства ў рэкрэацыйных мэтах». На сажалках і ў абводненых кар'ерах стала магчымым афіцыйна аказваць паслугі па лоўлі рыбы аматарскімі прыладамі рыбалоўства. Адрозненне заключалася ў тым, што ў арэнду падаваліся штучныя водныя аб'екты, дзе ў 90 % выпадкаў рыба не вырошчвалася, а працаваў прынцып «запуск-вылаў» на выхадныя. Аказанне паслуг арандатарам магчыма толькі пасля падпісання акта аб стварэнні спрыяльных умоў», — расказала Вольга Барэйша.

У 2022 годзе ўведзена норма, што акт аб стварэнні спрыяльных умоў павінен пацвярджацца раз на тры гады. Такіх вадаёмаў, на якіх арганізоўваецца фактычна платная рыбалка, цяпер у краіне больш як пяцьсот, і гэты кірунак будзе развівацца і далей. «Яно спрыяе развіццю ўнутранага турызму, і мы стараемся выслухоўваць грамадзян, а таксама рэгуляваць усе пытанні на ўзроўні заканадаўства», — падкрэсліла спецыяліст.

Дарэчы, беларускія рыбгасы ўжо адкрылі рыбалоўны сезон. Паслугі платнай рыбалкі прапануюць аматарам 11 з 16 рыбаводных арганізацый. Як правіла, сезон платнай рыбалкі ў нас у краіне доўжыцца паўгода — з 1 красавіка да 1 кастрычніка. Гэта добрая дапамога для рыбгасаў: асобныя арганізацыі цалкам закрываюць фонд заработнай платы з выручаных такім чынам сродкаў. «Летась усе прадпрыемствы ўклалі ў скарбонку амаль 1 мільён рублёў. Гэта, вядома, крыху менш за 5 % ад усёй атрыманай выручкі. Аднак пералік паслуг трэба пашыраць. Попыт ёсць — значыць, павінна быць і прапанова, — паведаміў прадстаўнік «Белводгаса» Дзяніс Заяц.

Ён удакладніў, што асобныя прадпрыемствы прапануюць паслугі не толькі рыбнай лоўлі, але і вольнага часу для сем'яў рыбакоў, арэнду мангала і альтанкі. У некаторых рыбгасах можна зняць жыллё з усімі выгодамі альбо застацца з палаткай на начную рыбалку.

«Паслугі нашых рыбгасаў недарагія. Кошт аднаго квітка часцей за ўсё ад 30 да 50 рублёў, ён уключае магчымасць вылаву да пяці кілаграмаў рыбы. Калі рыбак жадае забраць большы ўлоў, то і 10, і 20 кілаграмаў можна выкупіць за асобную плату — прэйскурант устаноўлены ў кожным рыбгасе. Сезон платнай рыбалкі ўжо адкрыўся. Мы зрабілі зарыбленне, па меры неабходнасці будзем яго паўтараць — з уловам з'едзе кожны, — запэўніў Дзяніс Заяц.

Сяргей КУРКАЧ.

Неасабісты суб'ектыў

Пра час і пра нас

Што расказаць пятнаццацігадоваму чалавеку

НЯДАЎНА адна пятнаццацігадовая дзяўчына, якая падумвае пра тое, каб стаць журналістам, спытала ў мяне, якая была мая першая сур'ёзная публікацыя. Пакапаўшыся ў памяці, я пачала ёй расказваць гісторыю пра чалавека, які ў сорак два гады моцна захварэў — адмовілі ныркі. І яму ў нашай 4-й бальніцы ў Мінску зрабілі перасадку. Зрабілі ўдала, але тут з'явілася новая праблема: каб чужы орган прыжыўся, трэба, асабліва напачатку, прымаць спецыяльныя лекі. Якія дзяржава закупляла недзе за мяжой. Але чыноўнікі з Міністэрства аховы здароўя грошы, выдаткаваныя на гэтыя мэты, патрацілі на... мільён апраў для акуляраў. І развялі рукамі: больш сродкаў няма. Урачы, якія рабілі аперацыю па перасадцы, абабілі ўсе парогі, каб выратаваць свайго пацыента (дакладней, пацыентаў). Але ўсюды атрымалі адказ: грошай няма. Людзі з перасаджанымі ныркамі ішлі да дактароў з надзеяй, а тыя хавалі вочы: яны нічым не маглі дапамагчы, яны ведалі, якая пакутлівая смерць чакае тых, каго яны ратавалі. Мужчына памёр вельмі не хацеў, ён хацеў убачыць, як вырастуць яго дочкі. І звярнуўся да сваёй стрыечнай пляменніцы, якая вучылася толькі на другім курсе журфака, але амбіцыйна ўсім заяўляла: «Я журналіст...»

«Звязда» тады апублікавала маю першую спробу пяра. Мільён апраў замест жыццёва важных лекаў нават вынеслі ў загаловак. Зрэшты, сенсацыі ў гэтым не было: аправы тыя прадаваліся ў камерцыйных аптэках па амаль завобласнік цэнах, а чыноўнікі міністэрства з гонарам расказвалі ў інтэрв'ю, якое добра яны зрабілі людзям. Матэрыял, змешчаны ў рэспубліканскай газеце, меў рэзананс, і хутка грошы на лекі аднекуль знайшліся. Мой дзядзька пражыў яшчэ дваццаць з лішнім гадоў, павыдаваў дачок замуж, пацешыўся з унукаў...

ДЗЯЎЧЫНКА, выслухаўшы гэту гісторыю, задала мне пытанні, якіх я зусім не чакала. Напрыклад, чаму аперацыю па перасадцы рабілі ў звычайнай бальніцы, а не ў Цэнтры транспланталогіі? Ці як маглі чыноўнікі з міністэрства вось так усіх падмануць і чаму ім за гэта нічога не было? Я спрабавала адказаць проста: маўляў, гэта ж быў 92-гі год. Але ўбачыла ў вачах абсалютнае неразуменне. Яны, пятнаццацігадовыя (дый старэйшыя за іх на пяць, дзесяць, нават дваццаць гадоў), гэтага проста не ведаюць. А мы ім не расказваем, нібы саромеемся. Хаця, напэўна, варта было б.

НАПРЫКЛАД, пра тое, як збіваліся з ног пасля заняткаў, каб купіць хоць што з прадуктаў. Пра вялізныя чэргі ў каўбасныя і малочныя аддзелы. Пра хлеб, намазаны маргарынам, — масла было не дастаць. Пра тое, як, атрымаўшы стыпендыю, беглі тут жа ў кіёск абмену валют (адзін з іх стаяў акурат каля мастацкага музея), куплялі на ўсе «зайчыкі» долары (атрымлівалася, калі стыпендыя павышаная, ажно дзесяць!), каб назаўтра здаць долар ці два па значна вышэйшым курсе і купіць лішні батон ці пачак маянэзу. Пра тое, як нашы мамы перадавалі адна адной рэцэпт «ну вельмі смачных катлет»: у аўсяныя шматкі дадаць разведзены ў вадзе кубік заморскага цуд-булёну «галіна бланка». І мы елі гэтыя «катлеты», у якіх не было ні грама фаршу, і яны сапраўды здаваліся смачнымі. Пра тое, як бабуля ў гастраноме прасіла прадаць ёй адно яйка — на больш у яе не было грошай. Пра набітыя цесныя аўтобусы з дачнікамі — людзі кармліся з зямлі, а машыны лічыліся раскошай.

ПРА даўгабуд у цэнтры Мінска на Кастрычніцкай плошчы, агароджаны бетоннай сцяной, за якой не было і намёку на тое, што нейкія работы калісьці будуць весціся. Пра «братскоў» у зялёных і фіялетавых спартыўных касцюмах, з залатымі ланцугамі на шыях, якія паўсюль хадзілі гаспадарамі. Пра спірт «Раял» у літровых бутэльках, які прадаваўся на кожным кроку, літаральна ў «камках» на вуліцы. Пра стойкі пах ацэтону на калідоры ўніверсітэцкага інтэрната — наркотыкі варылі проста на кухні, асабліва не хаваючыся, і нікому да гэтага не было справы. Пра сектантаў, якія чапляліся на вуліцы, нахабна тыцкалі ў рукі нейкія кніжкі, завабліваліся на вячэру (і некаторыя ішлі, бо там сапраўды кармілі). Пра «шапачнікаў» — тых, хто з галавы ў людзей зрываў футравыя шапкі, і «сапожнікаў» — яны дзейнічалі ў плацкартных вагонах цягнікоў, крадучы абутак, які людзі, кладучыся спаць, пакідалі на падлозе. Іх вельмі рэдка шукалі, а яшчэ радзей — знаходзілі...

ПРА гэта адчуванне безнадзейнасці, якога, калі табе дваццаць, увогуле быць не павінна. А яно часам апаноўвала, асабліва калі задумваўся аб тым, дзе ты будзеш жыць, калі скончыш універсітэт. Аб тым, каб займець сваё жыллё, нават думкі не было. Каб проста застацца ў Мінску, трэба было мець прапіску, і каштавала яна пяцьсот долараў (пры добрай зарплаце пяцьдзясят). Пра тое, як мы, дваццацігадовыя, з нейкім бадзёрым адчаем цытавалі ў сваёй «інтэлігенцкай» тусоўцы вырванае з Лермантава: «Печально я гляжу на наше поколенье! Его грядущее иль пусто, иль темно...» — і прызнавалі гэта дэвізам свайго існавання...

Канешне, былі ў тых «ліхіх 90-х» і радасць, і каханне, і прыемныя падзеі. Бо гэта было — жыццё, якое ніколі не саткана толькі са святла ці з суцэльнай цемры. Але вось жа, калі і хочацца вярнуцца ў той час, дык толькі па адной-адзінай прычыне: тады была трава зялянейшая і вада макрэйшая, бо ты сам быў на трыццаць гадоў маладзейшы. Толькі вось па гэтай адзінай прычыне...

ЯК расказаць гэта пятнаццацігадовым (дый старэйшым)? Каб разумелі, каб ведалі, каб цанілі? Давайце спачатку хаця б пачнём. А там, можа, і атрымаецца.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ПАСЛЯ ЧАРНОБЫЛЯ

Як Беларусь пераадольвае наступствы аварыі на ЧАЭС

Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі — самая маштабная тэхнагенная катастрофа ў гісторыі чалавецтва. Яе наступствы адчулі больш за 20 краін свету, але галоўны ўдар прыняла на сябе беларуская зямля. Радыеактыўнае забруджванне закранула ўсю тэрыторыю рэспублікі (у першую чаргу — Гомельскую, Магілёўскую і Брэсцкую вобласці), але асабліва пацярпелі 3678 гарадоў, пасёлкаў і вёсак, дзе пражывала больш за два мільёны чалавек. 479 населеных пунктаў тады спынілі сваё існаванне, а плошча зоны адчужэння склала 1,7 тыс. квадратных кіламетраў.

Рэха чарнобыльскай трагедыі Беларусь адчувае да гэтага часу. Але час загойвае нават такія раны. Ідзе паступовы вывад населеных пунктаў з зоны радыеактыўнага забруджвання ў сувязі з паляпшэннем радыяцыйнага становішча, працягваецца сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых тэрыторый. Пра тое, што зроблена і робіцца сёння ў нашай краіне для пераадолення наступстваў самай маштабнай аварыі ў гісторыі атамнай энергетыкі, напярэдадні 38-й гадавіны трагедыі расказалі прадстаўнікі Дзяржатамнагляду.

Бяспека — найважнейшая задача

— Наступствы катастрофы на ЧАЭС носяць глабальны характар, — падкрэсліў **першы намеснік начальніка Дзяржатамнагляду Леанід ДЗЯДУЛЬ.** — У выніку выбуху і пажару ў атмасферу было выкінута каля 200 відаў радыенуклідаў з перыядам паўраспаду ад некалькіх гадзін да соцень тысяч гадоў.

Асноўны ўдар прыпаў на тэрыторыю Беларусі, адзначыў ён. У якасці прыкладу вучоны прывёў радыенуклід цэзій-137. «Ён уносіць асноўны ўклад, каля 90 %, у фарміраванне дозавай нагрузкі на насельніцтва», — растлумачыў спецыяліст. 35 % ад агульнага аб'ёму гэтага радыенукліду на еўрапейскай тэрыторыі выпала на Беларусь.

— За пасляаварыйны перыяд плошча радыеактыўнага забруджвання па цэзію-137 з прычыны яго распаду паменшылася амаль у два разы. Калі быць дакладным, у 1,8 раза, — расказаў прадстаўнік Дзяржатамнагляду. — І цяпер складае каля 25,5 тыс. квадратных кіламетраў, або 12 % агульнай плошчы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Застаюцца забруджанымі звыш 1 кюры на квадратны кіламетр па цэзію-137 каля паўтара млн гектараў лясоў і каля 819 тыс. гектараў сельгасугоддзяў. Па стане на 2024 год у зонах радыеактыўнага забруджвання размешчана больш за дзве тысячы населеных пунктаў, у якіх пражывае каля 930 тысяч чалавек, 185 тысяч з якіх — дзеці. Тэрыторыі размешчаны ў Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях.

— Карэкціроўка пераліку праводзіцца кожныя пяць гадоў. На працягу 2024—2025 гадоў работа па радыеэкалагічным абследаванні гэтых населеных пунктаў будзе завершана, і ў пачатку 2026 года пералік будзе адкарэкціраваны з прыняццем адпаведнай пастановы ўрада, — удакладніў Леанід Дзядуль.

Работа вядзецца ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС на 2021—2025 гады.

— Гэта ўжо шостая праграма, яна накіравана на далейшае развіццё пацярпелых тэрыторый, вырашэнне пытанняў у сацыяльнай сферы і задач у галіне забеспячэння радыяцыйнай бяспекі.

Шэраг задач па чарнобыльскай праблематыцы рэалізоўваецца сумесна з Расійскай Федэрацыяй у рамках саюзных праграм, расказаў прадстаўнік Дзяржатамнагляду.

— Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы адобраны сумесныя прапановы па распрацоўцы Саюзнай праграмы на 2025—2029 гады, і сёлета плануем унесці праграму на зацвярджэнне ўрада, — дадаў навуковец. — Таксама плануюцца мерапрыемствы да 40-й гадавіны з дня трагедыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі.

У цэлым, з 1986 года на пераадоленне наступстваў аварыі дзяржавай было накіравана каля 20 млрд долараў, паведаміў Леанід Дзядуль. Рэалізавана пяць дзяржаўных і пяць саюзных праграм. Дзякуючы гэтаму сёння ўжо можна весці размову не аб рэабілітацыі, а менавіта аб адраджэнні пацярпелых рэгіёнаў.

1	**Прицеп специальный сортиментовоз KILAFORS TSB**	2 292,62	1 834,10
2	**Отопительный котел МИР-95 в комплекте**	1 098,81	879,05
3	**Отопительный котел МИР-95 в комплекте**	1 098,81	879,05
4	**Вентилятор для вытяжки опилок ОТ 11кВт**	511,00	408,80
5	**Торцовочный станок СТ-450**	280,00	224,00
6	**Станок точильно-шлифовальный**	728,00	582,40

Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота.
Размер задатка – 5 % от начальной цены лота.
Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – ООО «Индустрия Инноваций»

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций - Торги» https://iintorgi.by

Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Организатор аукциона, оператор ЭТП:
ООО «Индустрия Инноваций»,
г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

Продавец: ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

№	Наименование	Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС
1	**Капитальное строение с инв. № 330/С-33528, расположенное по адресу: г. Мозырь, ул. Саета Г.Е., 4. Общая площадь: 738,7 кв. м. Наименование: здание банка. Назначение: здание специализированное финансового назначения**	658 130,59

Четверные повторные публичные электронные торги (аукцион).
Размер задатка – 10 % от начальной цены лота.
Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота

Аукцион состоится 07.05.2024, начало: 10.00, окончание: 16.00 на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by.
Время приема заявок: с 26.04.2024 09.00 до 06.05.2024 г. 17.00

2	**Капитальное строение с инвентарным номером 123/С-2508, расположенное по адресу: Брестская обл., Кобринский р-н, г. Кобрин, ул. Дзержинского, 61. Назначение: здание специализированное финансового назначения, наименование: здание банка**	515 000,00

Размер задатка – 20 % от начальной цены лота.
Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота

Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа ООО «Индустрия Инноваций».
Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе, размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций - Торги» https://iintorgi.by

Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса, расположенных на территории Бешенковичского района Витебской области

Наименование рыболовных угодий	Озеро Кореневское (Святое) Бешенковичского района
Общая площадь гектаров, описание границ рыболовных угодий	37,0 га, расположенное 28 км на северо-запад от г.п. Бешенковичи, 4 км на запад от аг. Улла Бешенковичского района
Целевая направленность использования рыболовных угодий	Ведение промыслового рыболовства
Класс, категория	Окунево-плотвичное
Срок заключения Витебским облисполкомом договора аренды рыболовных угодий	Не менее 10 лет, но не более 25 лет. Срок аренды определяется в решении Витебского облисполкома о предоставлении рыболовных угодий в аренду и исчисляется со дня подписания договора аренды
Сумма ежегодной арендной платы	0,2 базовой величины за 1 гектар водного объекта (7,4 базовой величины или 296,00 (двести девяносто шесть) белорусских рублей 00 копеек)
Арендодатель	Витебский областной исполнительный комитет

1. Конкурс состоится **31 мая 2024 года в 11.00** по адресу: Витебская обл., г. п. Бешенковичи, ул. Чуклая, 13 (малый зал заседания)

2. **Организатор конкурса:** Бешенковичский районный исполнительный комитет (далее – райисполком) в лице комиссии по организации и проведению конкурса по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса для ведения промыслового рыболовства и организации платного любительского рыболовства, созданной решением райисполкома от 15 января 2024 г. № 61 «Об организации и проведении конкурса по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса».

Арендодатель: Витебский областной исполнительный комитет, 210010, г. Витебск, ул. Гоголя, дом 6, контактный телефон (0212) 22-30-25.

3. Для участия в конкурсе приглашаются юридические лица, заинтересованные в получении рыболовных угодий в аренду.

Участникам конкурса необходимо в адрес организатора по адресу: Витебская обл., г. п. Бешенковичи, ул. Чуклая, 13 предоставить следующие документы:

- заявление, в котором указываются сведения о рыболовных угодьях, которые участники конкурса желают получить в аренду по результатам конкурса;
- копию комплексного плана использования рыболовных угодий (далее – комплексный план), разработанного в соответствии с требованиями к его содержанию и форме, установленными Советом Министров Республики Беларусь, запечатанного в отдельном конверте;
- письменные предложения участников конкурса о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте. При этом данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе проведения конкурса;
- копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка (за исключением случая внесения платы посредством использования автоматизированной информационной системы единого расчетного и информационного пространства);
- доверенность представителя участника конкурса и копия документа, подтверждающего его личность (в случае, если заявление подписывается не руководителем участника конкурса), либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника конкурса;
- биолого-экономическое обоснование ведения рыболовного хозяйства, согласованное в порядке, установленном Советом Министров Республики Беларусь;
- документы, подтверждающие возможность участия юридического лица в конкурсе, указанные в пункте 4 настоящего извещения.

4. К участию в конкурсе допускаются юридические лица:

- в отношении которых не возбуждено производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) и не принято решение об открытии ликвидационного производства;
- руководители которых не привлекались к административной ответственности за правонарушения против экологической безопасности, окружающей среды и порядка природопользования и (или) уголовной ответственности за преступления против экологической безопасности, окружающей среды и порядка природопользования в течение последних пяти лет;
- в отношении руководителей которых не принимались решения суда о досрочном расторжении (прекращении действия) аналогичного договора с участником конкурса в связи с нарушением им существенных условий такого договора в течение десяти лет до проведения конкурса.

5. Для участия в конкурсе участниками конкурса вносится до подачи в комиссию заявления единовременно задаток в размере 30 процентов от суммы ежегодной арендной платы или 88,80 (восемьдесят восемь) белорусских рублей 80 копеек на расчетный счет райисполкома.

6. Порядок проведения конкурса определяется Положением о порядке проведения конкурса по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 июня 2022 г. № 366 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 21 июля 2021 г. № 284».

7. Конкурс проводится при наличии заявлений двух и более участников конкурса. Последний день подачи документов **17 мая 2024 г. до 17.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, рассмотрению не подлежат.

В случае если заявление подано только одним участником конкурса и его предложения соответствуют условиям конкурса, заключение договора аренды рыболовных угодий осуществляется с этим участником конкурса на предложенных им условиях.

Организатор конкурса вправе отказаться от проведения конкурса не позднее чем за 30 календарных дней до начала проведения конкурса.

Участники конкурса вправе присутствовать на заседании комиссии.

8. Победителем конкурса считается участник, который предоставит лучшие предложения о выполнении обязательных условий конкурса, которые должны отвечать следующим требованиям:

- сохранение и рациональное использование рыбных ресурсов;
- восполнение изымаемых рыбных ресурсов с целью сохранения видового разнообразия;
- предотвращение загрязнения береговых участков рыболовных угодий;
- осуществление охраны рыболовных угодий;
- обеспечение вылова рыбы согласно установленным квотам на вылов рыбы;
- обеспечение свободного доступа граждан к рыболовным угодьям для осуществления их права общего природопользования.

9. Победителю конкурса, его единственному участнику размер внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору аренды рыболовных угодий, заключаемому по результатам конкурса, при внесении платы за аренду рыболовных угодий. Если победитель конкурса, его единственный участник отказался от подписания протокола конкурса, комиссией составляется соответствующий протокол, при этом внесенный победителем задаток возврату не подлежит.

10. Победитель конкурса, его единственный участник, возмещает путем безналичного расчета на расчетный счет райисполкома платежным поручением затраты на организацию и проведение конкурса:

за публикации в средстве массовой информации извещения о проводимом конкурсе;

расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам конкурса документации, необходимой для его проведения.

Окончательная сумма затрат и порядок их возмещения доводится до сведения участников конкурса до начала его проведения в день проведения конкурса.

11. Платежные реквизиты для перечисления задатка, а также возмещения затрат на организацию и проведение конкурса:

расчетный счет IBAN BY02AKBB36410000000300000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBBBY2X, получатель – Бешенковичский районный исполнительный комитет, УНП 300145203.

Участникам конкурса, не признанным победителями конкурса, задаток возвращается в течении пяти рабочих дней после даты проведения конкурса.

12. Договор с победителем конкурса заключается Витебским областным исполнительным комитетом в порядке и в сроки, установленные Правилами ведения рыболовного хозяйства, утвержденными Указом Президента Республики Беларусь от 21 июля 2021 г. № 284.

Адрес и контактный телефон секретаря комиссии: Витебская область, г. п. Бешенковичи, ул. Чуклая, 13, кабинет 29, рабочий день – с 8.00 до 17.00 с перерывом на обед с 13.00 до 14.00, контактный номер телефона 8 02131 640 65.

Комиссия по организации и проведению конкурса.

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов
по продаже имущества **ОДО «ФАРМИН»** (УНП 190073936), объявляет о проведении **07.05.2024 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by**

Нясумнае чытанне

СУСВЕТ У ШКЛЯНЫХ ВАЧАХ

Незвычайныя лялькі на старонках літаратурных твораў

У васямнаццатым стагоддзі філосаф Жульен дэ Метры, паслядоўнік Дэкарта, напісаў трактат пра ятрамеханізм — філасофію, згодна з якой чалавек усяго толькі «прамаходны механізм», які можна паспрабаваць... зрабіць.

І спрабавалі! Гэткія правобразы сучасных робатаў... Вакансон з Грэнобля, напрыклад, зрабіў механічнага флейтыста, які граў менуэты і рыгадоны — дзьмуў у інструмент, пальцы націскалі клапаны... Потым зладзіў жалезную качку, якая магла не толькі кракаць, хадзіць, лопаць крыламі, але і есці, пераварваць ежу і спраўляць натуральную патрэбу. У Нясвіжскім палацы Пане Каханку меўся металічны паўлін, які мог раскрываць хвост, і штучны леў, які рыкаў... Падобная лялька, якая ўмела маляваць, зрабілася гераіняй і рухавіком сюжэта майго рамана «Авантуры студыёзуса Вырвіча». У вершы Уладзіслава Сыракомлі «Лялька» менавіта цацка выслухоўвае расповеды пра тое, як паны здзекуюцца над мужыкамі, і сведчыць прысягу сваёй юнай гаспадыні, што тая не стане так учыняць. Лялькі — гэта не проста бяскрыўдныя дзіцячыя цацкі, пра што добра ведалі нашы продкі, ужываючы іх у якасці абярэгаў, выкарыстоўваючы ў розных рытуалах... Нядаўна мы адзначалі Міжнародны дзень лялечніка і ў чарговы раз упэўніліся, што лялькі могуць быць і Вялікім мастацтвам. Ёсць незвычайныя лялькі і на старонках твораў беларускіх пісьменнікаў. Давайце разам пагартаем тыя старонкі.

Лялька з Майданека

Нядаўна выйшаў з друку зборнік дзённікаў пісьменнікаў-франтавікоў «Мы жылі ў буднях барацьбы». Там ёсць і франтавы дзённік пісьменніка Вісарыёна Гарбука. Лёс быў да яго нялітасцівы... У 1930-х Гарбук сасланы на Калыму, вярнуўся, працаваў настаўнікам... А ў 1941-м апынуўся на фронце. Быў сапёрам. З І Беларускім фронтам дайшоў да Берліна... На фронце моцна застудзіўся, доўгія гады быў прыкаваны хваробай да ложка. Апавяданне «Лялька» напісанае ім у 1956 годзе па асабістых успамінах. Інжынер-капітан Голубеў неўзабаве пасля Перамогі працуе ў Берліне, у штабе сваёй часці. Думае толькі аб адным: калі ўбачыцца з жонкай і са старэнькай матуляй у Мінску, калі ўпершыню возьме на калені (ёй ужо споўнілася чатыры гады!) дачушку Маечку. Старшы тэхнік-лейтэнант, малады вясёлы Дубаў прыносіць Голубеву падарунак для яго дачкі: прыгожую ляльку з доўгімі, хвалістымі, светла-залацістымі валасамі.

Голубеў пачаў разглядаць ляльку, і раптам...

«Ён скалануўся, змяніўся з твару. Лялька ківнулася і, перакуліўшыся, ніцма ўпала на паркет.

— Чые?. .— перапытаў Дубаў.

— Майданек...»

Аказалася, Голубеў зразумеў, што валасы лялькі зробленыя з валасоў вязняў канцлагера Майданек. Магчыма, у гэтай лялькі былі валасы закатаванага дзіцёнка. Вядома, герой болей не можа нават бачыць гэтую ляльку, і каробку з ёй выносяць з пакоя, як труну дзіцяці.

Чучалы на конях

У аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» атмасфера гатычная і лялькі гатычныя.... Памятаеце, як ляціць над верасовай пусткай, над балотамі дзікае паляванне? *«Цьмяныя цені коннікаў беглі ад дарогі наўскос да дрыгвяністай лагчыны. Веялі па ветры плашчы-велеісы, коннікі прама, як лялькі, сядзелі ў сядле, і ніводны гук не далятаў адтуль».*

Аўтар недарэмна параўноўвае жудасных коннікаў з лялькамі. Калі прывіднае паляванне, што трымала ў жаху ўсё наваколле, удалося разграміць, *«дзве разгадкі прыйшлі нечакана. Па-першае, ля сядла кожнага паляўнічага віселі чатыры глыбокія аўчынныя торбы, якія, відаць, у выпадку патрэбы, можна было надзець на ногі коням і завязаць ля бабак. Крок рабіўся зусім бязгучны. Па-другое: сярод трупаў і параненых я пабачыў на зямлі тры чучалы, апранутыя так, як і паляўнічыя, у старыя капелюхі з пер'ямі, кабці, чугі, але прывязаныя вяроўкамі да сядла».*

Злыдняў было не так шмат, як яны намагаліся ўнушыць людзям, таму й спатрэбіліся ім напханыя саломай лялькі: маўляў, галоўнае спалохаць. Менавіта гэты вобраз — чучала, прывязанае да каня, страх, які выявіўся лялькай, — выкарыстаў у экранізацыі аповесці рэжысёр Валерый Рубінчык.

Надзіманы баксёр Якуб

А вось у той будучыні, якую апісвае Леанід Дайнека ў рамане «Чалавек з брыльянтавым сэрцам», лялькі асаблівыя. Дапамагаюць зняць стрэс, і вось якім чынам:

«Вось-вось павінен быў грымнуць эмацыянальны выбух. Радаслаў, каб не абвастраць сітуацыю, дастаў з унутранай кішэні курткі дарожны партманет, раскрыў яго. У адным з аддзяленняў партманета ляжаў малюсенькі чырвоны чалавечак-лялька. Радаслаў націснуў кнопку, пачуўся свіст, і чалавечак адразу пачаў надзімацца.

— Хутчэй, хутчэй, Якуб, — падганяў яго Радаслаў.

Чалавечак, быццам пачуўшы загад, скокнуў з партманета на падлогу і хвіліны праз тры-чатыры быў ростам упоравень з Буслейкам. Вось ён прыняў баявую баксёрскую стойку, і пачаўся паядынак. З усіх спартыўных адзінаборстваў Радаслаў аддаваў перавагу класічнаму ангельскаму боксу. Якуб быў нядрэнным спарынг-партнёрам, вельмі хутка рухаючыся, валодаючы адчувальным ударам. Яго чырвоныя гумавыя кулакі ярасна малацілі паветра, і неўзабаве Радаслававай сківіцы давялося ўздрыгнуць.

— Малайчына Якуб! — крыкнуў Буслейка. — Так мне і трэба!»

Калі герой усё-ткі перамагае гумавага Якуба, той «здзьмуўся, змізарнеў і зноў ператварыўся ў малюсенькую лялечку, каб заняць звычнае месца ў партманеце».

Бульбяны чалавечак

У рамане Івана Шамякіна «Гандлярка і паэт» дзеянне адбываецца ў час вайны, у акупаваным Мінску. Камароўская гандлярка, увішная Вольга Ляновіч, па намове сяброўкі выкупляе з палону чырвонаармейца — інтэлігентнага хлопца, у якога з цягам часу закахалася так, што ўсе гандлярскія каштоўнасці пасыпаліся. Кватарант сыходзіць у партызаны, Вольга тужыць, плача, паўтарагадовая яе дачка Светка суцяшае маці... І ў гэты момант у хату прыходзіць партызанскі камандзір, з весткай пра яе каханага. Госць трымаецца вясёла, але ён два дні не еўшы. Вольга хуценька гатуе пачастунак, а госць, якога завуць Яўсей, бавіцца з малой Светкай:

«Сеў на нізкі табурэцік і пачаў з бульбіны выразаць малой ляльку — смешнага чалавечка».

Аўтар надалей нічога не піша пра таго выразанага з бульбіны галодным партызанам чалавечка, але дэталь яскравая, запамінальная і вельмі беларуская.

Твіст для надзіманай лялькі

У п'есе Андрэя Макаёнка «Зацюканы апостал» выкрываецца буржуазны лад з загнілымі маральнымі каштоўнасцямі. Падлетак-бунтар па мянушцы Малы супрацьстаіць сваёй сям'і, дзе пануюць абыякавасць, ілжывасць, ханжаства, пошласць. Сімвалам усяго гэтага робіцца знойдзеная героем у сваіх бацькоў... лялька. Праўда, не простая, а надзіманая: *«А перад намі — адна з «жамчужын» цывілізацыі: надзімная гумавая жанчына без ніякай маскіроўкі — галыш».*

Словы героя да яе поўныя горкага сарказму: *«Як жа вас завуць, мілэдзі? Эсфір? Сястрычка! Між іншым, усіх жанчын надуваюць. І хто іх толькі не надувае. Дома — дзеці і муж. На службе — падначаленыя. Настаўніц — вучні. Прадаўшчыц — пакупнікі. А ты хто? Што ўсміхаешся? Табе весела? Дурната!»*

Заканчваецца тым, што герой «пачынае танцаваць з лялькай, парадзіруючы твісты, рок-н-ролы, падкрэсліваючы, утрыруючы іх пошласць», потым выпускае з яе паветра — чым падкрэсліваецца пустэча буржуазных каштоўнасцяў. У кожнай пастаноўцы «Зацюканага апостала» абавязкова ярка іграюць гэтую сімвалічную сцэну.

Лялечны Апакаліпсіс

Нельга ўсё-ткі не згадаць і пра іншых лялек з твораў Караткевіча, а менавіта тых, з якімі гуляецца гарадскі войт Цыкмун Жаба ў рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». У яго былі ночвы, дзе ён мог учыняць імітацыю Сусветнага патопу. Расстаўляў па дне фігуркі, потым пускаў у ночвы ваду. Лялькі былі драўляныя, рукі іхнія, змацаваныя на суставах ніткамі, боўталіся. Былі і цацачныя хаткі, цацачныя каровы, авечкі, коні — цэлы свет. Жабе прыносіць незвычайнае задавальненне бачыць, як ён гіне.

«Ноздры ягоныя дрыжэлі, пашыраліся. Вада ўжо разлілася па дне начовак, дасягнула лялькам да каленяў. Жаба перастаўляў тых з іх, што былі бліжка, на стрэхі хацінак. Астатнія паступова заліваліся вадою і не ўсплывалі, бо ў ножкі быў заліты свінец.

Вось ужо заліло авечак... кароў... коней... Некаторыя чарапяныя і касцяныя фігуркі ўсплылі, бо былі пустыя ўнутры. Вада паступова набіралася ў іх, і яны павольна апускаліся ў яе. Астатнія засталіся, варушылі пад напорам плыні рукамі, уздымалі іх па меры таго, як падымалася вада. Нібы цягнулі гэтыя рукі да тых, што былі на стрэхах.

Потым вада заліла іх з галавой, і яны стаялі, узняўшы рукі ўгору. Плынь пачала ўкрываць дворныя пабудовы... дахі...

Войт узяў адну ляльку са страхі і паставіў яе на званіцу. Вада ўжо заліла хаты і дрэвы. Толькі плавалі, паступова запаўняючыся вадой, некалькі лялек. Маленькія бурбалкі вырываліся ў іх з ратоў: відаць, у паветраны звон іхняга полага цела вялі тонкія, як волас, праходы».

Страшнаватая сцэна, згадзіцеся. Але адзін са станоўчых герояў, які перамагае войта Жабу, ратуе і яго лялек з вады, што сімвалізуе заўсёдную перамогу жыцця і міру.

Спадзяюся, такое падарожжа па старонках беларускіх твораў змусіць вас не толькі задумацца над філасофскім сэнсам лялькі, але і перачытаць нашу класічную літаратуру.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.



ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ, альбо

Старэйшых і ў турме шануюць

...Некалі раней усе навіны мясцовага значэння вясковыя жанчыны (пра мужчын размова асобная) абмяркоўвалі «на сяле» альбо каля студні, прыходзячы па ваду... Цяпер ужо іншае месца збору: пляцоўка, дзе спыняюцца аўтапошта і аўтакрама. У чаканні іх (ды ў добрае надвор'е!) чаго толькі не пачуеш! Тэмы — самыя розныя: цэны, дзеці і ўнукі, кінафільмы, дарагія ўспаміны і, вядома ж, хатнія гадаванцы. Сцяпанаўна, жанчына «залатога ўзросту», неяк раз пахвалілася, што кацяня ўзяла.

— Дык ты ж як быццам не збіралася? — здзівілася яе аднагодка.

— Не... Аднак перадумала: жыццё прымусіла. Гэта ж пад Новы год мы з мужам ёлачку дома паставілі. Цацак шмат — было чым упрыгожыць! А да ўсяго я цукерак накупляла — дарагіх, у бліскучых абгортках... Як у дзяцінстве на галінкі навешала... Атрымалася вельмі прыгожа!

Але ж праз дзень-другі гляджу — і ўжо як быццам не так, быццам меней «цацак» на ёлцы. Ну, думаю, не я адна — і гаспадар мой маленства ўспомніў, душу адвёў... Пасмяялася ды змаўчала — няхай чалавек пацешыцца — свята ж, Каляды...

Але ён, бачу, ну ніяк не спыніцца: ёлка ўсё болей «лысее», цукерак — лічы што няма...

Я з той крыўды адчыніла старую шафу, думала супакоіцца — рэчы там перабраць. Пацягнула да сябе ніжнюю шуфляду і вачам не паверыла: у куточку цэлы «стог» бліскучых абгортак! Тут, што называецца, да бабкі не хадзі: мышы «балявалі» — ладзілі сабе салодкі стол.

Кліч свайго чалавека, паказваю знаходку. «Во, — кажу, — а я ж на цябе грашыла! І нават злавала!» — «А я — на цябе», — кажа мой.

Во як бывае!

Разам з ім пасмяяліся, памірыліся — разам надумалі коціка ўзяць.

— А мы ж некалі наадварот, — стала ўспамінаць Міронаўна, — збыць хацелі... Маладыя былі: толькі пажаніўшыся, у мамы сталі жыць. І быў там кот. Яго «старым дармаедам» звалі, бо мышы па хаце шастаюць, а ён толькі спіць... Мама да зяця (мой шафёрам працаваў): «Звязі ты яго! Маладзенькага возьмем».

Зяць спярша — ні ў якую: нават слухаць не хацеў, але ж гэта цешча, гаспадыня, ды і я ёй стала «падпяваць»... Так што ўрэшце муж згадзіўся: сказаў, што павязе на мясакамбінат калгасную жывёлу, а заадно — і ката... Там, маўляў, шмат такіх... Не прападзе.

Як сказаў, так і зрабіў: зранку, на развітанне, смачна пакарміў, потым завёз (за 80 вёрстаў!), на тэрыторыі камбіната выпусціў — пайшоў дакументы выпісваць.

Дамоў вярнуўся толькі пад вечар. Падышоў да хаты, — на ганку наш дармаед сядзіць! Не ўпадабаў, значыць, новае месца, заскочыў (мы так падумалі) на запасное кола (там мешкавіна ляжала, каб, перавозячы, збожжа накрываць) і вось так вярнуўся дамоў.

Пасля гэтага нават мама праслязілася, зашкадавала ката, не звала больш гультаём-дармаедам. Старых, казала, і ў турме шануюць.

Мела рацыю.

Іван Букоўскі,
Глыбоцкі раён.

Валянцін Губараў. «Жыццё цудоўнае!»

ЗА СПАКОЙ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ, альбо Паўдня

З жыцця жанчыны

Эмілія — «пані трошкі ў гадах», разумная, дзелавая, рухавая... Яна хіба гэту вясну сустрэла неяк не так: больш разбітай — і фізічна, і маральна.

— Не падабаецца мне твой настрой, — заключыла суседка (медык па адукацыі). — Ты калі шчытавідку сваю правярала? Ці забылася, што ў цябе з ёй праблемы?

Так, праблемы і былі, і ёсць: як паказала ўльтрагукавое даследаванне, залоза павялічылася, вузельчыкі таксама... А больш поўнае даследаванне, жанчыне сказалі, можна зрабіць у абласным дыягнастычным цэнтры.

Накіраванне туды Эмілія разгарнула ўжо дома, прачытала яшчэ і тое, што пераблытаныя яе імя, імя па-бацьку. Значыць, у паліклініку прыйшлося паехаць яшчэ раз. І гэта быў толькі пачатак.

...Білет на аўтобус яна брала загадзя, сумку складвала напярэдадні вечарам. Раніцай паглядзела, ці ўсё ўзяла?

Кашалька на месцы не аказалася. «Вось жа безгаловая, — падакарала сама сябе, — забылася пакласці».

Кашалёк знайшоўся не адразу, бо ляжаў... у прыбудове да хаты, у веласіпеднай карзінцы (напярэдадні Эмілія ездзіла ў краму па прадукты).

На гэтым зборы завяршыліся, як і час на іх: каб даехаць да аўтавакзала, трэба было выклікаць таксі.

Жанчына спехам набрала нумар — ёй прапанавалі... гульню; у «Вайберы» націснула квадрацік «Таксі «Калі ласка». Там чамусьці двойчы перапыталі адрас, пасля чаго ветліва патлумачылі, што гэтая служба ў... іншым горадзе.

А гадзіннік між тым цікаць не перастаў, верагоднасць спазніцца на прыём імкліва расла. У роспачы Эмілія набрала трэці нумар — кругласутачнага таксі. Мужчына (праўда, заспаны) прыняў заказ, сказаў, што машына выязджае.

Абнадзееная пасажырка тут жа замкнула дзверы дома, выйшла сустракаць, а на вуліцы між тым «33 нячысці»: лівень, цемра, вецер такі, што вырывае з рук парасон...

У далечы, на шчасце, замільгала святло аўтамабільных фар. «Паспею!» — падумала жанчына. Аднак тое святло чамусьці... спынілася — застыла на месцы.

Іншага выйсця не было: Эмілія — па гразі — пабегла да машыны, і — ура! — у пункце А пасажырка і таксі сустрэліся! Кіроўца прызнаўся, што пераблытаў нумар дома.

...У аўтобус жанчына заскочыла за хвіліну да яго адпраўлення. Але на гэтым яе прыгоды не завяршыліся. На пад'ездзе да Полацка вадзіцель аб'явіў пасажырам, што ім давядзецца перасесці: гэты аўтобус, маўляў, няспраўны.

Карацей, у дыягнастычны цэнтр Эмілія зноў імчала на таксі. Там, пад дзвярыма патрэбнага кабінета, ёй трэба было паразумецца з чаргой, у самім кабінеце — зарэгістравацца, дачакацца выкліку.

Але ж добра ўсё, што добра заканчваецца. Вынікі абследавання паказалі, што ў жыцці жанчыны гэта вясна, дасць бог, не апошняя!

...«Усе знакі супраць былі, — выслухаўшы пералік прыгод і непрыемнасцяў, заўважыла потым суседка-медык. — Можа, табе і не трэ было ехаць?»

Эмілія не згадзілася: сказала, што за спакой усё ж лепш заплаціць. Хай сабе і нервамі.

Фаіна Касаткіна,
г. Паставы.

ГЭТА БЫЎ НЕ МУЛ...

Тады хто?

Не толькі жанчын, — і мужчын таксама часам хлебам не кармі, дай расказаць нейкую гісторыю! Вось гэту я ў лазні пачуў:

— У 70-я гады мінулага стагоддзя, — здалёку пачаў знаёмец, — у нашы мясціны завезлі мулаў: прыгожых шэрых жывёлін з вялікімі такімі рагамі...

(Апошнія два словы і мяне, і «публіку» насцярожылі, бо ўсе, як выглядала, ведалі, што мулы — гэта помесь кабылы з аслом, таму ў іх аніякіх рагоў няма і нават быць не можа — па вызначэнні, як моладзь кажа. Але ж людзі маўчаць, і я маўчу — не перапыняю: слухаем, што будзе далей.)

А чалавек і расказвае, што мулаў прывезлі ды выпусцілі ў лес, каб яны там спакойна пасвіліся, спакойна... размнажаліся.

(І на гэты раз хіба хто ўсміхнуся, бо вядома ж, што мулы самі па сабе патомства не даюць — іх спецыяльна разводзяць для розных гаспадарчых работ.

Але ж, як той казаў, не люба — не слухай, а бракуй — не перашкаджай.

Іншыя мужчыны рабілі тое ж: гэта значыць, стрымана ўсміхаліся ды чакалі працягу).

І дзядзька іх не падвёў: расказваў, што неяк раз адзін з нашых месцічаў пайшоў на паляванне і яму вельмі пашчасціла — падстрэліў мула.

Там жа, у лесе, на месцы, разабраў яго, мяса спакаваў у заплечнік, рогі прымацаваў зверху і рушыў дамоў.

На гэтым, праўда, шанцаванне заваршылася, бо на паляўнічага наляцеў нарад міліцыі і адразу ж (што важна — па рагах!) здагадаўся, што застрэлены мул, а паколькі гэтая жывёліна занесена ў Чырвоную кнігу, то ўляпілі мужыку столькі штрафу...

Тут адзін са слухачоў ужо не вытрываў — сказаў: «Ну што ты пляцеш? Якая Чырвоная кніга? Якія рогі ў мула?! Ад каго яны? Ад кабылы ці ад асла? Ты іх калі-небудзь з рагамі бачыў?»

«Не, — кажа той чалавек, трохі разгубіўшыся... І тут жа да «крыўдзіцеля»: «Ну чаго ты да мяне прычапіўся? Можа, гэта і не мул быў? Бо дакладна — з рагамі... Можа, я проста назву збылтаў? Так-такі: гэта быў не мул! Му... Му... Муфлон, здаецца?!»

Сцены лазні аж скалануліся ад рогату! Смех з паўгадзіны не сціхаў! Ды і потым — успомніш муфлона (з вялікімі прыгожымі рагамі) і ўсміхнешся, падумаеш: «А не хадзілі б мы ў лес са стрэльбамі, не палявалі на жывёл, можа, яны б і размнажаліся?»

Ігар Солтан,
г. п. Івянец.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж *на гэты раз — цытата з ліста: «...Мяне даўно зацікавіла рубрыка «Чалавек на провадзе» (згадзіцеся, цікавае «прачытанне» назвы?). І я таксама вельмі хацеў бы падзяліцца з людзьмі сваёй гісторыяй. Але ж ці надрукуе яе газета?»*

Каб адказаць на гэтае пытанне, гісторыю — згадзіцеся — трэба прачытаць.

А таму — пішыце, дасылайце (пажадана — з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі): «звяздоўскі» конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую — працягваецца, журы працуе.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кітай заклікаў ЗША спыніць узбройваць Тайвань

Вашынгтон павінен прадэманстраваць, што не падтрымлівае сепаратысцкія сілы на Тайвані, і спыніць пастаўляць узбраенні востраву. Пра гэта на брыфінгу заявіла прадстаўнік канцылярыі Дзяржсавета КНР па справах Тайваня Чжу Фэнлянь, каментуючы адабрэнне Сенатам Кангрэса ЗША законапраекта аб ваеннай дапамозе Тайваню, паведаміла ТАСС. Яна адзначыла, што законапраект сур'ёзна парушае прынцып «аднаго Кітая», палажэнні трох сумесных камюніке Кітая і ЗША і пасылае няправільны сігнал сепаратысцкім сілам, якія выступаюць за незалежнасць Тайваня. «Мы рашуча выступаем супраць», — заявіла Чжу Фэнлянь. Тайваньскае пытанне з'яўляецца выключна ўнутранай справай Кітая і не церпіць ніякага знешняга ўмяшання, падкрэсліла яна. Паводле яе слоў, большасць жыхароў Тайваня хочуць міру, развіцця, абменаў і супрацоўніцтва, а не вайны, рэцэсіі, падзелу і канфрантацыі. Чжу Фэнлянь заўважыла, што кіруючая тайваньская партыя «ігнаруе грамадскую думку, гатова стаць пешкай знешніх сіл для стрымлівання Кітая». Прадстаўнік канцылярыі падкрэсліла, што любыя спробы сепаратыстаў сілай або з апорай на знешнія сілы дасягнуць незалежнасці асуджаныя на правал. Раней Сенат Кангрэса ЗША адобрыў пакет законапраектаў аб аказанні ваеннай дапамогі Украіне, Ізраілю і Тайваню, канфіскацыі замарожаных актываў Расіі фактычна для іх перадачы Кіеву, а таксама ўвядзенні дадатковых санкцый у дачыненні да Кітая.

Замаразкі пагражаюць еўрапейскім фермерам вялізнымі стратамі

З сярэдзіны красавіка большую частку Еўропы накрыла хваля арктычнага холаду пасля некалькіх тыдняў заўчаснай спякоты. Асаблівую небяспеку замаразкі прадстаўляюць для вінаградарства, пакутуюць і іншыя фруктовыя гаспадаркі, паведаміў Euronews. І хоць да канца месяца намячаецца пацяпленне, фермеры ў многіх краінах Балканскага рэгіёна апасаюцца, што не збяруць ураджаю. У Нідэрландах сумётаў не было, але пасадкам пагражаюць нізкія тэмпературы. Фермеры апырскваюць пладовыя дрэвы вадой, каб ледзяная скарынача не дала будучым пладам змерзнуць. Нязручнасці з-за пахаладання адчуваюць не толькі фермеры. У высакагорных раёнах Аўстрыі снегам замяло дарогі, пры гэтым многія аўтамабілісты перайшлі ўжо на летнія шыны. Паводле прагнозаў, экстрэмальныя ўмовы надвор'я захаваюцца да наступнага тыдня.

У Парыжы абрынуліся млынавыя крылы кабарэ «Мулен Руж»

Крылы ўпалі на праезную частку паміж двума-трыма гадзінамі ночы (3.00—4.00 па мінскім часе), паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал BFMTV. У выніку здарэння пашкоджанне атрымала шыльда ўстановы, з яе ўпалі першыя тры літары. У «Мулен Руж» заявілі, што сімвал кабарэ ўпаў, верагодна, па тэхнічных прычынах. Пажарныя і паліцыя прыбылі на месца здарэння, пацярпелых няма. Кабарэ «Мулен Руж» — адна са славутасцяў французскай сталіцы. Яно ўпершыню адчыніла свае дзверы 6 кастрычніка 1889 года. Будынак установы размешчаны каля падножжа Манмартра. Ён уяўляе сабой млын, што адлюстравана ў самой назве ўстановы, якая ў перакладзе азначае «Чырвоны млын».

Надвор'е

ТЭМПЕРАТУРНЫЯ «АРЭЛІ»

Уначы замаразкі, а днём прыгрэе да плюс 22

Калі на старце красавіка дзённы максімум тэмпературы дасягаў 25 градусаў і вышэй, усе ўжо вырашылі, што канчаткова прыйшла цёплая вясна. Як аказалася, другі месяц вясны падманлівы, і пасля значнага цяпла абавязкова прыходзіць сур'ёзная хваля холаду. Гэтыя выхадныя з'яўляюцца таму пацвярджэннем, бо ноччу чакаюцца замаразкі, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

І ў пятніцу надвор'е застанецца цяжкім». Па ўсходняй палове краіны яго будуць вызначаць атмасферныя франты, на астатняй частцы тэрыторыі адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Воблачна з прасяненнямі. Тэмпература паветра мінімальная ноччу 1—7, па паўднёвым усходзе 8—11 цяпла, але месцамі па захадзе Беларусі чакаюцца замаразкі да мінус 1 градуса. Максімальная тэмпература паветра днём 9—15 цяпла, ва ўсходніх раёнах плюс 16—19 градусаў. Атмасферны ціск будзе расці.

Верагоднасць начных замаразкаў захаваецца і ў суботу. Чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Толькі ўначы па паўночным усходзе краіны месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўночна-заходні з пераходам на паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы 1—7 цяпла, але месцамі замаразкі да мінус 2 градусаў, а максімальная тэмпература паветра ўдзень — 12—19 цяпла.

У нядзелю пацяплее. Надвор'е будуць фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску і цёплая паветраная маса, якая распаўсюдзіцца з паўднёвага захаду Еўропы. Пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер пераменных напрамкаў умераны. Тэмпература паветра ўначы плюс 2—8 градусаў, удзень — 15—22 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

У тэму

Халады замарудзілі развіццё сельгаскультур і адрастанне шматгадовых траў, паведамілі сіноптыкі.

Пасля моцных дажджоў ва ўсходняй палове краіны ўтрыманне вільгаці ў глебе істотна павялічылася. Па апошніх даных візуальных назіранняў, умеранае ўвільгатненне верхняга 10-сантыметровага пласта глебы захоўваецца на большай тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай, а таксама ў шэрагу раёнаў Мінскай і Гомельскай абласцей. На астатняй тэрыторыі Беларусі верхні слой глебы моцна і залішне ўвільготнены. На паўночным захадзе краіны ўтварылася невялікае снежнае покрыва вышынёй да двух сантыметраў. Сярэдняя тэмпература глебы на глыбіні 10 сантыметраў панізілася і складае ў асноўным плюс 5—9 градусаў. Усталявалася халоднае надвор'е, якое замарудзіла развіццё сельскагаспадарчых культур, адрастанне шматгадовых траў.

Паводле інфармацыі аграметэаролагаў, у сувязі з чаканымі ападкамі ў найбліжэйшыя дні захаваецца даволі складаная аграметэаралагічная абстаноўка, плошчы з пераўвільгатненнем будуць пашырацца.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.43	20.33	14.50
Віцебск —	5.29	20.26	14.57
Магілёў —	5.33	20.23	14.50
Гомель —	5.34	20.15	14.41
Гродна —	5.59	20.47	14.48
Брэст —	6.04	20.43	14.39

Месяц

Поўня 24 красавіка.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Артамона.*
К. *Клаўдзіі, Марцэлліны, Марыі, Васіля, Рышарда.*

Фота Лізаветы ГОЛАД.

ЗАЎТРА



26 КРАСАВІКА

Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

1586 год — у Магілёве ўтварылася праваслаўнае брацтва, адно з першых на Беларусі.

1863 год — нарадзіўся (в. Славенск Ашмянскага павета) Яўстафій Філарэтавіч Арлоўскі, беларускі краязнавец, гісторык, педагог. Даследаваў гісторыю Гродна і даказаў яго тоеснасць з летапісным Гарадзенам.

1899 год — нарадзіўся (в. Замосце, цяпер — Уздзенскі раён) Ілья Гурскі, беларускі савецкі пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры БССР. У 1935—1941 гадах — рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва». У гады Вялікай Айчыннай вайны з першага дня і да лістапада 1942 года служыў у Чырвонай Арміі. Затым разам з групай беларускіх пісьменнікаў быў дэмабілізаваны. Рэдактар газеты «За свабодную Беларусь» і сатырычнага лістка «Партызанская дубінка». Пасля вайны ў 1944—1960-м узначальваў часопіс «Беларусь». Аўтар п'ес, апавяданняў, аповесцяў і раманаў: «У агні», «Вецер стагоддзя», «Чужы хлеб» і інш. Перакладаў на беларускую мову М. Горкага, А. Чэхава, М. Твэна.

1929 год — нарадзіўся (в. Гарадзец Рагачоўскага раёна) Мікалай Мікітавіч Слюнькоў, савецкі партыйны дзеяч, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. У 1974—1983 гадах — намеснік старшыні Дзяржплана СССР. У 1983—1987 гадах — першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі. Пасля — сакратар ЦК КПСС, член Палітбюро ЦК КПСС, адначасова ў 1987—1988 гадах — загадчык Эканамічнага аддзела ЦК КПСС.

У свеце

1607 год — заснаванне Джэймстаўна, першага паселішча брытанскіх каланістаў на тэрыторыі сучасных ЗША.

1798 год — нарадзіўся Эжэн Фэрдынанд Віктор Дэлакруа, французскі жывапісец і графік эпохі рамантызму, творчасць мастака моцна паўплывала на ўзнікненне новага жывапіснага кірунку — імпрэсіянізму.

1937 год — у час грамадзянскай вайны ў Іспаніі нацысты ўчынілі варварскую бамбардзіроўку горада Гернікі. У выніку ўзнік пажар, які знішчыў большую частку горада з-за запозненага прыбыцця і неадэкватных дзеянняў пажарных з Більбаа. Менавіта пажар, а не непасрэдна авіяналёт з'явіўся прычынай катастрафічных разбурэнняў (не менш за 75 % пабудоў). Ацэнкі колькасці чалавечых ахвяр значна адрозніваюцца: ад 120 чалавек да 300 у залежнасці ад палітычных поглядаў тых, хто рабіў іх падлік (першая лічба — падлікі гісторыкаў, якія сімпатызавалі нацыяналістам Франка, другая прынята ў Краіне Баскаў).

1986 год — тэхнагенная катастрофа на Чарнобыльскай АЭС. У выніку адбылося моцнае забруджванне часткі тэрыторыі Беларусі радыеактыўнымі выкідамі са станцыі, у меншай ступені пацярпелі Расія і Украіна.

Так гаварыў...

ІВАН БУНІН:

«Жанчыны ніколі не бываюць такімі моцнымі, як тады, калі яны бяруць на ўзбраенне слабасць».

УСМІХНЕМСЯ

Спадара Івана АСТРОЎСКАГА, жыццялюба, педагога, дацэнта БДУІРа, адданага падпісчыка «Звязды», шчыра віншуем з прыгожай круглай датай, з 85-годдзем! Зычым вам, шаноўны Іван Іванавіч, моцнага здароўя, бадзёрасці, поспехаў у працы (яшчэ і на зямлі), чакаем новых вершаў, баек, прыпевак — для газеты, для новых кніг!

Звяздоўцы.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.836. Індэкс 63850. Зак. № 903.

Нумар падпісаны ў 19.30

25 красавіка 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12